WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

2 ЛЮТАГА 2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 21
(27136)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ЯК ЗМЯНЯЦЦА САЦЫЯЛЬНЫЯ ВЫПЛАТЫ Ў БЕЛАРУСІ

З 1 ЛЮТАГА

Бюджэт пражытачнага мінімуму з 1 лютага па 30 красавіка — Br706 тыс. 880

Аднаразовая дапамога па цяжарнасці* — Br706 тыс. 880

Аднаразовая дапамога ў сувязі з нараджэннем першага дзіцяці — Br7 млн. 68 тыс. 800

Аднаразовая дапамога пры нараджэнні другога і наступнага дзяцей — Br9 млн. 896 тыс. 320

Аднаразовая выплата на набыццё дзіцячых рэчаў** — Br1 млн. 413 тыс. 760

Штомесячная дапамога па догляду дзіцяці да 3 гадоў — Br706 тыс. 880

з надбаўкай 75% — Br1 млн. 237 тыс. 40

з надбаўкай 40% — Br989 тыс. 630

Штомесячная дапамога па догляду дзіцяці, старэйшага за 3 гады — Br353 тыс. 440

з надбаўкай 40% — Br494 тыс. 820

Дапамога на дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў — Br706 тыс. 880

Дапамога на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванага ВІЧ — Br494 тыс. 820

Мінімальная пенсія па ўзросту — Br176 тыс. 720

Даплата ў лютым-красавіку***: пенсіянерам, старэйшым за 75 гадоў - Br132 тыс. 540, пенсіянерам, старэйшым за 80 гадоў - Br176 тыс. 720.

У лютым павялічацца таксама мінімальныя сацыяльныя пенсіі, надбаўкі і павышэнні, устаноўленыя да пенсій асобных катэгорый пенсіянераў.

* Жанчыне, якая стала на ўлік у дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці.
** Пры нараджэнні двайнят на кожнага з дзяцей.
*** У лютым 2012 года разам з лютаўскай пенсіяй і даплатай да яе выплацяць студзеньскую даплату.

Крыніца: Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі.

© Інфаграфіка БЕЛТА

ХОЧАЦЕ АДПАЧЫЦЬ У САНАТОРЫІ ЛЕТАМ? ДУМАЙЦЕ ПРА ГЭТА ЦЯПЕР

З 15 лютага па 30 красавіка УП «Белпрафсаюзкурорт» правядзе акцыю для беларусаў — членаў прафсаюзаў, якія ўваходзяць у ФПБ і якія жадаюць адпачыць у санаторыях у чэрвені—жніўні. Для іх прафсаюзныя здраўніцы ўсталююць бронь на 10 тысяч месцаў. Такім чынам, каб гарантаваць сабе адпачынак і лячэнне ў санаторыі менавіта ў летнія месяцы, неабходна будзе толькі ўнесці частковую перадаплату за пуцёўку.

Гэта дасць, па словах **генеральнага дырэктара УП «Белпрафсаюзкурорта» Анатоля ВАСКЕВІЧА**, магчымасць нашым людзям спланаваць свой адпачынак загадзя, не аплачваючы пуцёўку цалкам. «На жаль, часта беларусы хочуць набыць тур «сёння — на заўтра», але санаторыі не могуць чакаць «сваіх» кліентаў, рызыкуючы прастоем ложкавага фонду, і часткова прадаюць пуцёўкі больш арганізаваным замежнікам, якія заказваюць туры за паўгода да адпачынку, — заявіў А. Васкевіч. — Магчымасць браніравання дазволіць скарэктаваць сітуацыю».

Летась у прафсаюзных здраўніцах адпачылі каля 50 тысяч беларусаў.

Дарэчы, зніжка на пуцёўкі ў санаторыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі для членаў прафсаюзаў, згодна з рашэннем Прэзідыума Савета ФПБ, вырасла з 15 да 20%. Гэта значыць, набываючы пуцёўку коштам, дапусцім, 1 мільён рублёў член прафсаюза, які ўваходзіць у ФПБ, эканоміць 200 тысяч.

Святлана БУСЬКО.

ПЛАТА ЗА НАВУЧАННЕ ПАВЫСІЦЦА НЕ БОЛЬШ ЧЫМ НА 29 ПРАЦЭНТАЎ

Міністэрства адукацыі правяло маніторынг прагнозу цэн на платнае навучанне. З улікам вынікаў даследавання міністэрства рэкамендавала ўстановам адукацыі павялічыць кошт платнага навучання з 1 лютага ў параўнанні з дзейнай цаной па дзённай, завочнай і вячэрняй формах навучання ў памерах не больш чым 29 працэнтаў з улікам эканамічна абгрунтаваных выдаткаў, неабходных для падрыхтоўкі спецыяліста па канкрэтнай спецыяльнасці (спецыялізацыі) у гэтай навучальнай установе. Пра гэта журналісту «Звязды» паведамілі ў прэс-службе Міністэрства адукацыі.

Таксама вышэйшым навучальным установам было рэкамендавана, улічваючы сацыяльную значнасць паслугі, па магчымасці, на падставе заяў грамадзян, браць дадатковую плату за навучанне з адтэрміноўкай плацяжу, а таксама прадастаўляць растэрміноўку плацяжу па спагнанні дадатковай платы за навучанне.

У міністэрстве нагадалі, што для павелічэння кошту платнага навучання было шмат падстаў. У прыватнасці, гэта рашэнні ўрада па павелічэнні тарыфнай стаўкі першага разраду з 1 студзеня гэтага года на 32,45 працэнта, па ўдасканальванні аплаты працы педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу без вучонай ступені ці вучонага звання. Пры гэтым вышэйшым навучальным установам рэкамендавана, па магчымасці, аптымізаваць іншыя артыкулы выдаткаў на падрыхтоўку спецыяліста на платнай аснове. Кіраўнік установы адукацыі нясе адказнасць за абгрунтаванасць эканамічных разлікаў па павелічэнні кошту платнага навучання.

Надзея НІКАЛАЕВА.

АСЦЯРОЖНА — ЛЕДЗЯШЫ!

Усе «небяспечныя зоны» ў краіне агароджаны і хутка будуць ліквідаваны

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Фота БЕЛТА.

ГЭТАЙ зімой стаў вядомым толькі адзін выпадак падзення наледзі на чалавека — з даху ўнівермага «Беларусь». 60-гадовы мужчына атрымаў закрытую чэрапна-мазгавую траўму лёгкай ступені. Значных разбурэнняў і пашкоджанняў будынкаў і машын у выніку падзення ледзяшоў або лавінападобнага сходу снегу таксама пакуль не было зарэгістравана. Тым не менш камунальныя службы добра памятаюць трагічныя выпадкі мінулых гадоў і імкнуцца прадухіліць іх сёлета і ў будучым.

ПАСЛІЗНУЎСЯ. УПАЎ...

353 чалавекі звярнуліся з галалёднымі траўмамі па ўрачэбную дапамогу на працягу тыдня ў Бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі, РНПЦ траўматалогіі і артапедыі, 6-ю гарадскую клінічную бальніцу Мінска, цэнтральныя раённыя паліклінікі сталіцы. Вышэйзгаданая лічба лічыцца характэрнай для сапраўдных зімовых тыдняў, калі камунальныя службы Мінска не паспяваюць ачысціць ад снегу і лёду ўсе вуліцы і завулкі.

Паводле слоў загадчыка гарадскога цэнтра экстраннай медыцынскай дапамогі Гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Віталя ЦІЦІШЫНА, сярод тых, хто аказаўся траўмаваным пры падзенні, — 19 дзяцей. Толькі шасцёра атрымалі траўму ў стане алкагольнага ап'янення, хоць гэтая лічба можа быць неаб'ектыўнай. Звычайна, калі траўма і была атрымана ў падобным стане, пацыенты звяртаюцца па меддапамогу пазней — пасля таго, як працверазеюць. 31 чалавек быў шпіталізаваны. Як правіла, колькасць галалёдных траўмаў раўнамерна размяркоўваецца паміж сталічнымі раёнамі, а таму ў тэрытарыяльна большых раёнах рэгіструецца большая колькасць траўмаў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

— Па даручэнні Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі на кожным прадпрыемстве ЖКГ вобласці створаны сезонныя брыгады, задачай якіх з'яўляецца ліквідацыя наледзі на дахах дамоў. У вялікіх гарадах гэтым займаюцца непасрэдна ЖЭСы, — расказаў «Звяздзе» **начальнік жыллёвага аддзела Брэсцкага ўпраўлення ЖКГ Дзмітрый ГУЛЕЎСКІ**. — Штодня мы дакладаем аб сітуацыі ў міністэрства. Летась у Брэсцкай вобласці адбыўся трагічны выпадак з-за падзення ледзяша на чалавека, таму цяпер мы строга адсочваем стан дахаў і бяспеку насельніцтва. Зараз у вобласці няма ледзяшоў. Вядома, як толькі пачнецца адліга, яны з'явяцца, і тады нашы брыгады аператыўна выедуць на месцы, агародзяць небяспечную тэрыторыю і ўбяруць наледзь. Нашых магутнасцяў для гэтага дастаткова.

— У Магілёўскай вобласці ледзяшы на дахах утвараюцца штодня, і штодня, амаль адразу, іх убіраюць, — запэўніў нас **намеснік начальніка Упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Магілёўскага аблвыканкама Андрэй КІБЛОЎ**. — З'яўленне наледзі і лавінападобнага сходу снегу звязана з канструкцыяй дахаў і наяўнасцю цёплых гарышчаў. З-за высокай тэмпературы на гарышчы снег растае і становіцца небяспечным. Асабліву ўвагу патрабуюць скатныя дахі, якія маюць вонкавыя вадасцёкавыя сістэмы. Менавіта яны могуць несці пагрозу. Праблемы з ледзяшамі зараз няма. Сёння мы завяршаем уборку дахаў ад снегу, ачысцілі іх ужо 1,5 тысячы. Для гэтых мэт у вобласці задзейнічаны каля 300 чалавек і 27 адзінак тэхнікі.

У Мінскай вобласці са снегам і ледзяшамі на дахах змагаюцца штодня каля 100 чалавек з дапамогай 30 вышак.

— Самы «гарачы» час ужо мінуў. Каля 70 адсоткаў ад тых, што неабходна было ачысціць, ужо ачышчаны. На раніцу серады ў нас заставаліся тры небяспечныя зоны, якія агароджаны і .ўжо да вечара серады альбо ў чацвер павінны быць ліквідаваныя, — паабяцала **намеснік начальніка Упраўлення ЖКГ Мінскага аблвыканкама Людміла КОРЧЫК**. — Ніякіх разбурэнняў дахаў і водаадводаў, а таксама ніякіх няшчасных выпадкаў гэтай зімой, як і ў бліжэйшыя мінулыя гады, на шчасце, у вобласці не адбылося. Засталося вызваліць ад снегу менш за 1000 дахаў.

— Там, дзе дахі нармальна ўцеплены, дзе захаваны рэжым праветрывання гарышча, небяспечнай наледзі не ўтвараецца, — патлумачыў **начальнік Упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ Эдмунд ГРЫШКЕВІЧ**. — У цэлым па краіне з больш чым 15 тысяч дахаў неабходна ўбіраць снег. На вечар аўторка каля 13 тысяч з іх ужо былі чыстыя. Для гэтага спатрэбілася праца каля 120 аўтавышак і трох тысяч чалавек штодня. На складаныя ўчасткі запрашаюць альпіністаў. Уборка скатаў мае павышаную ступень небяспечнасці, таму яе нельга даручыць чалавеку выпадковаму і ненавучанаму. Мы абслугоўваем толькі жыллёвы фонд. Наледзь на дахах іншых будынкаў — клопат уладальнікаў гэтых будынкаў. Для таго, каб прадухіліць няшчасныя выпадкі, арганізавана сістэма абследавання ўсіх дахаў. Сёння мы працуем у павышаным рэжыме, і штодня нашы работнікі аглядаюць жыллё, звяртаюць увагу і на дахі. Калі немагчыма ледзяшы або наледзь убраць адразу, небяспечная зона павінна быць агароджана. Такіх зон сёння па краіне 560.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ ДАРУЧЫЎ ПАЛЕПШЫЦЬ ПАРОДНЫ СКЛАД ЛЯСОЎ

Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч даручыў Міністэрству лясной гаспадаркі прыняць меры па паляпшэнні пароднага складу лясоў. Адпаведнае даручэнне ён агучыў учора на нарадзе па пытаннях развіцця лясной гаспадаркі, перадае БЕЛТА.

Урад непакоіць тое, што пародны склад лясоў пагаршаецца. «Мы стрэчаем дубровы, — сказаў кіраўнік урада. — Гомельшчына практычна засталася без дуброў, а раней мы імі ганарыліся». За ўсе гэтыя пытанні нясе непасрэдную адказнасць Міністэрства лясной гаспадаркі, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. «Глядзіце, колькі ў нашых лясах вольхі, асіны і іншых лясных парод, якія не маюць практычна ніякай каштоўнасці», — сказаў ён. Ліставыя пароды ў цэлым менш каштоўныя, чым хвойныя. Аднак нават ліставыя лясы ў Беларусі прадстаўлены недастаткова добрым пародным складам, канстатаваў прэм'ер-міністр. У сувязі з гэтым ён запатрабаваў ад Мінлясгаса сур'ёзна заняцца аднаўленнем лясоў.

Асаблівую ўвагу Міхаіл Мясніковіч даручыў звярнуць на структуру лясоў. Сёння ў Беларусі эксплуатацыйныя лясы складаюць 49 працэнтаў ад усіх лясных тэрыторый, а ахоўныя лясы — 51 працэнт. «Ці не захапіліся мы заказнікамі, запаведнікамі?» — звярнуўся ён да міністраў лясной гаспадаркі і прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. У адпаведнасці з сусветнай практыкай ахоўныя лясы складаюць 20-25 працэнтаў, і гэта аптымальныя працэнтныя суадносіны. «Мы зрабілі палавіну, там таксама ажыццяўляецца лесатэхнічная дзейнасць, але яна праводзіцца не ў тых маштабах, — канстатаваў прэм'ер-міністр. — У БССР эксплуатацыйныя лясы займалі 64 працэнты, за гады суверэнітэту мы 15 працэнтных пунктаў перавялі ў запаведнікі». У сувязі з гэтым кіраўнік урада даручыў ацаніць мэтазгоднасць павелічэння долі ахоўных лясоў і прапрацаваць шляхі ўдасканалення структуры лясных тэрыторый Беларусі.

АНАТОЛЬ РУБІНАЎ АДЗНАЧАЕ ІНТЭНСІЎНЫ ХАРАКТАР СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ І КАЗАХСТАНА

Фота БЕЛТА.

Беларусь і Казахстан інтэнсіўна супрацоўнічаюць, у адносінах дзвюх краін няма абсалютна ніякіх праблем і непаразумення. Аб гэтым заявіў учора ў Мінску старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Анатоль Рубінаў на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным паслом Казахстана ў Беларусі Анатолем Смірновым з нагоды завяршэння яго дыпламатычнай місіі, перадае БЕЛТА.

Звяртаючыся да пасла, Анатоль Рубінаў адзначыў, што трохгадовая работа Анатоля Смірнова ў Беларусі была вельмі плённай. «Ваша асабістае абаянне, уменне пабудаваць адносіны садзейнічалі развіццю супрацоўніцтва паміж краінамі», — дадаў спікер. Ён таксама падкрэсліў асабісты ўклад пасла ў стварэнне і развіццё АЭП.

Паспяховае супрацоўніцтва Беларусі і Казахстана абумоўлена і пазіцыяй кіраўнікоў дзяржаў. «Вядома, галоўны фактар цеснага супрацоўніцтва — гэта тое, што прэзідэнты дзвюх краін маюць падобныя пазіцыі светапогляду, пастаянна сустракаюцца, інтэнсіўна вядуць палітыку на збліжэнне і супрацоўніцтва», — сказаў Анатоль Рубінаў.

«Мы вельмі рады таму, як развіваецца Казахстан і яго народ. Гэта фантастычны прагрэс. Казахстан выйшаў на ўзровень моцных, уплывовых краін у свеце з моцнай эканомікай», — сказаў спікер.

Гаворачы аб праведзеных у Казахстане парламенцкіх выбарах, Анатоль Рубінаў адзначыў: «Нягледзячы на тое, што там ёсць нейкія водгукі, мы лічым, што наглядальнікі бачылі ўсё на ўласныя вочы і далі аб'ектыўную ацэнку — выбары былі справядлівыя. А тое, што ёсць краіны і палітыкі, якія заўсёды будуць старацца знайсці нейкую трэшчыну і спрабаваць дэстабілізаваць краіну, тым больш ва ўмовах Адзінай эканамічнай прасторы, гэта зразумела. Мы павінны правільна гэта разумець і проціпастаўляць гэтаму стваральную працу і супрацоўніцтва».

У сваю чаргу Анатоль Смірноў падзякаваў Анатолю Рубінаву за праведзеную сумесную работу, падтрымку і добрыя словы ў адрас Казахстана. Краіны, паводле яго слоў, супрацоўнічаюць практычна па ўсіх напрамках. Пасол выказаў падзяку парламентарыям за актыўны ўдзел у мерапрыемствах, праводзімых пасольствам. Акрамя таго, ён адзначыў дапамогу беларускага боку ў пошуку імёнаў казахаў, загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Члены парламента Славакіі зняліся голымі, змагаючыся супраць дэпутацкай недатыкальнасці

Сямнаццаць членаў парламента Славакіі ад ліберальнай партыі «Свабода і салідарнасць» вырашылі змагацца супраць дэпутацкай недатыкальнасці не толькі словам, але і целам. Парламентарыі распрануліся дагала і ў такім выглядзе сфатаграфаваліся, прыкрываючы інтымныя месцы толькі плакатам з надпісам «Няхай парламентарыі адмовяцца ад свайго імунітэту».



Правакацыйны здымак быў апублікаваны ў блогу партыі ў сацыяльнай сетцы Facebook. На фота адлюстраваны 14 мужчын і толькі тры жанчыны. Усе дэпутаты выглядаюць вельмі задаволенымі. Публікацыя фатаграфіі выклікала гарачыя спрэчкі сярод славакаў: хтосьці палічыў гэтую ініцыятыву смелай і арыгінальнай, іншыя абвінавацілі членаў партыі ў тым, што напярэдадні выбараў яны ўсімі спосабамі прыцягваюць да сябе ўвагу.

«Газпрам» скарачае пастаўкі газу ў Еўропу з-за маразоў

«Газпрам» скараціў пастаўкі газу ў Еўропу з-за сур'ёзных халадоў у Расіі. Так, па газаправодзе «Ямал-Еўропа», па якім газ з Расіі праз Беларусь і Польшчу паступае ў Германію, пастаўкі газу зменшыліся на 10%, а Італіі скарочана прыкладна 8%.

Еўракамісія заявіла, што ў еўрапейскіх кампаній досыць запасаў у падземных сховішчах, каб папоўніць недахоп расійскага прыроднага газу.

Сваркі — залог паспяховых адносін, упэўнены эксперты

Каб шлюб быў моцным і доўгім, трэба сварыцца адзін раз на тыдзень, раяць індыйскія псіхолагі. Яны спецыяльна прааналізавалі паводзіны жанатых пар і выявілі, што 44% з іх упэўненыя: сваркі дапамагаюць мець лепшыя зносіны, паведамляе The Daily Mail.

Даследаванне супрацоўнікаў партала Shaadi.com і аналітычнага агенцтва IMRB даказала: сваркі і канструктыўнае абмеркаванне праблем здымаюць стрэс і больш дабратворна ўздзейнічаюць на атмасферу ў доме ў параўнанні са звычкай трымаць усё ўнутры сябе.

Сёння — Сусветны дзень водна-балотных угоддзяў

ЗАКАЗНІК «ЕЛЬНЯ» АДКРЫЮЦЬ ДЛЯ ЭКАТУРЫСТАЎ

У Беларусі даволі актыўна ажыццяўляецца развіццё экалагічнага турызму на водна-балотных угоддзях, паведаміла на прэс-канферэнцыі начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Наталля МІНЧАНКА.

Так, на рэалізацыю Дзяржаўнай праграмы развіцця сістэмы асабліва ахоўных прыродных тэрыторый Беларусі на 2008—2014 гады прадугледжана накіраваць больш як 80 млрд рублёў. Толькі на развіццё турыстычнай дзейнасці запланавана выдзяленне 56 млрд бюджэтных сродкаў. Летась на рэалізацыю мерапрыемстваў гэтай праграмы было выдаткавана звыш 22 млрд рублёў. Сёлета бюджэт прыродаахоўных мерапрыемстваў запланаваны ў аб'ёме 14 млрд, у тым ліку на развіццё турызму — больш як 7 млрд рублёў.

Спецыяліст адзначыла, што сёлета на тэрыторыі заказніка «Ельня» будзе сфарміравана інфраструктура экалагічнага турызму. Фінансуецца гэты праект па лініі міжнароднай тэхнічнай дапамогі ЕС/ПРААН. У Ельні плануецца стварэнне экалагічнага цэнтра, арганізацыя экалагічных сцяжынак і навучанне спецыялістаў і персаналу. Замежныя інвестыцыі праекта складуць каля 450 тысяч долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

Фотадыямкі Анатоля КЛЕЩУКА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.02.2012 г. (для б/н разлікаў)

▲1 долар ЗША	8 380,00	1 чэшская крона	433,10
▼1 еўра	10 930,00	1 польскі злоты	2 600,34
1 латвійскі лат	15 678,20	1 расійскі рубель	276,00
1 літоўскі літ	3 171,84	1 украінская грыўня	1 042,81

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,4067
10 UAH	37,8805
10000 BYR	36,4152
EUR	39,6777

Агенства Уладзімірa Гракова

АЦАНІЦЬ У ДВУХ ЧЫТАННЯХ

Парламенцкі дзённік

Год кнігі адзначыцца з'яўленнем у Беларусі закона аб выдавецкай справе

Хочаце верце, хочаце не, але цікавыя супадзенні бываюць. Чым інакш патлумачыць той факт, што запланаванаму і нарыхтаванаму ў нетрах нарматворчай сістэмы не адзін год таму законапраекту аб выдавецкай справе наканавана з'явіцца менавіта сёлета. У Год кнігі.

— Мы спадзяёмся, што прыняцце закона дазволіць забяспечыць спрыяльныя ўмовы для развіцця выдавецкай справы і павялічыць долю высакаякаснай літаратуры на рынку, — дзеліцца чаканнямі **дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Алена НОВІК**.

Як распрацоўшчыкі дакумента разлічваюць атрымаць такі эфект, паспрабуем разабрацца разам.

— Дзяржаўнае рэгуляванне цяпер будзе ахопліваць увесь цыкл стварэння, вырабу і распаўсюджвання выдавецкай прадукцыі. Раней апошняе звяно выпадала са сферы дзяржаўнага ўплыву, — заўважае парламентарый.

Ключавое новаўвядзенне заканадаўцаў заключаецца ў тым, што замест дзейнага механізму ліцэнзавання з'явіцца дзяржаўная рэгістрацыя выдаўцоў, вытворцаў, распаўсюджвальнікаў друкаванай прадукцыі з увядзеннем адзінага рэестра. Новая працэдура больш простая ў параўнанні з дзейнай сістэмай, зазначае народная выбранніца.

— Абавязковай дзяржаўнай рэгістрацыі падлягаюць выдаўцы афіцыйных, навуковых, навукова-папулярных, вытворча-практычных, вучэбных, масава-палітычных, даведачных, літаратурна-мастацкіх і духоўна-асветніцкіх відаў выданняў, выданняў для вольнага часу, а таксама вытворцы і распаўсюджвальнікі выдавецкай прадукцыі, — інфармуе суразмоўніца.

Ад рэгістрацыі вызваляюцца выдаўцы, якія выпускаюць бланачную, этыкетачную, упаковачную прадукцыю, таварныя ярлыкі ды візіткі. Не павінны праходзіць працэдуру таксама аўтары твораў і распаўсюджвальнікі — у тым выпадку, калі яны ажыццяўляюць аптовы гандаль выдавецкай прадукцыяй, а таксама яе бясплатнае распаўсюджванне з навуковай, культурнай, духоўна-асветніцкай, дабрачыннай і рэкламнай мэтамі.

Дакумент дакладна рэгламентуе рэгістрацыйныя патрабаванні.

— Выдаўцу, напрыклад, неабходна мець у штаце спецыяліста, адказнага за ажыццяўленне выдавецкай дзейнасці, які мае вышэйшую адукацыю і здаў кваліфікацыйны экзамен ў сферы выдавецкай справы, — кажа А.Новік. — Калі выдавецкай справай займаецца індывідуальны прадпрымальнік, то ён сам павінен мець вышэйшую адукацыю і здаць кваліфікацыйны экзамен, або мець у штаце спецыяліста, адказнага за выдавецкую дзейнасць.

Вытворцу ж выдавецкай прадукцыі абавязкова мець у штаце спецыяліста, адказнага за паліграфічную дзейнасць, які мае вышэйшую адукацыю ў галіне паліграфіі і для якога работа ў гэтага наймальніка з'яўляецца асноўным месцам работы. Індывідуальнаму прадпрымальніку, адпаведна, самому трэба мець вышэйшую адукацыю ў галіне паліграфіі, або ў штаце павінен быць спецыяліст, адказны за паліграфічную дзейнасць.

У праекце закона аб выдавецкай справе прапісаны падставы, калі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь мае права адмовіць у прыняцці заявы і дзяржаўнай рэгістрацыі.

— Заява не прымаецца, калі пададзена з парушэннем патрабаванняў да яе формы, калі адсутнічае дакумент аб назначэнні спецыяліста, адказнага за выдавецкую дзейнасць (для выдаўца) і адказнага за паліграфічную дзейнасць (для вытворцы выдавецкай прадукцыі), а таксама адсутнічае дакумент, які пацвярджае наяўнасць у індывідуальнага прадпрымальніка вышэйшай адукацыі, — тлумачыць Алена Новік.

Адмовіць у дзяржаўнай рэгістрацыі ведамства мае права за недакладнасць звестак, указаных у заяве, а таксама тады, калі гэтыя звесткі не адпавядаюць заканадаўству. Выдаўцу — у выпадку няздачы кваліфікацыйнага экзамену спецыялістам, адказным за выдавецкую дзейнасць, або індывідуальным прадпрымальнікам.

Міністэрства інфармацыі мае права ануляваць пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі, калі выдавец, вытворца або распаўсюджвальнік выдавецкай прадукцыі не прайшлі перарэгістрацыю, дапусцілі грубыя парушэнні заканадаўства ў сферы выдавецкай справы.

Што лічыць грубым парушэннем, рабочая група цяпер якраз актыўна абмяркоўвае. Сярод іх значацца, да прыкладу, парушэнне заканадаўства аб аўтарскім праве і сумежных правах, выпуск прадукцыі, якая супярэчыць нацыянальным інтарэсам краіны, прапагандуе вайну, міжнацыянальную варожасць і гэтак далей.

Увогуле сярод абавязкаў, якія законапраект прадпісвае выконваць суб'ектам выдавецкай справы, — садзейнічанне зацвярджэнню агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцяў, развіццю адукацыі, культуры і навукі, паважлівыя адносіны да нацыянальнай годнасці ўсіх народаў. Замацаванне іх на ўзроўні закона, на думку распрацоўшчыкаў, акажа ўплыў на якасць прадукцыі.

Аднак самая жвавая дыскусія — вакол электронных носьбітаў інфармацыі. У многіх краінах свету рынак электронных кніг ці не больш бойкі, чым паперавых. Бестселеры не спампуеш бясплатна — кніга каштуе грошай, незалежна ад таго, у пераплёце яна ці ў выглядзе электроннага файла. Пра пераход на планшэты і школьныя падручнікі ў электронным выглядзе задумваюцца і ў Беларусі. Аднак пакуль гэта ўсё на стадыі апрабацыі, ёсць цяжкасці і з увасабленнем у заканадаўстве.

— Тэрміна «электроннае выданне» ў беларускім заканадаўстве дагэтуль не было, і выпрацаваць яго пакуль досыць складана: яно шмат чаго «чапляе» за сабой, — мяркуе дэпутат Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе. — Таму, відаць, зараз мы яго ў тэкст законапраекта не ўключым. З цягам часу, калі пытанне наспее, да яго можна будзе вярнуцца і ўнесці папраўкі.

Праект закона, паводле ўражанняў народнай выбранніцы, станоўча ўспрыняты суб'ектамі выдавецкай справы. «Дагэтуль ім даводзілася працаваць выключна па нарматыўных прававых актах рознага ўзроўню, і комплекснага рэгулявання адносін у гэтай сферы не было. Цяпер асновы ажыццяўлення выдавецкай справы будуць дакладна прапісаны ў адным дакументе. Мы спадзяёмся, што распрацаваныя заканадаўчыя нормы паспрыяюць таму, каб выдавецкая прадукцыя была якаснай і канкурэнтаздольнай. А гэта дасць магчымасць для выдаўцоў павышаць даходы, ствараць новыя працоўныя месцы. У той час як адсутнасць прававога рэгулявання выдавецкай справы прывяла да дыспрапарцыянальнага развіцця рынку друкаванай прадукцыі без уліку рэальных патрабаванняў дзяржавы, грамадства і запаўнення айчыннага выдавецка-паліграфічнага і кнігагандлёвага рынку няякаснай прадукцыяй, якая часта пагражае інфармацыйнай бяспецы краіны».

Галасаванне па праекце закона аб выдавецкай справе пройдзе, як чакаецца, на вясновай сесіі. «Можа, і ў двух чытаннях за дзясятую сесію паспеем», — выказвае меркаванне дэпутат Алена Новік. Так, Год кнігі павінен быць багатым на чытанні!

— Любоў да чытання закладаецца з самага малога ўзросту, — пераканана парламентарый. — Калі дома кніга — гэта крыніца ўзбагачэння духоўнага і інтэлектуальнага, калі ёй надаецца важнае значэнне — яна застаецца з чалавекам на ўсё жыццё. Таму папулярызацыю чытання варта пачынаць з сям'і.

Сама дэпутат, паводле яе слоў, праводзіць шмат часу за кнігай. «Па выхадных і ўвечары абавязкова. У транспарце стараюся не чытаць, каб не псаваць зрок», — кажа народная выбранніца. Перавагу аддае беларускай класіцы і гістарычнай літаратуры.

— Год кнігі — вельмі важны для беларускага народа, ён яшчэ больш будзе садзейнічаць умацаванню і выхаванню нашага маладога пакалення на прыкладах класікаў. Вельмі важна і сімвалічна, што сёлета ў дадатак яшчэ і Год Коласа і Купалы. У кожнага беларуса, напэўна, будзе шмат нагод адчуваць яшчэ большае пачуццё гонару за свае культуру, літаратуру, краіну, народ.

Ала МАЧАЛАВА.

ТРАНСПАРТНІКІ ПРОСЯЦЬ ПАДНЯЦЬ ТАРЫФЫ НА ПРАЕЗД

На калегіі Міністэрства транспарту і камунікацый адразу два прадстаўнікі прадпрыемстваў, звязаных з перавозкай пасажыраў, выступілі з просьбай аб павышэнні тарыфаў на гарадскім і прыгарадным транспарце.

У прыватнасці, Валерый ШКУРАТАЎ, дырэктар дзяржаўнай установы «Сталічны транспарт і сувязь», паведаміў, што ў бюджэце Мінска на 2012 год на фінансаванне камунальнага пасажырскага транспарту прадугледжана бюджэтная субсідыя для вяртання часткі расходаў перавозчыкаў на гарадскіх і прыгарадных маршрутах у памеры 816 млрд рублёў. Але нават пры такім аб'ёме ўсё адно існуе дэфіцыт сродкаў — сёння ён складае 440 млрд рублёў. Як запоўніць гэты дэфіцыт? Або скарачаць выдаткі, або — павышаць тарыфы. Калі казаць пра першае, то, па словах Валерыя Шкуратава, за кошт аптымізацыі маршрутаў у Мінску летась выдаткі транспартнікаў ужо скарочаны на 1 мільярд рублёў.

Праца ў гэтым напрамку будзе працягвацца і ў 2012 годзе. Разам з тым, мерапрыемствы па эканоміі расходаў недастатковыя для забеспячэння нармальнага функцыянавання грамадскага транспарту, пераканаць Валерый Іванавіч.

Каб кампенсаваць дэфіцыт сродкаў, трэба пераглядаць тарыфную палітыку. Як лічыць дырэктар дзяржаўнай установы «Сталічны транспарт і сувязь», сёння трэба павышаць і кошт адной паездкі, і, адпаведна, кошт шматразовых праязных білетаў, бо неадпаведнасць кошту праязных білетаў прыводзіць да недаатрымання перавозчыкамі «Мінсктранса» даходу ў памеры 3,5 млрд рублёў штомесяц. У бліжэйшы час таксама неабходна прыняць рашэнне аб павышэнні тарыфаў на гарадскія і прыгарадныя перавозкі. Для інфармацыі: сабекошт паездкі аднаго пасажыра ў Мінску ў снежні 2011 года на гарадскім пасажырскім транспарце склаў больш за 3600 рублёў. На прыгарадных перавозках — 697 рублёў за 1 км праезду. У сувязі з гэтым мы прапануем зрабіць у 2012 годзе паэтапнае павышэнне тарыфаў на перавозку пасажыраў грамадскім транспартам з выхадам на канец года на ўзровень 2600 рублёў за паездку на наземным транспарце, 2800 рублёў — у метро, 700 — за 1 кіламетр праезду на прыгарадных маршрутах.

Валерый Шкуратаў лічыць, што нядрэнна было б і павысіць штрафы за безбілетны праезд у транспарце — для гэтага трэба ўнесці змены ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях, падняўшы існуючы штраф у 0,2 базавай велічыні да 1 базавай. Устанаўленне штрафу ніжэй за гэты ўзровень дырэктар дзяржаўнай установы «Сталічны транспарт і сувязь» лічыць немэтазгодным. Таксама ён выказаў думку, што трэба ўстанавіць больш жорсткую адказнасць за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць у галіне пасажырскіх перавозак — штраф у 300 базавых велічынь плюс канфіскацыя транспартнага сродку.

Пра тое, што трэба павышаць тарыфы на праезд у аўтобусах, казаў і дырэктар ААТ «Пінскі аўтобусны парк» Іван РАБКАВЕЦ.

— Сур'ёзныя апасенні ў мяне выклікае павышэнне цякучасці кадраў на прадпрыемстве: незадаволеныя ўзроўнем аплаты працы найбольш кваліфікаваныя і вопытныя работнікі сыходзяць у іншыя галіны. Сённяшні ўзровень зарплаты ў пасажыраперавозчыкаў нашмат ніжэйшы за ўзровень сярэднерэспубліканскай: напрыклад, за снежань 2011 года сярэдняя зарплата ў Пінскім аўтобусным парку склала 2,1 млн рублёў, а сярэднерэспубліканская — 2,8 млн. Таму павышэнне ўзроўню заробку работнікаў у 2012 годзе пры апераджальным росце прадукцыйнасці працы становіцца адной з самых важных задач, — лічыць дырэктар.

За кошт чаго павышаць зарплату? Як варыянт — павысіць тарыфы на праезд.

— Адной з крыніц павышэння зарплаты работнікаў бачыцца атрыманне дадатковых даходаў, у першую чаргу ад асноўнага віду дзейнасці — перавозу пасажыраў у гарадскім і прыгарадным транспарце. І тут без дапамогі ўрада і мясцовых органаў улады ў пытаннях своечасовага і адэкватнага ўстанаўлення тарыфаў на сацыяльна значныя перавозкі пасажыраў нам не абысціся. Таксама хачу адзначыць нізкі кошт месячнага праязнога білета, разлічаны, выходзячы з 37 з паловай паездак у Пінску. Але сярэднестатыстычны пасажыр здзяйсняе іх нашмат больш, што таксама зніжае рэальны кошт адной паездкі ў гарадскім транспарце.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае глыбокія, шчырыя спачуванні генеральнаму дырэктару ТАА «Трайпл» Юрыю Аляксандравічу Чыжу ў сувязі з цяжкай стратай — заўчаснай смерцю БРАТА Яўгена.

Абзац

Супрацоўнікі Шчучынскага РАУС канфіскавалі самую буйную ў вобласці сёлета партыю самагонкі. Праваахоўнікі мелі інфармацыю, што жыхар адной з вёсак у хляве мае самагонны апарат і актыўна яго выкарыстоўвае. Падчас візіту супрацоўнікаў міліцыі гаспадар прызнаўся, дзе стаіць апарат і добраахвотна выдаў 700 л брагі і 250 л гатовага прадукту. Варыць яго дапамагала жонка. Па словах мужчыны, такая колькасць напою яму была неабходна выключна для асабістага спажывання. Вядзецца праверка.

1 лютага а сёмай раніцы на вуліцы Кабяка ў Гродне гарэў мікрааўтобус. Языкі полымя, якія ахапілі «Форд-Транзіт», былі відаць за сотні метраў, і агонь мог перакінуцца на іншыя машыны. Каб пазбегнуць гэтага і дапамагчы пажарным, супрацоўнікі ДАІ на кароткі час абмежавалі рух на гэтым участку вуліцы. Як высветлілася, кіроўца дызельнага «буса» не змог самастойна запусціць рухавік і папрасіў іншага аб дапамозе. Той «пацягаў» мікрааўтобус туды-сюды і з'ехаў, а «Форд» ледзь паспеў завесціся, як пасля хлапка пад капотам загарэўся.

Поўны абзац

У Санкт-Пецярбургу ўкралі фуру. Груз у ёй належаў ФСБ Расіі. Машыну Scania R12 з паўпрычэпам укралі ноччу ад дома па праспекце Бальшавікоў у Неўскім раёне. Аўтамабіль, што належаў прыватнай фірме, перавозіў 19 тон латэксных пальчатак па замове Аўтатранспартнага ўпраўлення ФСБ. Сума ўрону пакуль не ўстаноўлена, аднак вядома, што фура не была застрахавана на выпадак угону. Зладзеяў шукаюць.

Андрэа Бар, уладальніца дома ў невялікім гарадку Coggeshall (Вялікабрытанія) ледзь не загінула пад коламі аўтамабіля. Асаблівасць гэтага выпадку заключаецца ў тым, што жанчыну ледзь не збіў аўтамабіль у яе ўласнай гасцёўні. Вадзіцель не справіўся з кіраваннем, з'ехаў з дарогі, пасля чаго аўтамашына ўрэзалася ў дом. Пратараніўшы сцяну, аўто заехала ў пакой, дзе якраз мірна сядзела гаспадыня. На шчасце, жанчына размясцілася крыху далей ад таго месца, куды заехала машына, таму яна паспела толькі спужацца. Сам гора-кіроўца таксама не пацярпеў, а праваахоўнікі высвятляюць усе дэталі здарэння.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

У ТАПАЧКАХ ДЫ ПА МАРОЗЕ

Пакуль што ў Баранавічах і рэгіёне абышлося без цяжкіх абмаражэнняў. Напрыклад, апошнім часам у чатырох чалавек былі абмарожаны кісці рук — двое з іх былі нападпітку.

У асноўным ахвярамі марозу становяцца п'яныя, бамжы і... дзівакі. Адзін такі дзівак знайшоўся ў пасёлку Гарадзішча, які знаходзіцца за 25 км ад Баранавічаў. 37-гадовы мужчына вырашыў «прагуляцца» ад пасёлка да горада ў тапачках. Можа, ён і пераадолеў бы тыя кіламетры, калі б не мароз пад — 20 °С. З абмарожанымі пальцамі ног бегуна даставілі ў гарадскую бальніцу.

Ходзіць чутка, што мужчына быццам бы пайшоў на гэта, каб выйграць заклад, але, як бачым, дорага заплаціў. А можа, п'яны быў?

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

У СТАЛІЦЫ ЗГАРЭЎ ЧАТЫРОХКВАТЭРНЫ ДОМ

Пра загаранне даху аднапавярховага жылога дома па вуліцы Заснавальнікаў у службу «101» паведамілі жыльцы суседніх дамоў. На гадзінніку было 17.05...

Усяго на месца здарэння было накіравана 10 адзінак асноўнай і 5 адзінак дапаможнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі, аўтамабіль медслужбы МНС, брыгада «Мінгаза». Цалкам пажар быў ліквідаваны ў 19.14.

— У выніку пажару быў пашкоджаны дах, паддашкавыя перакрыцці на плошчы 875 квадратных метраў, часткова пашкоджаны канструкцыйныя элементы памяшканняў дома, прадметы мэблі, хатняя маёмасць. Без жылля засталіся чатыры сям'і. На шчасце, ніхто не пацярпеў. Усё жыльцы часова будуць пражываць у родных, — паведаміў «Звяздзе» **старшы інспектар Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег МАЛЕВІЧ**. — Прычына пажару высвятляецца.

Створана камісія па надзвычайным здарэнні пад старшынствам кіраўніка адміністрацыі Першамайскага раёна сталіцы. 1 лютага ўсім ахвотным прапанаваны месцы ў пакоях інтэрната адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі гадзіннікавы завод».

Сяргей РАСОЛЬКА.

АБАГРАВАЛЬНІК СПАЛІЎ РЫНАК

Пакінуты ўключаным электраабагравальнік — найбольш верагодная прычына ўзнікнення моцнага пажару ў Мазыры.

Апоўначы было выяўлена значнае задымленне на мазырскім рынку «Славянскі». Калі спрацавалі апавяшчальнікі і выратавальнікі прыехалі на месца, гарэлі гандлёвыя павільёны рынка. Існавала пагроза распаўсюджвання пажару. У выніку полымя паспела знішчыць маёмасць у 13 павільёнах на агульнай плошчы 320 кв. м. Пашкоджана яшчэ 8 гандлёвых кропак. Папярэдняй прычынай супрацоўнікі МНС называюць кароткае замыканне электраправодкі. Рынак «Славянскі» быў пабудаваны 8 гадоў таму і належыць таварыству з абмежаванай адказнасцю.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДАСТАЛІ З АЎТО

У Віцебску пасля дарожна-транспартнага здарэння выратавальнікам прыйшлося літаральна выцягваць жанчыну з аўто.

Як паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, а шостай гадзіне вечара адбылася аварыя на скрыжаванні вуліц Праўды і Афіцэрскай. Сутыкнуліся «Форд» і «Опель». У выніку аварыі кіроўцы аўтамабіляў не пацярпелі. А вось пасажырцы адной з машын прыйшлося дапамагаць. Супрацоўнікі МНС дэблакіравалі з аўтамабіля «Форд» пасажырку — жонку вадзіцеля, якую шпіталізавалі з рознымі траўмамі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ХАЦЕЛІ ПАГРЭЦЦА

30 студзеня ў Бабруйску выбухнуў кацёл у малітвенны доме царквы Праабражэння Гасподня.

Як паведамілі ў Магілёўскім абласным упраўленні МНС, два мужчыны, якія не маюць ні працы, ні пэўнага месца жыхарства, прыйшлі ў малітвенны дом, каб пагрэцца, памыцца і паесці. У падвальным памяшканні яны сталі распальваць кацёл, якім ужо не карысталіся. Адбыўся выбух — кацёл разбурыўся, але сам будынак не пашкоджаны.

Найбольш працярпеў ад выбуху 60-гадовы мужчына: ён атрымаў апёкі 60% цела і знаходзіцца ў рэанімацыі Бабруйскай цэнтральнай бальніцы. Другому, 36-гадоваму мужчыну, які атрымаў апёкі твару і кісцей рук, у бальніцы аказалі медыцынскую дапамогу. Ад шпіталізацыі ён адмовіўся.

Алена КАЗЛОВА.

ГАРЭЛА АЎТАКРАМА, ПАЛАЎ СЕЛЬСКІ КЛУБ...

Цягам двух дзён запар у Старадарожскім раёне адбыліся два пажары — у краме і сельскім клубе.

— Пра загаранне крамы па продажы аўтазапчастак для сельскагаспадарчай тэхнікі па вуліцы Міра ў Старых Дарогах стала вядома а палове восьмай раніцы. Прычым не ад вартаўніка, які ў гэты момант знаходзіўся ў будынку, а ад відавочцы, — расказаў **старшы інспектар Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці МНС Алег МАЛЕВІЧ**. — Абшыты сайдынгам драўляны будынак на момант прыбыцця пажарных ужо гарэў адкрытым полымем. Агонь знішчыў дах, знутры выгараў мансардны паверх, былі пашкоджаны перакрыцці па ўсёй плошчы і сайдынг на плошчы 20 квадратных метраў. Пацярпелых не было. Мяркуецца, што пажар здарыўся з-за перапальвання печы.

Ужо 1 лютага пасля 4 гадзін раніцы «запалаў» будынак сельскага Дома культуры ў вёсцы Дражно.

— Гарэў дах, агонь распаўсюджваўся па ўнутраных памяшканнях, калі на месца прыбылі аварыйна-выратавальныя падраздзяленні, — паведаміла падрабязнасці **старшы інспектар цэнтра прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС Дыяна ЖАЛЯЗНЯК**. — Аднапавярховы цагляны будынак быў узведзены ў 1978 годзе, пажарнай сігналізацыяй абсталяваны не быў. Каля 3 гадзін ночы прыбіральшчык клуба прапаліў кацёл і пайшоў дадому. У выніку пажару знішчаны дах, будынак выгараў знутры. Прычыны здарэння і матэрыяльны ўрон устанаўліваюцца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревнях Мглё, Емельяново, Прудище и аг. Юрьево Усяжского сельского исполнительного комитета Смолевичского района Минской области

1.	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2.	**Дата, время и место проведения аукциона**	7 марта 2012 года в 15.00, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10, Усяжский сельисполком, кабинет председателя
3.	**Продавец и его адрес**	Усяжский сельский исполнительный комитет, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10
4.	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	**Лот № 1** — земельный участок площадью 0,1500 га, № 624885602601000103 в д. Емельяново; **Лот № 2** — земельный участок площадью 0,1899 га, № 624885605201000058 в д. Прудище; **Лот № 3** — земельный участок площадью 0,1844 га, № 624885610501000273 в аг. Юрьево; **Лот № 4** — земельный участок площадью 0,1507 га, № 624886001101000142 в д. Мглё, ул. Жодинская
5.	**Условия продажи**	Без изменения целевого назначения
6.	**Целевое назначение земельного участка**	Для строительства и обслуживания жилого дома
7.	**Начальная (стартовая) цена**	**Лот № 1** — 32 904 140 рублей **Лот № 2** — 13 987 270 рублей **Лот № 3** — 17 877 570 рублей **Лот № 4** — 30 476 010 рублей
8.	**Условия аукциона**	– продажа по цене не ниже начальной; – участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь
9.	**Наличие инженерной инфраструктуры**	д. Прудище — электроснабжение; аг. Юрьево — водоснабжение, электроснабжение; д. Мглё, Емельяново — газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение
10.	**Условия оплаты**	Безналичный расчет в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона
11.	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3604627110007 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок»)
12.	**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками**	Каждая среда в 10.00
13.	**Окончательный срок приема документов**	01 марта 2012 года в 17.00
14.	**Контактный телефон**	8 (01776) 67 131, 67 2 88; 55 342

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: **для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.

3. Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛЫХ ДОМОВ В ПОСТАВСКОМ РАЙОНЕ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

Дата, время, место проведения аукциона	**14 февраля 2012 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, III этаж, каб. 58)**						
Адреса, площади, кадастровые номера земельных участков, начальная цена	**№№ лотов**	**Адреса участков**	**Площадь, га**	**Кадастровый номер**	**Наличие ограничений в использовании**	**Начальная цена, рублей**	**Сумма подлежащих возмещению организатору аукциона расходов на его проведение**
	1.	Ширковский сельсовет, д. Симоньки, ул. Набережная, д. 3	0,1900	224081308601000047	водоохранная зона озера Свито	15 000 000	4 515 047
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона	- внесение победителем аукциона в местный бюджет платы за право частной собственности на земельный участок в размере, заявленном на торгах; - возмещение сельисполкомам расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельных участков, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельных участков; - государственная регистрация права на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка; - получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; - занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации						
Порядок осмотра на местности земельных участков, которые предполагается передать в частную собственность по результатам аукциона	В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11						
Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала	- заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе); - квитанция об уплате задатка; - ксерокопия стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования; - представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность						
Место, дата и время начала и окончания приема заявлений	г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. № 11 в рабочие дни с 8^{00} до 17^{00} со дня публикации извещения до 13.02.2012 включительно						
Размер задатка, срок и порядок его внесения	10% от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет соответствующего сельисполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе.						
Адрес и номер контактного телефона комиссии	г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. № 11 в рабочие дни с 8^{00} до 17^{00} (перерыв на обед с 13^{00} до 14^{00}), телефоны: 8 (02155) 43180, 41132.						

2

ЛЮТАГА
2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 3 (15689)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Акцыі

КАЛЯДНАЯ СУСТРЭЧА «НА АСАБІСТЫМ ПРЫКЛАДЗЕ!»

...прайшла ў Мінскім абласным прыёмніку-размеркавальніку

Яе ў рамках акцыі «Нашы дзеці» правялі валанцёры руху «Добрае Сэрца» Мінскай абласной арганізацыі БРСМ сумесна з Мінскай гарадской дырэкцыяй ААТ «Белаграпрамбанк».

Такое мерапрыемства праводзіцца ўжо не ўпершыню і скіравана на аказанне псіхалагічнай падтрымкі падлеткам Міншчыны, асуджаным на пазбаўленне волі.

Традыцыйным стаў удзел у акцыі тытулаваных беларускіх спартсменаў: чэмпіёна свету па тайскім боксе Юрыя Жукоўскага і чэмпіёна свету па кікбоксінгу, майстра спорту міжнароднага класа Мурата Азярбіева.

Упершыню ў госці да падлеткаў разам з кіраўніком танцавальнага клуба MAFIA, двухразовым чэмпіёнам Беларусі па хіп-хопе Антонам Аполькам завіталі танцоры, якія прадстаўляюць студыю Black Fox. Спецыялісты кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь прыйшлі са сваімі чатырохногімі гадаванцамі і арганізавалі асобнае выступленне.

Майстар-класы па тайскім боксе, кікбоксінгу, хіп-хопе, паказальныя выступленні кіналагічнага цэнтра, сумесныя фота, адрасы і тэлефоны спартыўных студый, дзе будуць чакаць і куды можна будзе звяртацца пасля выхаду на волю, павінны падтрымаць падлеткаў, прадэманстраваць, чаго можна дасягнуць працай і ўпартасцю. Удзельнікі акцыі параілі гледачам не падаць духам, паставіць перад сабой мэту і імкнуцца да яе.

Інга МІНДАЛЁВА.

ШКОЛЬНАЕ МЕНЮ — СЁННЯ НА ЗАЎТРА...

На думку дыетолагаў, сучасны школьнік павінен есці не менш як чатыры разы на дзень, а прамежкі паміж прыёмамі дзіцем ежы павінны складаць не больш як чатыры гадзіны. Вось і лічыце: пры ўмове, што перад заняткамі дзіця добра паснедала ці паабедала, ужо праз чатыры ўрокі яно ўсё роўна павінна што-небудзь з'есці, інакш у яго пачнецца раздражненне слізістай абалонкі страўніка. Дзіцяці ўвогуле, у адрозненне ад дарослых, трэба есці часцей, аднак пры гэтым прынцыповае значэнне мае, што знаходзіцца ў яго на стале: каша з катлетай, запяканка ці сасіска ў цесце або кавалак піцы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ГАСТРЫТ, дыскінезія, язвавая хвароба, астэапароз, атлусценне, дыябет II тыпу — вось далёка не поўны пералік наступстваў нездаровага харчавання нашых дзяцей. У Мінску каля 14 % школьнікаў маюць залішнюю вагу цела, што правакуе шэраг вельмі сур'ёзных праблем, напрыклад, развіццё ў дзяцей і падлеткаў дыябету II тыпу. Між іншым, на дыябет II тыпу захварэла ўжо каля тысячы беларускіх дзяцей. А такой колькасці пераломаў, якая рэгіструецца сярод дзіцячага насельніцтва ў апошнія гады, спецыялісты нават і не могуць прыгадаць. Як тлумачаць медыкі, прычынай незвычайнай крохкасці касцей у дзяцей становіцца дэфіцыт кальцыю.

— Бацькі фактычна адвучылі сваіх дзяцей ад малака, — канстатуе **загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА.** — Між іншым, дзіцяці дашкольнага і школьнага ўзросту ў суткі трэба спажываць не менш як 500 гр. малочных і кісламалочных прадуктаў, 40 гр. тварагу. Не менш як два разы на тыдзень на стале ў дзіцяці павінна быць рыба. Кожны дзень школьнік павінен спажываць каля 100 гр. мяса і каля 300 гр. гародніны і садавіны. Галоўнае правіла — харчаванне дзіцяці павінна быць максімальна разнастайным. Лепш зрабіць дзіцяці ўсяго адну адбіўную, каб забяспечыць сутачную патрэбу ў бялках, чым нашпігоўваць яго сасіскамі ці каўбасой, якія, акрамя пустых калорый, ніякай карысці не даюць. Менавіта па гэтай прычыне ў школьным меню (пры ўмове адпаведнага харчавання) дапускаецца прысутнасць сасісак не больш чым адзін раз на тыдзень.

Як запэўнівае Ала Малахава, важная перавага школьных сняданкаў і абедаў — гэта іх дыетычны характар. Пры прыгатаванні страў для дзяцей выкарыстоўваюцца пераважна тушэнне, варка і прыгатаванне на пару. Пэўны час таму распачалося аснашчэнне сталовых сучаснымі відамі абсталявання, якое забяспечвае ашчаднае прыгатаванне ежы з мінімальнымі стратамі вітамінаў і мікраэлементаў. Заслугоўвае ўвагі вопыт работы ў гэтым напрамку сталіцы, дзе ў сталовых усталявана ўжо каля паўсотні параканвектаматаў. Для максімальнага ахопу навучэнцаў гарачым харчаваннем і паляпшэння яго якасці ва ўстановах адукацыі ўкараняюцца новыя тэхналогіі прыгатавання ежы і прагрэсіўныя формы абслугоўвання, такія як папярэдні заказ страў па меню заўтрашняга дня, абслугоўванне з элементамі «шведскага стала». Па папярэдніх заказах працуе каля паловы агульнаадукацыйных устаноў. І, як правіла, у такіх установах забяспечваецца стапрацэнтны ахоп навучэнцаў гарачым харчаваннем. На камбінатах школьнага харчавання ўжо перасталі здзіўляцца, калі са школы ім прыходзіць заказ вячэрняга меню рэстарана.

Пэўны час таму быў перагледжаны і пералік прадукцыі, дазволенай у харчаванні школьнікаў:

— Мы выключылі з яго закусачныя кансервы з гародніны, пры прыгатаванні якіх выкарыстоўваецца воцат, і закусачныя рыбныя кансервы, калі пры іх прыгатаванні выкарыстоўвалася вэнджаная ці смажаная рыба (рыбныя кансервы ў таматным соусе, у марынадзе, у жэле, кансервы-паштэты, шпроты і г.д.), — расказала Ала Малахава. — Прыкладны пералік асартыментнай прадукцыі, дазволенай да рэалізацыі ў школьных буфетах, уключае свежую садавіну і гародніну, салаты са свежай гародніны са свежым зяленівам, салаты з морапрадуктаў, тварожныя вырабы (сыркі, пудынгі) у прамысловай парцыённай упакоўцы, сыры, сухія сняданкі тыпу мюсляў у выглядзе батончыка. З кандытарскіх вырабаў да продажу дапускаюцца мармелад, зефір, шакалад, вафлі. З ласункаў — жэле, арэхі, сухафрукты, казінакі. З напіткаў — малако, кісламалочныя напіткі, сокі і нектары, напіткі з журавін, шыпшыны і іншыя карысныя вітамінізаваныя напіткі. Дарэчы, чыпсы і газіроўка даўно знаходзяцца ў школьных буфетах пад забаронай.

— Бацькам, якія даюць дзецям з сабой грошы на харчаванне ў школе, я параіла б абавязкова цікавіцца, што яны набываюць за іх у школьным буфеце, — падкрэсліла Ала Малахава, — каб не атрымалася, што дзіця купіла ў буфеце 9 піражкоў, а на гарбату ў яго грошай ужо не засталося. У выпадку, калі бацькі бачаць, што іх дзяцей кормяць у школе нясмачна, прычым дзеці скардзяцца на тое, што стравы падаюць на стол ужо халоднымі, або карысная запяканка замяняецца сасіскай ці вафлямі, пра гэта нельга маўчаць. Трэба абавязкова інфармаваць адміністрацыю школы.

Зрэшты, ашчадным харчаванне павінна быць не толькі ў школе, і бацькам нядрэнна было б гэта засвоіць. Нездаровыя харчовыя звычкі фарміруюцца, як правіла, у сям'і. Бутэрброды і сасіскі не павінны быць заменнікам паўнавартаснага сняданку. Без каш з чорных круп (грэцкай, ячнай, аўсянай) у дзіцячым харчаванні нельга абысціся . «Лыжка кашы раніцай — гэта пацалунак страўніку дзіцяці», — сцвярджаюць медыкі. І яны маюць рацыю....

Надзея НІКАЛАЕВА.

КАМІТЭТ ДЗЯРЖКАНТРОЛЮ ПРАВЁЎ МАНІТОРЫНГ ДЗЕЙНАСЦІ ЎСТАНОЎ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ

— Алё, гэта прамая лінія?
— Так, а чаму вы плачаце?
— Мае ўнукі займаюцца ў цэнтры дадатковай адукацыі «Золак». І калі я бачу, што яны там робяць, не магу стрымаць слёз. Усё настолькі цудоўна! Педагогі — ад Бога, яны такія працаголікі. Дзеткі ў цэнтры і адпачываюць, і вучацца, з задавальненнем ходзяць на ўсе заняткі.

Нават такі званок паступіў на прамую лінію, якую Камітэт дзяржаўнага кантролю ладзіў, каб вывучыць сітуацыю з прадастаўленнем паслуг сістэмай дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і выкананнем заканадаўства пры яе арганізацыі. Добрая доля званкоў, якія на яе паступілі, былі менавіта падзякамі як асобным кіраўнікам гурткоў, так і наогул установам дадатковай адукацыі за тую працу, што яны робяць.

У час прамой лініі бацькі выказалі пажаданні і пра паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы некаторых устаноў, і пра тое, што трэба, каб гурткі працавалі па больш зручным графіку, і што неабходна павялічваць колькасць заняткаў, на якія цікава будзе хадзіць хлопчыкам.

На прамую лінію патэлефанаваў член Саюза мастакоў, скульптар Іван Козел, які ўпэўнены, што неабходна ствараць сістэму заахвочвання дзяцей, што атрымліваюць дадатковую адукацыю. Так, на яго думку, дзеці, якія займаліся некалькі гадоў, павінны атрымліваць у канцы навучання пэўныя пасведчанні, якія будуць улічвацца пры паступленні ў профільныя навучальныя ўстановы. Між іншым, гэта можа быць заахвочваннем і бацькам, бо некаторыя з іх не павядуць сваіх дзяцей у гурткі, калі ў дадатковым навучанні не ўбачаць ніякіх пераваг. Дарэчы, многіх вядомых скрыпачоў у музычныя школы за руку прыводзілі менавіта бацькі.

З Гродна паступіў званок з заўвагай, што некаторыя гурткі пераведзены на платную аснову, маўляў, гэта не адпавядае закону, дзе прадугледжана магчымасць бясплатнай дадатковай адукацыі. Насамрэч, у дзейным Кодэксе аб адукацыі сказана, што навучэнец мае права на бясплатную дадатковую адукацыю. І сёння ўстановы прапануюць нямала бясплатных гурткоў па самых розных кірунках. Асобныя ж паслугі, якія карыстаюцца асаблівым попытам, могуць аказвацца на платнай аснове. Дзякуючы ў тым ліку платным паслугам гурткі развіваюцца: 40% з грошай, зароблены такім чынам, ідзе на заахвочванне педкалектыву, 60% — на паляпшэнне і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

У час прамой лініі выказвалася пажаданне, каб ствараліся і новыя цэнтры, прычым адразу з прапановай, як гэта можна было б зрабіць.Чаму б не ствараць гурткі для дзяцей на базе гандлёвых цэнтраў? Мамы і таты, якія ў дзяцінстве былі ахоплены пазашкольнай адукацыяй, могуць прыгадаць, што многія гурткі раней працавалі нават у паўпадвальных памяшканнях. Жыхарка Цэнтральнага раёна пацікавілася, хіба на вялікіх плошчах сучасных гандлёвых цэнтраў не знойдзецца службовага памяшкання, якое можна абсталяваць, напрыклад, пад лыжную секцыю, тым больш калі побач з будынкам знаходзіцца парк, дзе маглі б займацца дзеці.

Дарэчы, сёння ў рэспубліцы налічваецца 354 установы дадатковай адукацыі, у якіх займаецца 405 тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак (дадатковай адукацыяй ахоплена 43% дзяцей). Усяго працуе 31694 аб'яднанні па інтарэсах. Што тычыцца сталіцы, тут ахоп дзяцей дадатковай адукацыяй нават вышэйшы — ён сёння складае 52,5%. У Мінску створана 35 устаноў дадатковай адукацыі. У 6198 гуртках займаецца каля 81 тысячы хлопчыкаў і дзяўчынак.

Здавалася б, маюцца неабходныя рэсурсныя ўмовы, кадры, гатовыя працаваць з дзецьмі. Выдаткоўваюцца немалыя грошы з бюджэту на ўтрыманне і развіццё ўстаноў. Але калі Камітэт дзяржаўнага кантролю пачаў праводзіць маніторынг дзейнасці ўстаноў дадатковай адукацыі, быў выяўлены шэраг праблем. **Начальнік Галоўнага ўпраўлення кантролю за работай галін сацыяльнай сферы Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Ала МІКАЛУЦКАЯ** паведаміла, што маніторынг праводзіцца па ўсёй краіне і ўсюды выяўляюцца аднолькавыя праблемы: неэфектыўна выкарыстоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база і патэнцыял педагагічных работнікаў. Некаторым цэнтрам трэба больш сябе рэкламаваць, наладжваць сувязі з бацькамі і школамі, прымаць адпаведныя захады, каб павялічваць напаўняльнасць гурткоў і каб утрымаць тых дзетак, якія пачалі ў іх займацца. Калі нечага не хапае для функцыянавання гуртка на належным узроўні, дзеці губляюць да заняткаў інтарэс. Напрыклад, ёсць добрыя спецыялісты, які могуць знаёміць хлопчыкаў з авіямадэляваннем, ёсць база, дзе дзеці атрымаюць тэорыю, але няма ўмоў для таго, каб запусціць той жа самалёцік, сканструяваны дзіцем.

Трэба зазначыць, што маніторынг дзейнасці ўстаноў дадатковай адукацыі Камітэт дзяржкантролю праводзіў яшчэ ў маі. Адным з першых быў наведаны цэнтр «Маяк», у якім быў выяўлены шэраг негатыўных момантаў: недастатковая матэрыяльна-тэхнічная база, парушэнне санітарных і пажарных нормаў, дрэнна функцыянавалі філіялы. З таго часу ў гэтым цэнтры адбыліся вялікія перамены, прычым на тое, каб палепшыць працу ўстановы дадатковай адукацыі, не трэба было вялікіх грашовых укладанняў. У гуртках паболела дзяцей, незапатрабаваны філіял быў зачынены, затое другі, які знаходзіцца побач, запрацаваў на поўную моц. Былі выдзелены і грошы на паляпшэнне базы, у будынку будзе праведзена рэканструкцыя.

Маніторынг дзейнасці ўстаноў дадатковай адукацыі Камітэт дзяржкантролю праводзіць разам з органамі адукацыі. І сэнс гэтай справы ў тым, каб не проста выявіць пэўныя недахопы, а выпрацаваць канкрэтныя прапановы для іх устаранення. «Пасля маніторынгу мы абагулім усе сабраныя матэрыялы і сядзем за стол перамоў з органамі адукацыі. Неабходна рабіць захады дзеля таго, каб у кожнай установе гурткі былі напоўнены і ўсё тое, што створана, прыносіла карысць, каб дзеці не проста наведвалі цэнтры, а атрымлівалі якасныя паслугі», — заўважыла Ала Мікалуцкая.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі ў наступным навучальным годзе плануюць увесці модульна-рэйтынгавую сістэму ацэньвання ведаў студэнтаў. Галоўная яе адметнасць — дзяленне дысцыплін на асобныя модулі або раздзелы. Кожны з іх будзе ацэньвацца асобна і ўплываць на выстаўленне выніковай адзнакі.

Аўрал на сесіях адмяняецца?

Калі раней узровень ведаў маладых людзей вызначала адзнака, атрыманая на заліку або экзамене, то з новага навучальнага года яе значнасць складзе толькі 30 %. Астатнія 70 % студэнт будзе дабіраць за кошт актыўнасці на лекцыях і практычных занятках, а таксама за кошт удзелу ў канферэнцыях, семінарах і навукова-даследчай рабоце. Такім чынам, новая сістэма ацэньвання будзе стымуляваць работу студэнтаў на працягу ўсяго навучальнага года, а не толькі падчас здачы сесіі.

З 1 верасня па новай сістэме пачнуць навучацца студэнты першага курса, а на старэйшых курсах на новую сістэму будуць пераходзіць паступова: на асобных спецыяльнасцях і па асобных прадметах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

СТУДЭНЦКІ ПРАФКАМ — РУКУ ПАДАМ!

...ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ ПРАФСАЮЗНАГА ЛІДАРА — НЕ СТРАЦІЦЬ ДАВЕРУ ЛЮДЗЕЙ

Днямі ў сценах Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО» Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі завяршылася інтрыга, якая захоўвалася амаль цэлы год — пераможцай рэспубліканскага конкурсу «Прафсаюзны лідар» сярод кіраўнікоў пярвічных прафсаюзных арганізацый навучэнскай моладзі была аб'яўлена старшыня прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна Іна ЖАК.

Па словах **намесніка старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Рамана ДАПІРЫ,** фіналу папярэднічалі тры напружаныя адборачныя туры. Больш як два месяцы спатрэбілася журы для правядзення экспертызы і ацэнкі матэрыялаў, прадстаўленых на III адборачны тур, каб канчаткова вызначыцца са складам фіналістаў. Пад увагу браўся творчы характар асобы канкурсанта, дакладнасць, лаканічнасць і лагічнасць выкладзенай ім інфармацыі, актуальнасць і сацыяльная значнасць пададзенага на конкурс матэрыялу. У сваіх анкетах канкурсанты выказвалі ўпэўненасць, што «не заўсёды можна перамагчы, але зрабіць сябе непераможным можна заўсёды». Паведамлялі, што «галоўным у сваёй прафсаюзнай рабоце яны лічаць клопат пра людзей і імкненне не страціць іх давер». На думку канкурсантаў, сапраўднага прафсаюзнага лідара характарызуюць кампетэнтнасць, любоў да справы, якой займаешся, уменне чэрпаць у ёй радасць, задавальненне і сілы для далейшай работы. А найлепшых вынікаў, на іх думку, можна дабіцца толькі пры наяўнасці моцнай каманды.

У выніку, па рашэнні журы, у фінале сустрэліся **старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі навучэнцаў Бабруйскага дзяржаўнага аўтатранспартнага каледжа Галіна ДЗЕМІДАВЕЦ, старшыня прафсаюзнага бюро факультэта фінансаў і банкаўскай справы БДЭУ Вольга МІНІЧ, старшыня прафбюро студэнтаў факультэта транспартных камунікацый БНТУ Арцём ЮШКЕВІЧ** і **старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна Іна ЖАК.**

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Дасье на Іну ЖАК — уладальніцу ганаровага звання «Прафсаюзны лідар»:

— любіць цікава жыць;

— ведае, што тры рэчы ніколі не вяртаюцца — час, слова і магчымасць. Тры рэчы не варта губляць — спакой, надзею і гонар. Тры рэчы ў жыцці найбольш каштоўныя — каханне, перакананне і сяброўства.

Іна Жак лічыць, што сапраўднага прафсаюзнага лідара характарызуе прафесіяналізм. Мала толькі ведаць, веды трэба прымяняць. Мала толькі жадаць, трэба яшчэ і штосьці для гэтага рабіць.

Намеснік міністра адукацыі Казімір ФАРЫНО не шкадуе адзнак канкурсантам.

КОЖНЫ ДЗЕНЬ — У ПУАНТАХ

Многім яшчэ з дзяцінства прафесія балерыны падаецца чароўнай, прыгожай, але недасягальнай. А між тым, атрымаць спецыяльную адукацыю можна не толькі за мяжой, але і ў нашай краіне. Трэба, як гавораць, апынуцца ў пэўны час у пэўным месцы.

У Мінску ёсць толькі адна ўстанова, якая рыхтуе будучых зорак балета, — гэта Беларуская дзяржаўная харэаграфічная гімназія-каледж. Туды прымаюць дзяцей з 11 гадоў, але працэс паступлення значна адрозніваецца ад звычайнага.

— Мы шукаем таленты па ўсёй краіне, — расказвае **намеснік дырэктара гімназіі-каледжа Кацярына АРХІПАВА,** — ездзім па абласных цэнтрах. Акрамя ведаў са школьнай праграмы, на ўступных іспытах правяраюць наяўнасць сцэнічных і прафесійных даных. Працуем таксама і з бацькамі: не ўсе дакладна разумеюць, чым будзе займацца іх дзіця падчас навучання і пасля яго. У каледж прымаюць іншагародніх дзетак, некаторыя нават прыязджаюць з-за мяжы, таму пры ўстанове існуе інтэрнат.

Праграма на аддзяленні класічнага танца разлічана на 8 гадоў. Прымаюць і дзяўчат, і хлопцаў. Нагрузку вытрымліваюць не ўсе, і ў класе з 16 чалавек да выпуску застаецца прыкладна палова.

Балет пачынаецца з...

...раскладу заняткаў. Першы ўрок — у 8:30, а заканчваюцца заняткі не раней за чатыры гадзіны вечара.

Дзеці прыходзяць у гімназію-каледж пасля чатырох гадоў навучання ў агульнаадукацыйнай школе, і новая праграма ўключае значна больш прадметаў. Акрамя стандартнага набору з фізікі, матэматыкі, хіміі і моў, не менш за дзве гадзіны на дзень прысвячаецца навучанню класічнаму танцу. У расклад таксама ўключаны іншыя спецыяльныя дысцыпліны: дуэтны танец, майстэрства акцёра і г.д.

Дзяўчаты займаюцца танцамі асобна ад хлопцаў, паколькі праграма навучання класічнаму танцу ў іх адрозніваецца. Урокі праходзяць у вялікіх залах з люстэркамі на ўсю сцяну і абавязкова пад акампанемент фартэпіяна. Кожная дзяўчынка ў белых панчохах, з прыбранымі валасамі і амаль без упрыгажэнняў — у каледжы вельмі шануюць традыцыі.

Акрамя таго, два разы на тыдзень вучні займаюцца музыкай — вучацца іграць на піяніна.

Навучэнцы праводзяць у каледжы большую частку дня, выхадны адзін — нядзеля. Часу хапае толькі на адпачынак і выкананне хатняга задання. Але некаторыя знаходзяць час і на хобі — напрыклад, маляваць, пісаць вершы, спрабаваць іграць на гітары. Некаторыя займаюцца спортам (з улікам, што футболам і валейболам займацца навучэнцам не рэкамендавана).

Самая строгая дыета

Зразумела, будучы артыст балета павінен трымаць сябе ў форме. Пры каледжы ёсць сталовая, у якой харчуюцца ўсе вучні. У меню сталовай не значацца ні булкі, ні макароны, ні іншыя мучныя стравы. Але дыета разлічана з розумам, каб малады арганізм атрымліваў усе неабходныя элементы для развіцця. Харчаванне строга кантралюецца, меню складае ўрач.

Навучэнцам даводзіцца трымаць сябе ў руках і пільна сачыць за фігурай. Бо калі будучая балерына не адпавядае стандартам для свайго ўзросту, каледж вымушаны з ёй развітацца. Паняцце масы цела для артыстаў балета — момант вельмі важны, яны ўсё жыццё сябе абмяжоўваюць. Дзяўчаты прызнаюцца, што застацца ў балеце ім больш важна, чым з'есці булку.

Бацькі клапоцяцца пра сваіх дзяцей і разумеюць: балет — праца складаная і фізічна, і маральна.

Дарэчы, бацькі падтрымліваюць дзяцей і матэрыяльна. Канцэртныя касцюмы ёсць у тэатрах, а вось для штодзённых заняткаў купляюць строй за свае грошы. Прычым гэта не вельмі танная справа. Напрыклад, адна пара пуантаў каштуе каля 300 тысяч рублёў. Акрамя іх патрэбны і панчохі, і вопратка, і — абавязкова! — заколкі для прычосак.

Строгі рэжым, жорсткія абмежаванні ў ежы, штодзённыя фізічныя нагрузкі — усё гэта вытрымлівае не кожны. Выкладчыкі разумеюць, імкнуцца дапамагчы, але без пэўных якасцяў навучэнцам не пратрымацца. Самі яны кажуць: каб прайсці ўвесь шлях і стаць артыстам, вучань павінен быць не толькі таленавітым, але і ўпартым, працаздольным. Над кожным сваім рухам і позай трэба думаць! А каб пэўныя пазіцыі і «па» дайшлі да аўтаматызму, спатрэбіцца шмат часу і цярпення.

Усе дзяўчаты і хлопцы за гады навучання не раз будуць выступаць на сцэне Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета, таму што каледж працуе над пастаноўкамі, ролі ў якіх выконваюць вучні. Зразумела, гэтыя выступленні матывуюць і выхоўваюць: ужо з такога юнага ўзросту танцоры адчуваюць адказнасць за сваю працу, атрымліваюць ацэнку ад гледачоў, — адзначае **дырэктар харэаграфічнай гімназіі-каледжа Зорыя ДУСЕНКА.**

Пасля заканчэння каледжа навучэнцам выдаецца дыплом па спецыяльнасці «Артыст. Кіраўнік творчага калектыву. Настаўнік». Некаторыя паступаюць у ВНУ, іншыя застаюцца працаваць у Беларускім дзяржаўнам тэатры оперы і балета або ідуць у Музычны тэатр, у харэаграфічную трупу Цітовіча, у дзяржаўныя ансамблі танца.

Артыст балета выходзіць на пенсію пасля 20 гадоў працы — ён можа стаць педагогам у каледжы або школе ці працаваць у самадзейным калектыве.

У каледжы пануе асаблівая атмасфера: калі ідзеш па калідоры, з залаў чуецца класічная музыка, якую выконвае канцэртмайстар, кожная дзяўчынка вітаецца з госцем установы таксама своеасабліва — робіць кніксэн, а хлопцы кланяюцца. Таму вобраз артыстаў балета такі і ёсць — чалавека культурнага, але сціплага, ціхага, якому і ў жыцці акампануе класіка. Але за прыгажосцю кожнага руху на сцэне стаіць велізарная праца. Шмат гадоў працы над сабой...

Настасся ХРАЛОВІЧ.
Фота аўтара.

КАМІТЭТ ДЗЯРЖКАНТРОЛЮ ПРАВЁЎ МАНІТОРЫНГ ДЗЕЙНАСЦІ ЎСТАНОЎ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

А ДЗЕ ДЗЕЦІ?

Карэспандэнт «Звязды» таксама выправілася ў адзін з рэйдаў па ўстановах дашкольнай адукацыі, які праводзіўся Камітэтам дзяржаўнага кантролю.

Супрацоўнікі цэнтра пазашкольнай працы «Светач» Савецкага раёна горада Мінска правялі нас па сваім дзіцячым царстве, дзе віруе творчае жыццё. Мы завіталі на заняткі да юных танцораў, спевакоў, мастакоў і дызайнераў. Пяцігадовыя карапузы пахваліліся, што яны ўмеюць лічыць на англійскай мове, а іх бацькі запэўнілі, што ў школе ранняга развіцця, якая працуе на базе цэнтра, дзіця могуць навучыць чытаць нават за тры заняткі. Між іншым, у некаторыя з гурткоў «Светача» не так лёгка патрапіць — надта вялікая колькасць ахвотнікаў. Усяго супрацоўнікі цэнтра вядуць 266 гурткоў, і частка з іх функцыянуе на базе школ. Сёння кіраўніцтва цэнтра робіць усё неабходнае для таго, каб вырашаць пытанні з недахопам плошчаў. Напрыклад, у юных жыхароў раёна адзін з самых запатрабаваных кірункаў — сучасныя танцы. Калі летась у цэнтры іх выкладалі 5 педагогаў, сёння ўжо 7. Цікавяцца падлеткі і чэрлідзінгам, для заняткаў якім, таксама як і танцамі, патрабуюцца прасторныя залы з высокімі столямі...

У той час, як у многіх цэнтрах дадатковай адукацыі Мінска кіпіць жыццё, а часам нават не хапае памяшканняў, каб заняць усіх ахвотных, можна патрапіць і ў «маўклівыя» будынкі. У Рэспубліканскім цэнтры турызму і краязнаўства ў час праверкі на занятках было ўсяго 11 хлопчыкаў. І гэта на ўвесь трохпавярховы прасторны будынак. Пуставала і турысцкая база, якая займае трэць будынка, дакладней, пуставалі асобныя яе пакоі, а ў іншыя засяліліся людзі, якія прыехалі на заняткі на падрыхтоўчым аддзяленні і ніякага дачынення да турызму не мелі. Праўда, як нас запэўнілі, гэта часовая з'ява: толькі што адшумелі канікулы з пастаяннымі экскурсіямі, і такое зацішша натуральнае для другой паловы студзеня, бо і дзеці, і настаўнікі адпачываюць пасля насычанай канікулярнай праграмы. Наогул праца цэнтра мае сваю спецыфіку, яна асабліва актывізуецца з красавіка, дзеці выпраўляюцца ў падарожжы, праводзяцца рэспубліканскія турслёты, улетку ствараюцца палаткавыя лагеры. Але гэта не значыць, што ў астатні час тут нічога не робіцца. Цэнтр праводзіць метадычную працу, адказвае за арганізацыю работы музеяў устаноў адукацыі, праводзіць конкурс «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся», працуе з настаўнікамі, якія пасля павядуць сваіх вучняў у паходы. А юныя турысты, краязнаўцы ў большасці сваёй займаюцца ў гуртках, якія дзейнічаюць на базе школ, у чым таксама ёсць сэнс. Па-першае, дзецям зручней займацца непасрэдна па месцы жыхарства, па другое, цэнтр знаходзіцца ў прыватным сектары, і ў зімовы час, калі рана цямнее, не кожная маці адважыцца выправіць дзіця сюды на заняткі.

Але ці павінен прастойваць пустым шыкоўны будынак, няхай і часова? Усё ж дзяржавай выдаткоўваюцца немалыя грошы на ўтрыманне гэтага будынка, на камунальныя плацяжы, і яны павінны выкарыстоўвацца рацыянальна і эфектыўна, каб як мага больш дзяцей было задзейнічана ў сістэме дадатковай адукацыі . Вырашыць гэту задачу можна, калі наладзіць у цэнтры больш актыўную працу з рэгіёнамі, канкрэтнымі школамі, распрацаваць каляндарны графік, каб сюды з рэгіёнаў пастаянна прыязджалі дзеці ды выпраўляліся на экскурсіі па Мінску і за яго межы.

Завіталі мы і ў Рэспубліканскі цэнтр тэхнічнай творчасці. Стрэлкі гадзінніка ўжо мінулі лічбу 19, а тут яшчэ займаліся гурткоўцы, прычым розных узростаў, самым маленькім толькі споўнілася пяць гадоў, а старэйшыя ўжо вучацца ў каледжах.

У жніўні-верасні запіс у некаторыя гурткі гэтага цэнтра нагадвае прыёмную кампанію: конкурс — некалькі чалавек на месца. Сярод асабліва запатрабаваных — картынг. Я пацікавілася, ці магчыма павялічыць наборы на такі гурток. «Абмежаванне для гэтага толькі адно — кадры, сама ж матэрыяльная-тэхнічная база ў нас дастатковая, маем добрую лабараторыю, цудоўны стадыён», — заўважыў **намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай частцы Аляксандр КАРАБА.**

Зрэшты сёння, калі ў цэнтрах дадатковай адукацыі могуць навучацца не толькі дзеці, але і моладзь, кадравую праблему, напэўна, будзе прасцей вырашыць, бо выхаванцы студый з часам могуць стаць і яе педагогамі. Прынамсі, ужо сёння тут выкладаюць маладыя спецыялісты, якія самі некалі былі гурткоўцамі.

Кіраўнік аб'яднання «Мастацкая фатаграфія» Канстанцін Нетылёў (між іншым, больш за 400 яго выхаванцаў, якіх ён падрыхтаваў за 42 гады такога «настаўніцтва», на прафесійным узроўні працуюць у 12 краінах свету) заўважае, што заняткі ў падобных цэнтрах для хлопцаў і дзяўчат — гэта магчымасць «памацаць» прафесію. Адна справа — паступіць у пэўную навучальную ўстанову і скончыць яе з разуменнем, што атрымаў не тую прафесію, якой хацелася б займацца ўсё жыццё. І зусім іншая — калі можна паспрабаваць сябе ў розных кірунках, павыбіраць занятак, які больш на душу кладзецца. Дарэчы, многія з выпускнікоў цэнтра звязваюць сваё жыццё з тэхнікай. Трэба заўважыць, што гурткоўцы годна прадстаўляюць нашу краіну. Напрыклад, за апошнія 10 гадоў судамадэльная лабараторыя падрыхтавала 5 чэмпіёнаў свету. На міжнародным узроўні нядрэнна паказваюць сябе картынгісты: з перамогамі са спаборніцтваў, якія праводзяцца за межамі Беларусі, вяртаюцца ўдзельнікі навукова-тэхнічных канферэнцый...

Хочацца верыць, што і тыя ўстановы дадатковай адукацыі, дзе сёння выяўлены пэўныя недахопы, ужо заўтра змогуць пахваліцца сваімі здабыткамі і што колькасць дзяцей, якія знойдуць любімую справу, будзе расці.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».

Жыццё за межамі стыпендыі

СЁННЯШНІ СТУДЭНТ У ГРУЗЧЫКІ НЕ РВЕЦЦА...

Сёння ў студэнцкім асяродку наўрад ці засталіся тыя, хто есць толькі хлеб с салам на працягу тыдня і жыве на стыпендыю. І ўсё ж грошы лішнімі ніколі не бываюць. Таму многія не супраць знайсці падпрацоўку на вольны ад вучобы час. Калі пакаленне бацькоў сённяшніх «грызуноў» граніту ўніверсітэцкай навукі атрымлівала дадатковыя рублі, у асноўным працуючы ў будаўнічых атрадах ці, напрыклад, разгружаючы вагоны, што мала было звязана з будучай прафесіяй альбо нейкімі выдатнымі здольнасцямі, то цяперашнія студэнты крыху хітрэйшыя. Стамляцца лішні раз не стануць, але выкарыстоўваюць любую магчымасць падзарабіць, а па спецыяльнасці пачынаюць працаваць, яшчэ не маючы дыплома.

МАНЕТЫЗАЦЫЯ ЗАХАПЛЕННЯ

Насця Высоцкая вучыцца на першым курсе гуманітарнага факультэта БДУ. Крыніцай, якая папаўняе кашалёк студэнткі, стаў выраб з пластыку (маса, якая нечым нагадвае пластылін) завушніц, бранзалецікаў ды рознай іншай дзявочай радасці. Упрыгажэнні, якія зроблены ў выглядзе торцікаў, пірожных, шакаладак ці талерак з садавіной, не купіш на бліжэйшым рынку. Тут усё ў адзінкавым экзэмпляры.

Заказаць завушніцы ў сярэднім каштуе 20-25 тысяч рублёў. Іншыя ўпрыгажэнні могуць абысціся троху даражэй. Кола кліентаў ужо не абмяжоўваецца сябрамі і сяброўкамі: Насця стварыла суполку ў сацыяльнай сетцы, праз яе можна замовіць сабе любую сімпатычную хэндмэйд біжутэрыю. Многія з тых, хто аднойчы набыў аўтарскую біжутэрыю, пасля з задавальненнем купляюць і іншыя Насціны работы.

Зручнасць такога спосабу крыху пабагацець у тым, што час для заняткаў творчасцю можна выбіраць самастойна, ніякага графіка не прадугледжана. Цікаўлюся, ці даводзіцца ўсё ж выбіраць паміж вучобай і хэндмэйдам:

— Калі я ведаю, што ў бліжэйшыя дні не будзе ніякіх сур'ёзных кантрольных, магу займацца творчасцю. Калі мне хочацца стварыць нешта, я ўсё роўна знайду для гэтага час. Натхненне ніяк нельга дазволіць сабе згубіць. Я разумею, што хэндмэйд для мяне — у першую чаргу захапленне, не важна, колькі грошай яно прыносіць. Але тым не менш матэрыялы, якія я набыла для работы, акупіліся літаральна праз некалькі месяцаў.

ВУЧЫЦЬ ТАМУ, ШТО ВЕДАЕШ САМ

Алена Зубік падпрацоўвае рэпетытарам па французскай мове. Дзяўчына цяпер вучыцца на чацвёртым курсе Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, дадатковы заробак пачала шукаць з кастрычніка мінулага года. Пяцікласніка Вову перадала Алене «ў спадчыну» суседка па пакоі.

— Працую я раз на тыдзень, па чацвяргах, гадзін у 6 вечара. Чацвер у нас ва ўніверсітэце — дзень для самападрыхтоўкі, таму гэта яшчэ і ідэальны дзень для падпрацоўкі. Увогуле, занятак доўжыцца адну гадзіну, але звычайна я праводжу з вучнем больш часу. Мы з Вовам пасябравалі. Ён пасля заняткаў расказвае мне пра свае справы ў школе і адносіны з сябрамі. Але шмат часу ў мяне забірае падрыхтоўка да занятку, яго планаванне. Наймаючы рэпетытара, бацькі чакаюць хуткіх рэзультатаў, таму прыходзіцца неяк выкручвацца. Плацяць мне за занятак 40 тысяч рублёў. Сума хоць і не вельмі вялікая, але для студэнта даволі адчувальная. На абеды ў сталоўцы хапае — ужо добра.

ЗАРАБЛЯЦЬ НА ПРЫГАЖОСЦІ

Напэўна, ніхто не будзе аспрэчваць, што ў студэнцкіх інтэрнатах жыве велізарная колькасць прыгажунь. А гэта значыць, што ў «арэале» іх існавання небывалым попытам павінны карыстацца любыя касметычныя сродкі. Студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ Анжэла Сафронава некаторы час папаўняла свой бюджэт тым, што прадавала касметыку. Кошты былі нашмат ніжэйшымі, чым у краме, бо не было нацэнак за арэнду і г.д, таму пакупнікі знаходзіліся паспяхова. Часу такая падпрацоўка асабліва не аднімала: пакуль дзяўчына вучылася, касметыка спакойна ляжала ў яе пакоі, вечарам сяброўкі-суседкі маглі прыйсці і выбраць сабе памаду, пудру ці туш па прымальным кошце.

Кола кліентаў расло як снежны ком: вядома, «сарафаннае радыё» — найлепшая рэклама.

Даход Анжэла атрымлівала ў выглядзе працэнта ад усёй прададзенай касметыкі.

— Падпрацоўка гэтая не была асабліва значным унёскам у мой матэрыяльны дабрабыт, бо вучуся на платным, стыпендыі не маю, да таго ж я з інтэрната пасля на кватэру пераехала. Але сам факт наяўнасці нейкіх самастойных грошай мне быў вельмі прыемны.

КАБ ХАПАЛА НА «КЕЛЬВІН КЛЯЙН»

Калі ўдаецца знайсці працу па спецыяльнасці, гэта двайны выйгрыш: ты і грошы атрымліваеш, і расцеш як прафесіянал, бо практыка — гэта часам лепей за ўсялякі ўніверсітэт. Мікалай Вашкевіч, студэнт факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР, працуе якраз па спецыяльнасці, праграмістам. Каб сумяшчаць працу і вучобу, даводзіцца вытрымліваць досыць насычаны графік:

— Працаваць студэнты нашага факультэта пачынаюць недзе курса з другога. Цяпер, калі я на чацвёртым, мой дзень выглядае прыкладна так: прачынаюся ў 9.30, іду на пары ці на працу — гэта залежыць ад таго, наколькі заняткі ў гэты дзень важныя і карысныя. На мой погляд, калі пасярод дня ёсць пары, якія прапускаць нельга, зрываюся з працы і еду ва ўніверсітэт. Выхадныя часта прысвячаю вучобе, на яе ж таксама «забіваць» нельга.

Цікаўлюся, у чым сабе не адмаўляюць працуючыя студэнты-праграмісты:

— У пачатку заробак пачынаючага праграміста складае 300—400 доларaў за 40 гадзін працы ў тыдзень. Так як студэнты часам поўны тыдзень адпрацоўваць не паспяваюць, атрымліваецца недзе 200—250 доларaў. Я не адмаўляю сабе ў добрым харчаванні, не шкадую грошай на родных і блізкіх, адзенне таксама купляю, але ў меру. Я магу хадзіць і не ў «Кельвін Кляйн», як большасць праграмістаў *(смяецца)*.

«НАДРУКАВАЦЬ» ГРОШЫ

Калі палічыць, колькі на працягу семестра кожны студэнт, які не мае ўласнага прынтара, выдаткоўвае на раздрукоўку курсавых, рэфератаў і розных іншых патрэбных паперак, выходзіць значная сума. Віталь Карпіцкі збіраецца стаць перакладчыкам з англійскай і французскай, вучыцца на 3 курсе аднаго са сталічных універсітэтаў, а пакуль цягнецца нялёгкі вучэбны шлях да дыплома, хлопец рэалізуе свае прадпрымальніцкія здольнасці: прапануе паслугі па раздрукоўцы.

— Ну вы самі падумайце: ва ўніверсітэце ці недзе ў горадзе раздрукаваная старонка каштуе ў сярэднім 200 рублёў. Але да капіравальнага цэнтра трэба яшчэ дайсці, ва ўніверсітэцкім пункце раздрукоўкі — адстаяць чаргу, а да мяне можа вечарам пастукацца кожны жыхар інтэрната, і нават «накінутыя» 50 рублёў нікога не пужаюць.

Выдаткі ў гэтай справе таксама ёсць, бо трэба пастаянна запраўляць катрыджы ў прынтары, набываць паперу і г.д.

— Колькі заробку атрымліваю, неяк ленаваўся лічыць. Але давай возьмем прыкладна. Напрыканцы семестра толькі на маім курсе адзін студэнт павінен быў здаць чатыры рэфераты па 10-15 старонак, курсавую (каля 30), а таксама розныя матэрыялы, якія патрэбны на семінары). Атрымліваецца, што адзін студэнт пакіне ў мяне прыкладна 18 тысяч рублёў. А народу ж у інтэрнаце шмат. Нейкім значным даходам гэта назваць нельга, але і асаблівых сіл і часу гэта не патрабуе.

І ПРАЦАВАЦЬ, І АДПАЧЫВАЦЬ

Улічыўшы ў сваім бюджэце такія пункты, як ежа-адзенне-праезд, забаўкі рознага кшталту — клубы, кіно ці тэатр — можа стацца так, што грошай застанецца зусім няшмат. Некаторыя студэнты, як, напрыклад, Ірына Мікуліч, студэнтка архітэктурнага факультэта БНТУ, такі пункт расходаў — на адпачынак — са свайго бюджэту выкінулі менавіта дзякуючы падпрацоўцы.

— Здарылася так, што мне знаёмыя прапанавалі папрацаваць прамоўтарам у клубе. Маўляў, ведаем твой бесшабашны характар, табе падыдзе. Абавязкі не цяжкія, хоць і нервуешся, калі іх выконваеш: трэба прадаць білеты ў клуб як мага большай колькасці людзей, прыдумваць ідэі вечарынак, шукаць тых, хто будзе на іх выступаць. Галоўная выгада — не заробак (часам можаш атрымаць дзвесце тысяч за адзін вечар працы). Проста хочацца цікава адпачываць, а атмасфера клуба мне вельмі падабаецца, да таго ж я хаджу туды бясплатна і магу пазнаёміцца з вялікай колькасцю самых розных людзей.

Як прызнаецца Ірына, на вучобу яе праца не асабліва ўплывае. Толькі калі ўжо ну вельмі спаць хочацца ад працы па начах, на заняткі раз на некалькі месяцаў можна і не пайсці.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

СТУДЭНЦКІ ПРАФКАМ — РУКУ ПАДАМ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

За тры хвіліны, дадзеныя для самапрэзентацыі, канкурсантам трэба было даказаць журы, што «старшыня прафкама» — гучыць ганарова! Гэтае заданне ацэньвалася па 10-бальнай шкале, аднак, нягледзячы на акрэсленыя рамкі, журы было надзвычай шчодрым на адзнакі, таму не шкадавала выстаўляць за самыя яркія выступленні канкурсантаў нават 11 балаў.

Інтэлектуальныя спаборніцтвы ў фінале ўяўлялі сабой экспрэс-тэст з 20 пытанняў, для адказу на якія адных толькі тэарэтычных ведаў было недастаткова. Таму ўсім давялося мабілізоўваць, акрамя тэорыі, і свае практычныя навыкі. Затым ўвазе прысутных былі прадстаўлены відэафрагменты прафсаюзных урокаў, якія пераканалі абсалютна ўсіх у тым, што конкурс выявіў найбольш ініцыятыўных, творчых і таленавітых прафсаюзных лідараў. Да таго ж у выступленнях канкурсантаў прагучаў і шэраг вострых пытанняў, пастаўленых перад выбарнымі прафсаюзнымі органамі і сацыяльным партнёрам.

— Гэта толькі звонку прафсаюзны ўрок можа паказацца нейкім прафсаюзным бюракратызмам, што зусім не адпавядае рэчаіснасці, — падкрэсліў Раман Дапіра. — Шчыра кажучы, нам становіцца ўсё больш складана працаваць у моладзевым асяроддзі, бо маладыя людзі яшчэ са школы добра ведаюць пра БРСМ, але амаль нічога не ведаюць пра дзейнасць прафсаюзных арганізацый. Таму вельмі шмат залежыць ад таго, у якой форме ім будзе данесена карысная інфармацыя. Напрыклад, прафсаюзны ўрок Іны Жак быў прысвечаны размеркаванню і працаўладкаванню маладых спецыялістаў.

Не менш важным і цікавым для нас было паралельнае правядзенне рэспубліканскага конкурсу на лепшы праект навучэнскай моладзі «Мой прафсаюз», бо мы шукаем сёння нейкія новыя падыходы да студэнцкай аўдыторыі. На студэнцкі актыў нельга нейкім чынам уплываць, можна толькі адчуваць, што ім патрэбна і ісці ім насустрач.

Трэба аддаць належнае: вынікі гэтага конкурсу пацвердзілі, што бачанне многіх праблем, якое ёсць у нас, і бачанне гэтых праблем студэнтамі, калі не ва ўсім, то ў асноўных момантах супадаюць. У фінале сустрэлася 9 праектаў. Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.Сухога прадстаўляла праект «Клуб «Пакаленне Перамогі». Студэнцкі прафсаюз БНТУ — «Праграму сацыяльна-прафесійнага станаўлення моладзі». Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны прадстаўляла ў фінале ажно тры сваіх праекты — «Я цяпер студэнт», «Зрабі правільны выбар» і студэнцкую газету «Юрыкі». А дыплом пераможцы ў намінацыі «Моладзевыя праграмы і праекты» атрымаў праект Аляксея Каваленкі «Зрабі правільны выбар», прысвечаны профілактыцы згубных звычак сярод маладых людзей.

— Нам вельмі важна было знайсці нейкія «фішкі» ў дзейнасці студэнцкіх прафсаюзных арганізацый, каб трансляваць нестандартныя падыходы на ўсю краіну, і мы іх знайшлі, — з задавальненнем адзначыў Раман Дапіра.

Надзея НІКАЛАЕВА.

22 марта 2012 г. состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2011 год и основные направления деятельности общества в 2012 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2011 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2011 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2012 году и первом квартале 2013 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
8. Об утверждении локальных нормативных актов.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Начало регистрации участников собрания: 13.30.

УНП 400022625

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч. Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ. Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А. Кантактны тэлефон: 292 44 12. e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by. Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 30.015. Нумар падпісаны ў 19.30 1.02.2012 г.

Ёсць пытанне

ЯК СТАЦЬ фотажурналістам?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ці праўда, што ў Беларусі будуць рыхтаваць дыпламаваных фотажурналістаў? Падкажыце, калі ласка, ці любы ахвотны зможа навучацца прафесійнай фатаграфіі, або для гэтага абавязкова мець за плячыма дыплом журфака?

Арцём ГЕРМАНЕНКА, *г.Гродна.*

ПАДРЫХТОЎКУ фотажурналістаў з уручэннем ім пасля заканчэння навучання дыпломаў дзяржаўнага ўзору распачынае ў 2012 годзе факультэт перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі Інстытута журналістыкі Белдзяржуніверсітэта.

Адкрыццё новай спецыяльнасці стала вынікам супрацоўніцтва мінскага Цэнтра фатаграфіі і Інстытута журналістыкі БДУ. Перш чым новая спецыяльнасць і тыпавы вучэбны план атрымалі ўхваленне Міністэрства адукацыі, спецыялісты Цэнтра фатаграфіі і Інстытута журналістыкі распрацавалі характарыстыку прафесіі, якая была занатавана ў Рэестры пасадаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь. Такім чынам, упершыню фотажурналістыка ўвайшла ў пералік спецыяльнасцяў вышэйшай школы.

Вучэбная праграма распрацоўвалася з улікам сусветных тэндэнцый у фотажурналістыцы. Яна ўключае вывучэнне тэхнікі і тэхналогіі фатаграфіі, навучанне фотаздымцы, падрыхтоўку тэкстаў да фотапублікацый, фотарэдагаванне і праектаванне фатаграфічнага кантэнту ў адпаведнасці з канцэпцыяй і камунікатыўнымі мэтамі выданняў, мову і стыль сродкаў масавай інфармацыі, візуальную журналістыку і аўтарскае права ў фотажурналістыцы. Куратар вучэбнай праграмы — фатограф і дырэктар мінскага Цэнтра фатаграфіі Аляксей Шынкарэнка. Выніковай работай навучэнцаў стане персанальны фатаграфічны праект.

Навучанне будзе ажыццяўляцца на платнай аснове (вячэрняя і завочная формы). Тэрмін навучання на вячэрняй форме складае 17,5 месяца, на завочнай — 21 месяц (4 сесіі). Навучацца фотажурналістыцы змогуць як асобы, якія ўжо маюць вышэйшую адукацыю, так і студэнты дзённай формы навучання двух апошніх курсаў ВНУ, а таксама магістранты. Прыём дакументаў ад ахвотных паступіць на вячэрнюю форму навучання ўжо завершаны, а на завочную форму навучання дакументы будуць прымацца да 30 красавіка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Вера КАРЭТНІКАВА:

«Слухаю ўнутраны голас... І МУЖА!»



Вера заходзіць у кавярню разам з мужам. Гледзячы на тое, як яны закахана пераглядваюцца і па-змоўніцку падміргваюць адзін аднаму, нізашто не паверыш у міф аб праслаўтым штампе ў пашпарце, які ставіць крыж на рамантычных адносінах.

Спявачка і жонка, паспяваючы ўсміхацца і мужу, і мне, распавяла пра новы этап у сямейным і творчым жыцці.

— Вера, што з'яўляецца для вас самым цікавым у працы на гэты момант?

— Зараз я аддаю ў ратацыю свой самы галоўны хіт — даволі рокавую песню «Не рыжая». Гэта будзе цікава і небанальна: адмыслова для гэтай кампазіцыі мы з фатографам зрабілі вельмі яркую і, магчыма, правакацыйную фотасесію. Акрамя таго, у мяне цяпер велізарны творчы запал, сама пішу музыку і тэксты для сваіх песень у жанры поп-рок. Я выходжу на іншы ўзровень. Хачу, каб усё, чым я займаюся, было напоўнена ўнутраным аптымізмам! Гэта не бязмэтны зарабак грошай, а рэалізацыя на самой справе крэатыўных праектаў!

— А замужжа не замінае самарэалізацыі?

— Не, мне лёгка быць жонкай. Побач са мной разумны чалавек. Сапраўдны мужчына, які мяне падтрымлівае, абараняе, адкрывае вочы на розныя рэчы. Побач з ім можна ўсё жыццё заставацца прыгожай, яркай і займацца любімай справай! Але мне самой у радасць праводзіць са сваім мужам як мага больш часу. А яшчэ я вельмі хачу дзяцей: і хлопчыка, і дзяўчынку!

— Як бы вы іх выхоўвалі?

— З самага дзяцінства я прывівала б ім жыццёвую мудрасць, заўсёды знаходзіла час для таго, каб пагаварыць з імі, адказаць на пытанні, падзяліцца сваім вопытам, раскрыць іх таленты. Ну і, безумоўна, любіць, песціць часам, як без гэтага!

— Як вам здаецца, успрыманне вас людзьмі моцна адрозніваецца ад таго, якая вы насамрэч?

— Яшчэ як! Увесь час чую, што я напышлівая і самаўлюбёная, паводжу сябе задзірліва. Тыя, хто ведаюць мяне добра, могуць пацвердзіць, што гэта не так. Са мной лёгка і камфортна, я вельмі адкрыты чалавек. Многіх падпускаю вельмі блізка, залішне давяраю людзям, пра што часта шкадую. Праўда, зараз побач са мной ёсць чалавек, які засцерагае мяне ад непаслядоўных рашэнняў. Менавіта таму я слухаю свой унутраны голас... і мужа!

— Замужжа змяніла вас?

— Само знаёмства з гэтым чалавекам сфарміравала мой характар па-новаму, паўплывала на маю асобу! Так што да моманту замужжа мы ўжо дапаўнялі адзін аднаго, як часцінкі пластыліну. Гэта не той выпадак, калі супрацьлегласці прыцягваюцца. Мы падобныя настолькі, што можам не размаўляць, але разумець адно аднаго без слоў. Ездзім на машынах з адналькавай хуткасцю, купляем аднолькавыя курткі, любім адны і тыя ж фільмы. Мы знаходкі! Але толькі адно для аднаго.

— Можа, перанялі якое-небудзь захапленне мужа?

— Так, мне стаў вельмі падабацца більярд! Але гэта дробязь, у параўнанні з маёй любоўю да выпечкі! Я магу гадзінамі завісаць у інтэрнэце, шукаючы цікавыя рэцэпты, а пасля ўвасабляць іх на кухні! Гэта заўсёды вельмі цікавы і творчы працэс. Абяцаю, што калі-небудзь запрашу вас у сваю кавярню на торцік па эксклюзіўным рэцэпце!

— Якой бачыце сябе гадоў праз дзесяць, яркай артысткай ці прыкладнай жонкай?

— Артысткай, жонкай і мамай з вялікай літары! Я вельмі пасталела за апошні год. Тое, што было да гэтага, лёгка і павярхоўна. Цяпер — усё па-сапраўднаму!

Паліна КУЗЬМІЦКАЯ.

Клуб юнкараў

ЗАСЫНАЮ З ПАДРУЧНІКАМ НА НОСЕ

Што і казаць, вышэйшая адукацыя сёння запатрабавана ў грамадстве. Ды і без яе на многія спецыяльнасці не патрапіш. Так, мае сябры, якія сёлета заканчваюць школу, выбіраюць прафесіі эканаміста, журналіста, інжынера, ваеннага, менеджара, банкаўскага работніка, архітэктара, дызайнера, міжнароднika і іншыя, якія высока аплачваюцца.

Зразумела, каб паступіць на такія спецыяльнасці, патрэбна добрая падрыхтоўка. А дзе яе атрымаць? Школьная праграма абмежаваная па ўзроўні матэрыялу па прадметах, якія трэба здаваць на ЦТ, таму школа не мае магчымасці добра падрыхтаваць абітурыента да паступлення на «прэстыжныя» спецыяльнасці. Як кажуць настаўнікі, яны не абавязаны гэта рабіць. Факультатыўны курс таксама мала дадае ведаў. А падручнікі 11 класа закранаюць пытанні праграмы і толькі.

Возьмем падручнік па беларускай мове. Вельмі добра асветлены тэмы правапісу галосных і зычных, а часціны мовы падаюцца павярхоўна. Таму па гэтым прадмеце, як і па ўсіх астатніх, трэба дапаўняць свае веды па розных дадатковых даведніках. Вядома, гэта можна рабіць і самастойна (але гэта вельмі складана, таму што часу катастрафічна не хапае) ці з дапамогай кваліфікаванага настаўніка-рэпетытара. І паверце, праца адзін на адзін з рэпетытарам, дае куды больш, чым школьныя заняткі ў класе з 20 чалавек. У гэтым я пераканалася на ўласным вопыце.

Дзякуючы заняткам з рэпетытарам, вы і новыя веды набываеце, і паляпшаеце свае адзнакі па пэўных прадметах у школе.

Цяпер мала хто з вучняў (не мае значэння: з горада ён ці з вёскі) абыходзіцца без рэпетытара. І, мусіць, гэта самы надзейны варыянт падрыхтоўкі. Я думаю, знайсці рэпетытара ў любым населеным пункце можна, бо амаль усе яны настаўнікі школ, гімназій, ліцэяў. Некаторыя маюць веданне ездзяць на заняткі і да рэпетытараў — выкладчыкаў ВНУ. Пра тое, што ў такіх занятках ёсць сэнс, можна меркаваць хаця б па тым, што ўсе леташнія выпускнікі нашай школы, якія займаліся з персанальнымі настаўнікамі, паступілі ў абраныя навучальныя ўстановы. На мой погляд, як бы недарэчна гэта не гучала, калі аддаеш за сваю падрыхтоўку бацькоўскія грошы, больш адказна ставішся да заняткаў. Хоць трапляюцца і такія школьнікі, якім усё роўна. Часам яны трацяць грошы на нешта іншае, а дома кажуць, што былі ў рэпетытара. Я не раз была сведкай такіх выпадкаў.

Паўтарагадзінныя заняткі ў нашым горадзе каштуюць ад 50000 беларускіх рублёў. А калі падлічыць грошы за заняткі па трох прадметах, то ў месяц трэба 600000 як мінімум. Не кожнай сям'і ў правінцыі гэтая сума пад сілу. А трэба яшчэ і на абеды ў сталовай — 100000, плюс мы здаём па 100000 на выпускны баль. Атрымліваецца 800000 рублёў у месяц абыходзіцца сярэднестатыстычны правінцыйны выпускнік. Каб здабыць грошы не толькі на жыццё, але і на навуку дзяцей, многім бацькам даводзіцца працаваць на некалькіх работах.

Хацелася б звярнуць увагу на адну праблему. Большасць адзінаццацікласнікаў цікавіцца толькі прадметамі, па якіх будзе здаваць ЦТ. Але для выпускнікоў важна і тое, якім будзе сярэдні бал атэстата. Кожнаму хочацца мець бал, блізкі да 10, але, каб яго зарабіць, трэба пісаць рэфераты, эсэ, навукова-даследчыя працы, актыўнічаць на ўроках і шмат чаго іншага.

У няспыннай падрыхтоўцы да ЦТ і набыванні новых ведаў будучыя студэнты губляюць сваё здароўе, адчуваюць пастаянную стомленасць. Напрыклад, я з 8 да 14 гадзін — на занятках у школе. З 15 да 17 тры разы на тыдзень — у рэпетытара, пасля саджуся за хатняе заданне па школьных прадметах і тых, што даў рэпетытар — і займаюся да 12 гадзін ночы. Засынаю з падручнікам на носе. І так жывуць многія мае аднагодкі. У выніку падрываецца наша здароўе. У апошні дзень другой чвэрці ў мяне моцна забалела галава. Аказалася, у мяне ўпаў крывяны ціск, я амаль губляла прытомнасць. Пры абследаванні ўрач паставіў мне дыягназ — хранічная стомленасць. Ён параіў знізіць дзённыя нагрузкі, больш адпачываць. А як гэта зрабіць? Выходзіць, што трэба менш удзельнічаць у школьных мерапрыемствах, а мо і прапускаць заняткі, каб выспацца.

Яшчэ адна з самых «балючых» праблем адзінаццацікласнікаў — гэта недахоп вольнага часу. Каб вы толькі ведалі, як хочацца на свежае паветра, з сябрамі на каток, ці проста ў кавярню. Але — калі?

Як жывецца абітурыенту? Высновы рабіце самі...

Марына ЖАБІК, вучаніца 11 класа сярэдняй школы №1 г. Ляхавічы.

ПРА ГЭТА ГАВОРАЦЬ

У Паставах

ТЫДЗЕНЬ ЦВЯРОЗАСЦІ РАЁННАГА МАШТАБУ

У Пастаўскім раёне з 30 студзеня па 5 лютага праводзіцца акцыя «Тыдзень цвярозасці».

Па ініцыятыве Пастаўскага раённага выканаўчага камітэта і рымска-каталіцкіх рэлігійных арганізацый у раён з розных рэгіёнаў рэспублікі запрошаны спецыялісты па працы з залежнымі ад алкаголю. У райвыканкаме адбылося пасяджэнне «круглага стала», у якім прынялі ўдзел раённыя службы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый раёна і спецыялісты з Гродна, Слоніма, Мінска і іншых гарадоў. Абмяркоўваліся праблемы прафілактыкі алкагалізму і арганізацыі антыалкагольнай прапаганды. На працягу тыдня плануецца правесці шэраг сустрэч у працоўных калектывах і па месцы жыхарства з сацыяльна небяспечнымі сем'ямі, асобамі, схільнымі да злоўжывання алкаголем. У канцы тыдня будуць падведзены вынікі сустрэч.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У Клічаве

ШВЕЙНАЯ ЭКСПАНСІЯ

У Клічаве адкрылася новае швейнае прадпрыемства ААТ «Славянка». Мясцовыя ўлады аддалі бабруйскаму прадпрыемству памяшканне, якое пуставала. Там усталявалі сучасную нямецкую лінію, дзе мясцовыя жанчыны будуць шыць штаны: спачатку дзіцячыя, а потым асартымент пашырыцца.

У раённым цэнтры ёсць праблема з працоўнымі месцамі менавіта для жанчын, а на новым прадпрыемстве створана 40 такіх месцаў, з перспектывай павелічэння яшчэ на два дзясяткі. Гэта ўжо трэці філіял «Славянкі» ў малых гарадах Магілёўскай вобласці. Кіраўніцтва рэгіёна падзякавала за праект, які выгадны прадпрыемству, але найбольш — людзям, якім патрэбны праца і заробак.

Ілона ІВАНОВА.

У Магілёве

ДУХОЎНАСЦЬ СУПРАЦЬ АВАРЫЙНАСЦІ

Праваслаўныя святары ў Магілёве выйшлі на дарогу разам з інспектарамі ДАІ.

Памінальны малебен па ахвярах транспартных здарэнняў адслужылі на самых аварыйна небяспечных участках дарог абласнога цэнтра. Прынамсі, настаяцель Крыжа ўздвіжанскай царквы протаіерэй Сергій пабываў на пешаходным пераходзе на вуліцы Крупскай у Магілёве, дзе ўжо сёлета сур'ёзна пацярпеў пешаход і загінула 9-гадовая дзяўчынка. Трагедыя адбылася 9 студзеня, калі ўвечары малодшая школьніца вярталася са спартыўных заняткаў дадому. Яна перабягала дарогу на чырвонае святло, была збіта адным аўтамабілем і трапіла пад колы другога. У памяць аб дзяўчынцы, а таксама для таго, каб асвяціць гэтае месца, якое людзі сталі называць нядобрым, святар правёў набажэнства. Гэта ўжо далёка не першы выпадак, калі духавенства разам з ДАІ звяртае ўвагу на аварыйныя ўчасткі дарог, дзе церпяць людзі.

Ілона ІВАНОВА.

У Гомелі

ПОМСТА ПА-НІГЕРЫЙСКУ

Скандал паміж дзвюма грамадзянкамі Нігерыі, якія вучацца ў Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, дайшоў да панажоўшчыны. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, 19-гадовая дзяўчына з афрыканскім тэмпераментам ударыла нажом у жывот сваю 18-гадовую суайчынніцу, з якой жыве ў адным пакоі інтэрната. З колата-рэзанай ранай жывата апошняя дастаўлена ў хірургічнае аддзяленне Гомельскай бальніцы хуткай меддапамогі. Прычынай спрэчкі, па адной з версій, мог стаць нігерыйскі хлопец, які жыве паверхам вышэй і быццам бы сустракаўся з абедзвюма дзяўчынамі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Без бар'еraў

СТРАХОЎШЧЫКІ БАЯЦЦА ІНВАЛІДАЎ?

ІНВАЛІДАМ часам даводзіцца пераадольваць такія бар'еры, якія нам, здаровым, і не сніліся. Напрыклад, крыху больш за 10 гадоў таму выехаць за мяжу ім было практычна немагчыма. Цяпер сітуацыя палепшылася, але ненашмат. «А ў чым справа?» — спытаецеся вы. У тым, што жыццё без бар'еraў — гэта не толькі рамкі безбар'ернага асяроддзя ў горадзе, як стэрэатыпна думаюць многія. Калі мы гаворым пра даступнасць, мы гаворым пра даступнасць усіх сфер жыцця для людзей з інваліднасцю. Напрыклад, страхавання. Здаровыя людзі часта і не падазраюць, што большасць беларускіх страхавых кампаній не прадастаўляюць людзям з інваліднасцю 1-й і 2-й груп страхаванне ад няшчасных выпадкаў і пры выездзе за мяжу.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ці нармальнае такое становішча спраў? Гэтаму пытанню быў прысвечаны **«круглы стол» на тэму «Даступнасць паслуг страхавання для людзей з інваліднасцю»,** які арганізавалі міжнародны сацыяльна-эканамічны фонд «Ідэя» і Офіс па правах людзей з інваліднасцю.

Каб інваліды не засталіся «за бортам»

Сёння страхаванне ўсё больш укараняецца ў нашым грамадстве, і, як лічыць **каардынатар Офіса па правах людзей з інваліднасцю Сяргей ДРАЗДОЎСКІ**, важна, каб інваліды пры гэтым не засталіся «за бортам». Кампаніям, на яго погляд, сёння час задумацца над тым, каб даць поўны пакет страхавых паслуг людзям з інваліднасцю і пагадзіцца з крыху больш высокімі рызыкамі ў імя сацыяльнай адказнасці.

«Калі мы гаворым аб страхаванні здароўя, важна разумець, што стан здароўя чалавека і інваліднасць не маюць прамой сувязі, — сцвярджае Сяргей Драздоўскі. — Інваліднасць — гэта праблема ўзаемадзеяння чалавека з асяроддзем, а не праблема чалавека і яго здароўя. Інваліднасць вызначае канчатковы для медыцыны пункт, пасля якога здароўе можа пагаршацца далей, а можа і не пагаршацца». Таму, на думку С. Драздоўскага, тое ці іншае захворванне можа стаць сферай рызыкі для страхавых кампаній, але сама па сабе інваліднасць такой рызыкай быць не можа.

Мэта работы страхоўшчыкаў — атрыманне прыбытку

А што ж страхоўшчыкі? Якая іх пазіцыя? «Страхавыя паслугі падпарадкоўваюцца пэўным патрабаванням, і любыя абмежаванні маюць пад сабой падставы — матэматычныя падлікі і ўзгадненні. Абмежаванні, створаныя для людзей з інваліднасцю, тлумачацца павышанай страхавой рызыкай гэтага пласта дагавораў. А страхавая арганізацыя, як і любая, якая мае за мэту павелічэнне прыбытку, імкнецца пазбегнуць страт: хтосьці ўводзіць больш жорсткія крытэрыі, хтосьці, у тым ліку і «Прамтрансінвест», інвалідаў 1-й і 2-й групы не страхуе», — тлумачыць **вядучы спецыяліст ЗАСТ «Прамтрансінвест» Сяргей АНДРЫЕВІЧ**. Аднак пры гэтым спецыяліст падкрэсліў, што гэта менавіта абмежаванні на страхаванне ад няшчасных выпадкаў і пры выездзе за мяжу, і што існуе яшчэ мноства відаў страхавання: аўтамабіля, кватэры, іншай маёмасці, — дзе няма ніякіх абмежаванняў для людзей з інваліднасцю.

Дзяржаўная кампанія «Белдзяржстрах» усе страхавыя паслугі ў рамках асабістага страхавання людзям з інваліднасцю прадастаўляе без якіх-небудзь абмежаванняў. Хоць каля 10 гадоў таму і ў «Белдзяржстраха» былі абмежаванні па страхаванні людзей з 1-й групай інваліднасці, і на страхаванне яны не прымаліся. «Мы сапраўды не заключалі дагаворы з інвалідамі і не прадавалі полісы па гэтых відах. Аднак людзі з інваліднасцю ўсё роўна звярталіся, бо без страхавога поліса чалавек не можа атрымаць тую ж шэнгенскую візу, што можна разглядаць як пэўную дыскрымінацыю, — заявіла **намеснік начальніка ўпраўлення медыцынскага страхавання Белдзяржстраха Людміла КУЛАК**. — І наша арганізацыя пайшла на тое, каб адмяніць усе абмежаванні. Сёння інвалідам мы не адмаўляем ні ў якіх паслугах — толькі інваліды 1-й групы і людзі, якія атрымалі інваліднасць з-за хваробы апорна-рухальнага апарата, плацяць больш высокі страхавы ўзнос». Тым не менш, людзей з інваліднасцю, па словах прадстаўніка Белдзяржстраха, сярод іх кліентаў вельмі мала — магчыма, самі інваліды не ведаюць аб тых страхавых паслугах, якія для іх даступныя. Але, як адзначыла Людміла Кулак, людзі з інваліднасцю як кліенты страхавых кампаній значна больш адказна падыходзяць да выканання ўмоў страхавання, чым іншыя кліенты.

Мінфін: страхавыя арганізацыі маюць магчымасць улічваць павышаныя рызыкі праз страхавы тарыф

Намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення страхавога нагляду Міністэрства фінансаў Беларусі Станіслаў САЕВІЧ адзначае, што ў нашай краіне ёсць кампаніі, якія прапаноўваюць страхавыя паслугі людзям з інваліднасцю ў поўным аб'ёме — гэта дзяржаўная кампанія «Белдзяржстрах», а таксама шэраг кампаній у недзяржаўным сектары.

«Аднак тут мы сустракаемся з выбарачным падыходам і нежаданнем некаторых кампаній страхаваць людзей з інваліднасцю з прычыны неспрыяльнай страхавой гісторыі і ацэнкі рызык. Прамыя ўказанні страхавым кампаніям па рашэнні гэтай задачы мы, мабыць, даваць не маем права, аднак я згодны з тым, што інваліднасць не роўная дрэннаму стану здароўя, і менавіта стан здароўя ў гэтым выпадку павінен вызначаць рызыкі», — лічыць Станіслаў Саевіч. Разам з тым, на яго думку, страхавыя арганізацыі маюць магчымасць улічваць павышаныя рызыкі пры прадастаўленні паслуг гэтай катэгорыі асоб, напрыклад, праз страхавы тарыф. Такім чынам, яны могуць забяспечыць абарону сваіх эканамічных інтарэсаў і даць такім людзям роўныя правы на прадастаўленне паслуг. Але на першым месцы павінна быць усё-такі сацыяльная рэалізацыя грамадзяніна, яго эканамічная самастойнасць, упэўнены прадстаўнік Мінфіна. Калі гэты бок пытання будзе вырашаны, тады і даступнасць страхавых паслуг для асоб з інваліднасцю будзе больш высокай. Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення страхавога нагляду Мінфіна паабяцаў: «Па выніках «круглага стала» мы правядзём кансультацыі ў рамках страхавога нагляду Мінфіна, і наша пазіцыя будзе выказана, хутчэй за ўсё, на адрас Беларускай асацыяцыі страхавальнікаў. І ўжо праз БАС гэтая работа будзе праводзіцца далей».

* * *

У сваю чаргу, **старшыня праўлення Міжнароднага сацыяльна-эканамічнага фонду «Ідэя» Павел ВЕШТАРТ** таксама заклікаў беларускі страхавы бізнэс да сацыяльнай адказнасці. «Важна разумець, што людзі з інваліднасцю як паўнапраўныя члены гэтага грамадства маюць патрэбу ў паслугах страхавання і маюць права карыстацца імі нароўні з усімі — у поўным аб'ёме і ў любой страхавой арганізацыі. Працэнт людзей з інваліднасцю, якія звяртаюцца па страхаванне ад няшчасных выпадкаў і пры выездзе за мяжу, невялікі — дык давайце дадзім ім магчымасць прыйсці ў любую страхавую кампанію і атрымаць неабходныя паслугі. Давайце пераходзіць ад сацыяльнай адказнасці на словах да сацыяльнай адказнасці ў дзеяннях», — заключаў Павел Вештарт.

Святлана БУСЬКО.

Міжнародны сацыяльна-эканамічны фонд «Ідэя» абтэлефанаваў большасць беларускіх страхавых кампаній з пытаннем: «Ці існуюць у вашай кампаніі абмежаванні па страхаванні прыватных асоб з інваліднасцю, і калі існуюць, то якія?»

У выніку апытання высветлілася, што каля 68% страхавых кампаній не прадастаўляюць страхавыя паслугі пры выездзе за мяжу і ад няшчасных выпадкаў інвалідам 1-й і 2-й груп, а таксама людзям з псіхічнымі і нервовымі захворваннямі, якія знаходзяцца на ўліку ў медыкаў.

Каля 32% апытаных страхавых кампаній прадастаўляюць страхавыя паслугі пры выездзе за мяжу і ад няшчасных выпадкаў людзям з інваліднасцю на агульных падставах (асобна пры ўзнікненні страхавога выпадку абмяркоўваюцца ўмовы выплат, у шэрагу кампаній існуе павышальны каэфіцыент).

Прызы для дысцыплінаваных плацельшчыкаў

У Магілёве прайшоў традыцыйны розыгрыш рэкламнай гульні «Самы дысцыплінаваны плацельшчык жыллёва-камунальных паслуг». У выніку 140 жыхароў Магілёва атрымалі прызавыя сумы ў 70 тысяч рублёў.

Такія розыгрышы Магілёўскі цэнтр гарадскіх інфармацыйных сістэм праводзіць ад 2005 года, каб заахвоціць добрасумленных гараджан, якія год ад году своечасова аплачваюць камунальныя паслугі. У рэкламнай гульні аўтаматычна бяруць удзел тыя, хто не мае бягучай запазычанасці па камунальных і іншых плацяжах. А сёлета гэта — каля 9 тысяч магілёўцаў.

— Гэта наш спосаб сказаць дзякуй самым адказным плацельшчыкам і паказаць прыклад тым, хто спазняецца з платай за кватэры, — сказаў дырэктар прадпрыемства Аляксандр Селязнёў.

Упершыню за гісторыю рэкламнай гульні ўшанавалі самага маладога і самага старэйшага з магілёўскіх плацельшчыкаў: імі сталі 19-гадовая Аляксандра Захар'ева і 94-гадовая Разалія Чарапкова.

Ілона ІВАНОВА.

Хакей. Факт і каментарый

СТАЛІЧНАЕ «ДЫНАМА» ВЫЙШЛА Ў ПЛЭЙ-ОФ КХЛ ЗА ШЭСЦЬ ТУРАЎ ДА КАНЦА ТУРНІРУ

Наша каманда на выездзе абыграла з лікам 4:2 чарапавецкую «Поўначсталь». Перамога гэта каштоўная не толькі тым, што дагэтуль у каманды было некалькі няўдалых гульняў, але і тым, што «Дынама» гарантавала сабе месца ў васьмёрцы наймацнейшых і за шэсць тураў да канца турніру выйшла ў плэй-оф. Зараз дынамаўцы займаюць другое месца ў Заходняй канферэнцыі, маючы 78 ачкоў. Дарэчы, летась каманда таксама змагалася ў плэй-оф, але выхад туды быў не такім упэўненым. Падапечныя Марэка Сікоры зрабілі гэта ў 53-м туры, абыграўшы ўфімскі «Салават Юлаеў».

Матч пракаментаваў галоўны трэнер «зубраў» Марэк Сікора:

— Мы сёння вельмі хацелі выйграць пасля няўдалага матча ў Попрадзе і нават цэлай серыі няўдалых сустрэч, трэба было вярнуцца на пераможную хвалю. Магчыма, з-за гэтага сёння і была некаторая нервознасць. Але ў цэлым сёння ўсё было ўдала. Супернік расслабіўся на паўтары хвіліны пасля гола, і мы гэтым скарысталіся, забіўшы тройчы. А ў заключным перыядзе добра згулялі ў абароне. Выдатна дзейнічаў Андрэй Мезін.

— Але ўсё ж у другім перыядзе вам прыйшлося папсаваць нервы...

— Для мяне гэта быў вырашальны адрэзак сустрэчы. Мы маглі ўпусціць матч. У нас так бывае, я гэта заўважыў: у другой палове другога перыяду мы пачынаем «лятаць», гуляць «без галавы», без абароны, трэці гулец звяна часта не вяртаецца назад...

— Сёння каманда забяспечыла сабе выхад у плэй-оф. У сувязі з гэтым не будзе нейкай расслабленасці?

— У нас напярэдзе складаныя матчы, і трэба гуляць вельмі добра. Справа ў тым, што «Спартак» пакуль не трапляе ў плэй-оф, «Віцязь» страціў усе шанцы. З іншага боку — у масквічоў — беларускі трэнер Андрэй Сідарэнка, а чэхаўцы заўсёды былі небяспечнай камандай. Нам вельмі важна заняць месца як мага вышэй перад плэй-оф. Было б выдатна пачынаць серыю дома.

Але калі «Дынама» і пачне серыю дома, то, як стала вядома, першыя матчы плэй-оф усё роўна не пройдуць на «Мінск-Арэне». У сувязі з правядзеннем юніёрскага чэмпіянату па фігурным катанні «зубрам» давядзецца адправіцца ў Бабруйск.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Страсць да металу

У Магілёве на малочным камбінаце спрабавалі скрасці металічныя трубы. Трое мужчын на тэрыторыі ААТ «Бабулін гладыш» спрабавалі скрасці 9 металічных труб на суму больш за 750 мільёнаў рублёў. Аматараў зарабіць на продажы металу затрымаў нарад міліцыі Кастрычніцкага аддзела Дэпартамента аховы. Усе зладзеі — жыхары Магілёва розных узростаў (33 гады, 43 гады, 50 гадоў). Злачынную кампанію аб'яднала адсутнасць працы і ранейшыя судзімасці.

Ул. інф.

Кантрабандны «Прэм'ер»

Увечары ў Верхнядзвінскім раёне на аўтадарозе Полацк — Верхнядзвінск недалёка ад чыгуначнага прыпынку полацкія памежнікі разам з супрацоўнікамі міліцыі і КДБ канфіскавалі рэкордную колькасць кантрабандных цыгарэт — 67,5 тысячы пачкаў. Усю партыю цыгарэт затрыманыя кантрабандысты — усяго іх было пяць — мелі намер загрузіць у грузавы чыгуначны састаў, які накіроўваўся з Полацка ў латвійскі Даўгаўпілс. Дарэчы, сярод затрыманых — машыніст лакаматыўнага дэпо. Кошт канфіскаваных кантрабандных цыгарэт перавышае 195 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ОАО «Брестский КСМ» приобретает на баланс Общества простые (обыкновенные) акции, выпущенные ОАО «Брестский КСМ», в количестве до 1800 штук по цене 300 000 рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами с целью дальнейшей продажи инвестору. Срок, в течение которого акционеры должны предоставить предложение о продаже принадлежащих им акций, — с 06.02.2012 г. по 15.02.2012 г. по адресу: г. Брест, ул. Московская, 360.

Выкуп простых (обыкновенных) акций производится в период с 16.02.2012 г. по 16.03.2012 г. с оформлением сделок купли-продажи акций пропорционально поданным заявлениям.

Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций: г. Брест, ул. Московская, 360.

Сроки, форма и порядок оплаты — перечислением денежных средств на счет продавца не позднее 30 банковских дней с момента заключения сделки.

Конт. тел. 8 0162 95 02 03.

УНП 200295903

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ПРОМЭЛЕКТРОМОНТАЖ»!
05 марта 2012 г. состоится очередное Общее собрание акционеров

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Утверждение годового отчета директора, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках ОАО «Промэлектромонтаж».
2. Рассмотрение аудиторского заключения, утверждение заключения Ревизионной комиссии о деятельности Общества за 2011 год.
3. О распределении прибыли и убытков ОАО «Промэлектромонтаж».
4. Об избрании членов Совета директоров, членов Ревизионной комиссии ОАО «Промэлектромонтаж».
5. Определение размера материального вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии ОАО «Промэлектромонтаж».

Местонахождение ОАО «Промэлектромонтаж»: г. Минск, ул. Аранская, 13.
Место проведения собрания: г. Минск, ул. Аранская, 13, к. 9 (второй этаж).
Начало собрания: 09 часов 30 минут.
Время регистрации участников – в день проведения собрания с 09 часов 00 минут до 09 часов 30 минут по адресу: г. Минск, ул. Аранская, 13, к. 10 (второй этаж).
Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров – по паспорту и доверенности.
Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров на 31 января 2012 г.
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 06.02.2012 г. по 05.03.2012 г. (с 9.00 до 17.00) по месту нахождения Общества, а в день проведения собрания – по месту проведения собрания.

Совет директоров ОАО «Промэлектромонтаж»

УНП 100088916

Минский городской центр недвижимости

Извещение о проведении 05 марта 2012 года открытого аукциона по продаже зданий, сооружений, изолированных помещений, передаточных устройств, оборудования и мебели, находящихся в собственности ОАО «Автомагистраль»

Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)	- Здание специализированное складов, хранилищ (склад) общей площадью 236,0 кв.м с инв. номером по ЕГРНИ 130/С-3172; - Здание специализированное складов, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад ГСМ надземный) общей площадью 9,5 кв.м с инв. номером по ЕГРНИ 130/С-3173; - Сооружение специализированное складов, хранилищ (склад ГСМ полуподземный) общей площадью 14,5 кв.м с инв. номером по ЕГРНИ 130/С-3174; - Помещение транспортного назначения (помещения для стоянки автомашин) общей площадью 415,0 кв.м с инв. номером по ЕГРНИ 130/D-4365; - Производственное помещение (столярная мастерская) общей площадью 54,0 кв.м с инв. номером по ЕГРНИ 130/D-4366; - Здание специализированное автомобильного транспорта (бокс для мойки машин) с принадлежностями общей площадью 4,0 кв.м с инв. номером по ЕГРНИ 130/С-3177; - Здание административно-хозяйственное с принадлежностями общей площадью 393,9 кв.м с инв. номером по ЕГРНИ 130/С-4125; - Здание специализированное транспорта (ремонтные мастерские) общей площадью 606,0 кв.м с инв. номером по ЕГРНИ 130/С-4126; - Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад) общей площадью 113,9 кв.м с инв. номером по ЕГРНИ 130/С-39365; - Отопительный котел МИР-60 (инв. номер по бухучету 398); - Молот пневматический (инв. номер по бухучету 71); - Тельфер канатный электрический (инв. номер по бухучету 73); - Тельфер канатный электрический (инв. номер по бухучету 74); - Тельфер канатный электрический (инв. номер по бухучету 76); - Приставка мебельная (2 шт.); - Стеллаж 5825 (1 шт.); - Стол Шанс (2 шт.); - Стол двухтумбовый (3 шт.); - Стол журнальный (1 шт.); - Стол Маэстро (1 шт.); - Стол офисный (1 шт.); - Стол письменный (1 шт.); - Стол письменный (2 шт.); - Стол письменный (1 шт.); - Стол письменный (1 шт.); - Стол письменный (1 шт.); - Стол письменный (2 шт.); - Тумба (1 шт.); - Тумба (1 шт.); - Тумба приставная (2 шт.); - Шкаф (1 шт.); - Шкаф (1 шт.); - Шкаф (1 шт.); - Шкаф для офиса (3 шт.); - Шкаф для бумаг (1 шт.); - Шкаф для одежды (2 шт.); - Шкаф со стеклом (1 шт.); - Шкаф угловой (1 шт.); - Жалюзи вертикальные (31 кв.м).
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер 125487605601000039, площадь – 2,4058 га, назначение – земельный участок для обслуживания производственной базы
Местонахождение продаваемого имущества	Брестская область, Пинский район, Оснежицкий с/с, северо-западнее д. Посеничи
Сведения о продавце	ОАО «Автомагистраль», ул. Кижеватова, д. 8, 220099, г. Минск
Сведения об организаторе аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск
Начальная цена предмета торгов с учетом НДС	2 613 117 260 бел. руб.
Сумма задатка	260 000 000 бел. руб.
Существующие обременения	Аренда

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Автомагистраль», утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает НДС.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Аукцион состоится **05 марта 2012 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 03.02.2012 по 01.03.2012 включительно** в рабочие дни в рабочее время с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (017) 212 50 62.

Извещение о проведении 09.02.2012 повторного аукциона по продаже объектов недвижимого имущества, находящихся на праве собственности ОАО «Лавсанстрой»

Предмет повторного аукциона	Лот № 1	Лот № 2	Лот № 3
	Трехэтажное кирпичное здание склада битумных мастик БАБЗ	Одноэтажное крупнопанельное здание склада лесоматериалов БАБЗ	Трехэтажное каменное здание котельной БАБЗ с подвалом
Место нахождения недвижимого имущества	Могилевская обл., Могилевский р-н, Кадинский с/с, 6	Могилевская обл., Могилевский р-н, Кадинский с/с, 7	Могилевская обл., Могилевский р-н, Кадинский с/с, 5
Начальная цена предмета повторного аукциона без учета НДС, рублей	153 000 000	247 000 000	341 400 000
Сумма задатка, рублей	3 060 000	4 940 000	6 828 000
Продавец недвижимого имущества	Открытое акционерное общество «Лавсанстрой» Контактные телефоны: 8 (0222) 48 42 83, 48 56 17, факс 48 82 68		
Характеристика объектов недвижимого имущества	Общая площадь здания – 224 м². Объем – 1193 куб.м. Фундамент – ж/бетонный, стены – кирпичные, крыша – рулонная совмещенная, полы – бетонные. Год постройки 1977.	Общая площадь здания – 360 м². Объем – 1944 куб.м. Фундамент – ж/бетонный, стены – ж/бетонные панели, крыша – рулонная совмещенная, полы – бетонные. Год постройки 1987.	Общая площадь здания – 560,2 м². Объем – 5419 куб.м. Фундамент – ж/бетонный; стены – крупнопанельные, кирпичные; крыша – рулонная совмещенная; полы – бетонные. Год постройки 1971.
Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества	Площадь земельного участка – 0,3543 га. Кадастровый номер: 724400000001000807.	Площадь земельного участка – 0,0474 га. Кадастровый номер: 724400000001000833.	Площадь земельного участка – 0,1788 га. Кадастровый номер: 724400000001000831

1. Повторный аукцион состоится **«09» февраля 2012 г. в 14.30** по адресу: г. Могилев, б. Непокоренных, 28.
2. Организатор повторного аукциона – Открытое акционерное общество «Лавсанстрой, 212002, г. Могилев, б. Непокоренных, 28, тел.: (8 0222) 48 42 83, 48 56 17.
3. Заявления на участие в повторном аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, б. Непокоренных, 28, юридический сектор, 2-й этаж, тел. (8 0222) 48 56 17.
4. Последний день подачи заявлений на участие в повторном аукционе с прилагаемыми к ним документами – **«08» февраля 2012 г. до 13.00**.
5. Заключительная регистрация участников повторного аукциона «09» февраля 2012 г. с 8.00 до 13.00.
6. Повторный аукцион проводится без условий.
7. Задаток для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения по «08» февраля 2012 г. включительно на текущий (расчетный) счет ОАО «Лавсанстрой» № 3012119248027 в ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 700010300. Назначение платежа – задаток для участия в аукционе.
8. Начальная цена снижена на 20%.
9. Организатор повторного аукциона имеет право снять предмет повторного аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до назначенной даты проведения повторного аукциона, о чем организатором повторного аукциона извещаются участники аукциона.
10. Договор купли-продажи объекта недвижимого имущества заключается с победителем повторного аукциона в течение 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах повторного аукциона.
11. До подписания договора купли-продажи победитель повторного аукциона обязан возместить затраты на организацию и проведение повторного аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.
12. Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством Республики Беларусь порядке:

победителем аукциона, являющимся резидентом Республики Беларусь, – в белорусских рублях;

победителем аукциона, являющимся нерезидентом Республики Беларусь, – в белорусских рублях либо иностранной валюте по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату платежа.

Условия оплаты – разовый платеж.

13. Более подробная информация об объектах недвижимого имущества в газете «Звязда» за 10 снежня 2011 г. № 236.

Полное наименование, местонахождение покупателя акций	Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а, контактный телефон 8 0232 57 41 91
Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого покупаются	О Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а, контактный телефон 8 0232 57 41 91
Цель приобретения акций	с целью дальнейшей продажи инвесторам
Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель	4600 (четыре тысячи шестьсот) простых (обыкновенных) акций
Цена приобретения акций	75 000 (семьдесят пять тысяч) белорусских рублей
Срок, форма и порядок оплаты акций	оплата не позднее 60 (шестидесяти) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи путем перечисления денежных средств на счет продавца
Адрес, по которому будет заключаться договор купли-продажи	246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а, Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», контактный телефон 8 0232 57 41 91
Дата начала и окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций	с 01 февраля 2012 г. по 10 февраля 2012 г. Если общее количество предложенных для приобретения акций превысит 4600 штук, то акции приобретаются пропорционально заявленным требованиям
Дата начала и окончания заключения договоров купли-продажи акций	с 13 февраля 2012 г. по 16 марта 2012 г.

УНП 400052115

Пытальнік

ДЛЯ РАМОНТУ ДОМА ВЫКАРЫСТАННЕ ЧЭКАЎ НЕ ПРАДУГЛЕДЖАНА

ДОБРЫ дзень, рэдакцыя газеты «Звязда»! У мяне да вас просьба: дапамажыце разабрацца з чэкамі «Жыллё». У майго грамадзянскага мужа маюцца перарэгістраваныя нявыкарыстаныя чэкі «Жыллё». У маім прыватызаваным жылым памяшканні мы пражываем сумесна, ён прапісаны з 1995 года. Ці мае ён права выкарыстаць свае чэкі ў вызначаным парадку для паляпшэння сваіх жыллёвых умоў? Калі мае права на гэты дом, дык куды можна звярнуцца з чэкамі «Жыллё»? Якія даведкі яму трэба сабраць, каб можна было ўзяць крэдыт у банку на рамонт дома, каб можна было гэтымі чэкамі пагасіць крэдыт?

Марыя ВАРПАХОВІЧ, *вёска Пекары Маладзечанскага раёна.*

Адказ на запыт чытачкі па пытанні выкарыстання імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё» нам дапамаглі атрымаць у службе пазык і прыватызацыі жылля Маладзечанскага раёна.

«Згодна з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 жніўня 2006 года №13 «Аб унясенні змяненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2005 года», чэкі «Жыллё» могуць быць праіндэксаваны для ўплаты паявога ўзносу ў жыллёвым ці жыллёва-будаўнічым кааператыве або пагашэнні крэдыту (пазыкі), узятага на гэта будаўніцтва, фінансаванне індывідуальнага ці калектыўнага жыллёвага будаўніцтва, рэканструкцыі аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, набыцця жылля шляхам куплі, а таксама для пагашэння запазычанасці для ўплаты паявога ўзносу ў жыллёвым ці жыллёва-будаўнічым кааператыве або пагашэнні крэдыту (пазыкі), узятага на гэта будаўніцтва, фінансавання індывідуальнага ці калектыўнага жыллёвага будаўніцтва, рэканструкцыі аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, набыцця жылля шляхам куплі толькі грамадзянам, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Для рамонту дома выкарыстанне чэкаў «Жыллё» заканадаўствам не прадугледжана.

Па кансультацыю па пытанні выкарыстання чэкаў «Жыллё» можна звярнуцца ў службу пазык і прыватызацыі Маладзечанскага раёна, якая знаходзіцца ў Маладзечне па адрасе: вуліца Таўлая, 7, тэлефон 77 00 12».

САДЖАЦЬ ДРЭВЫ ЗІМОЙ — МОЖНА!

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

БЕЗ гэтага пытання апошнім часам не абыходзіцца, напэўна, ніводная зіма: чаму менавіта ў такі час саджаюць дрэвы, хіба ж можна? Вось і чарговы запыт быў падобны на папярэднія за выключэннем месца дзеі.

— Паміж вуліцамі Нікіфарава і Русіянава ёсць кавалачак зямлі — так званы «Брадвей», як празвалі яго месцічы. Яго ўжо ў трэці раз спрабуюць азеляніць. Мы ж напачатку не зразумелі, што адбываецца, думалі, 8 жанчын і 6 мужчын раскопваюць нешта, каб рамантаваць трубы, напрыклад. А потым прыглядзеліся: дрэвы саджаюць! Ды якія дрэвы — дубчыкі! Яны, напэўна, ужо ў дарозе пры такім надвор'і прамерзлі. Справа добрая, але ж дрэвы трэба саджаць не зімой, — абуралася мінчанка.

Каб у чарговы раз зняць усе пытанні, «Звязда» мусіла звярнуцца да кіраўніка службы добраўпарадкавання прадпрыемства «Мінскзелянбуд» Анжалікі Пузанковай.

— Калі гаварыць увогуле — пра пасадку дрэў у зімовы час — ніякіх парушэнняў тут няма. Згодна з кодэксам практыкі, што ўсталяваўся, яна дапускаецца пры тэмпературы паветра да мінус 15 градусаў. Наадварот, пасадка ў такіх умовах нават вітаецца, паколькі дрэвы знаходзяцца ў перыядзе спакою, значыць, менш пашкоджваюцца і потым лепш прыжываюцца на новым месцы. Саджаць дрэвы трэба без лісця. Таму, калі работы па пасадцы дрэў выконвалі па-першае, спецыялісты, па-другое, з захаваннем тэхналогіі, жыхарам мікрараёна не варта хвалявацца. Іншая справа — хто праводзіў пасадку? Гэты від дзейнасці не ліцэнзуецца, таму ім можа пры жаданні займацца любы ахвотны, — патлумачыла Анжаліка Васільеўна. — Тое ж можна сказаць і пра абрэзку дрэў. Яе правільна праводзіць у перыяд, калі скончыўся апад лісця і да пачатку сокаруху. Прыгадайце, дбайны гаспадар абразае дрэвы ва ўласным садзе не тады, калі пупышкі распусціліся, праўда? Галоўнае — зноў жа захоўваць тэхналогію.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Экслібрыс «Звязды»

БЕЗЗАГАННЫ КОЛАС

Мікола Маляўка «Коласаў абярэг: дзецям пра Якуба Коласа».

Проза. «Мастацкая літаратура», 2011.

У гэтай кнізе пераплятаюцца дзве біяграфіі — Якуба Коласа і Міколы Маляўкі, земляка класіка. У некаторых раздзелах аповед завяршаецца асабістымі згадкамі аўтара пра родныя — цяпер мемарыяльныя — мясціны Якуба Коласа. Кожны раздзел мае паэтычную канцоўку — санет Міколы Маляўкі, прысвечаны герою кнігі (праўда, пра аўтарства санетаў можна даведацца толькі з анатацыі, але ці пачынаюць чытачы знаёміцца з кнігай з канца?).

Мэтавая аўдыторыя выдання — дзеці — вызначыла вытрыманы змест і вельмі традыцыйны пафас кнігі. Аўтар балансуе паміж узнёслай ідылічнасцю («І Кастусь не цураўся работы, выбіўся ў пастушкі. У вольны час любіў збіраць ягады і грыбы. Лежачы на траве, мог падоўгу глядзець у неба: воблакі нагадвалі яму то паветраны замак, то дзіўнага звера, то чароўны дыван-самалёт») і дыялагічнай апавядальнасцю («Хто гэты настаўнік, што чытае дзецям казку на роднай мове? Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч.»); што можа сведчыць пра скіраванасць на дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

Для падмацавання свайго аповеду Мікола Маляўка выкарыстаў фрагменты твораў Якуба Коласа і цытаты з біяграфічных выданняў пра класіка (напрыклад, з кнігі Максіма Лужаніна «Колас расказвае пра сябе»). Выбар цытат працуе на ідэалізацыю пісьменніка: так, з артыкулаў Максіма Багдановіча, дзе творчасць Коласа і крытыкуецца, і ўхваляецца, выбраны толькі тыя словы, што сцвярджаюць беззаганнасць класіка.

Аўтар дынамічна, на адной старонцы, апісаў знаёмства Якуба Коласа з Марыяй Каменскай і іх жаніцьбу і на некалькіх старонках акрэсліў клапатлівае стаўленне пісьменніка-выкладчыка да студэнтаў, што можа дастаткова пэўным чынам уплываць на ўспрыманне маленькімі чытачамі вобраза класіка. Не абмінае аўтар і падзеі жудасных 1930-х гадоў, акцэнтуючы ўвагу на тых эпізодах з біяграфіі пісьменніка, калі ён змог пераадолець свой страх.

Верагодна, свядомая ўстаноўка аўтара на «стварэнне куміра» для новага пакалення чытачоў не паспрыяе сучаснаму ўспрыманню асобы і творчасці Якуба Коласа (у кнізе пераважае вядомая інфармацыя ў традыцыйных трактоўках), але знойдзе сваіх прыхільнікаў сярод аматараў «бронзавай беларушчыны».

ШАМЯКІН: КЛАСІК І ЧАЛАВЕК

«Іван Шамякін: вядомы і невядомы». Укладальнік Таццяна Шамякіна.

Успаміны, эсэ, аповесць. «Літаратура і мастацтва», 2011.

Укладальнік зборніка Таццяна Шамякіна, дачка пісьменніка, вельмі смела паспрыяла «ачалавечванню» вобраза класіка Івана Шамякіна. Новая, часам вельмі прыватная інфармацыя не толькі не зашкодзіла традыцыйнаму ўяўленню пра пісьменніка, але безумоўна паўплывае на асучасненне яго іміджу.

У гэтым біяграфічным зборніку нязмушана спалучаюцца жывыя ўспаміны і навуковыя тэксты. Структура кнігі — усеабдымная: звесткі энцыклапедычнага кшталту пра сям'ю пісьменніка, асобны раздзел пра маці, жонку і дзяцей, літаратуразнаўчыя эсэ Таццяны Шамякінай пра творчасць бацькі і яго час, эсэ пра сувязь творчасці класіка з архітэктурай, выяўленчым мастацтвам і музыкай. Годным завяршэннем кнігі стала мемуарная аповесць Івана Шамякіна пра жонку «Слаўся, Марыя!».

Укладальніца кнігі тонка расставіла акцэнты ў хібах і вартасцях бацькі: і вось чытач бачыць, як аўтар усесаюзных бестсэлераў, заможны і няшчодры ў побытавым жыцці чалавек, пасля распаду СССР і страты капіталу робіцца фаталістам у фінансавых справах.

Цікава чытаюцца і звесткі пра сям'ю пісьменніка — дзяцей (а іх было чацвёра, і розніца паміж старэйшай і малодшай дочкамі — 20 гадоў), унукаў. Пасталеўшы, дзеці заўважылі за бацькам нечаканую ўласцівасць: ён быў далёкі ад іх жыцця, не памятаў важныя эпізоды іх дзяцінства, і калі пісаў тэкст да 55-годдзя дачкі Таццяны, то карыстаўся пераважна ўспамінамі родных, хоць увогуле на сваю памяць не скардзіўся.

Няўжо жыццё ўласных дзяцей не здавалася яму цікавым? Такую няўвагу бацькі дачка абгрунтавала не тым, што адразу просіцца ў тлумачэнне (Іван Шамякін сапраўды быў вельмі заняты і пісьменніцкімі, і дзяржаўнымі справамі). Не, прычыну такога стаўлення дачка ўбачыла ў надзвычайным і самадастатковым каханні бацькоў.

І, нібыта доказам гэтай версіі, — аповесць «Слаўся, Марыя! Гісторыя кахання, любові і жыцця». Яна пачынаецца цытатай з твора І. Буніна пра тое, што ў труне ляжала «безобразное». Шамякін працытаваў і не пагадзіўся: «І ў труне, пасля сямі месяцаў <...> цяжкой невылечнай хваробы — лейкозу — яна была для мяне прыгожай». Лёс з дзяцінства зводзіў і разводзіў іх, каб аднойчы пяяднаць на доўгія дзесяцігоддзі, каб урэшце злучыць назаўсёды, каб у чарговы раз пацвердзіць вядомае выслоўе пра тое, што за спінай выдатнага мужчыны заўсёды стаіць выдатная жанчына.

Вядучая рубрыкі Аксана БЯЗЛЕПКІНА,

Медыяпрастора

Актуальная «ПЛАНЕТА»

ПЕРШЫ ў 2012 годзе часопіс «Планета» прапануе чытачам шэраг актуальных матэрыялаў. Галоўная тэма нумара — агляд падзей палітычнага і эканамічнага жыцця ў мінулым, 2011 годзе, а таксама палітычны прагноз на 2012 год. Часопіс не абмінуў сваёй увагай падзеі на Блізкім Усходзе, хуткія выбары ў ЗША, глабальныя працэсы сусветнай эканомікі.

Не менш увагі часопіс надае навінам навукі. Інтэрв'ю з прафесарам Мэцью Страслерам, членам міжнароднай групы вучоных, якія вядуць даследаванні з дапамогай Вялікага адроннага калайдара, сапраўды зацікавіць аматараў фізікі, а артыкул пра неразгаданыя загадкі пашырыць для вас новыя навуковыя гарызонты. Тым, хто любіць гісторыю, прапануюцца матэрыялы пра старажытныя курганы Беларусі, а таксама пра каралеўскіх піратаў. Аматарам падарожжаў будзе цікава пазнаёміцца з экзатычнай Андалузіяй; кінаманы адкрыюць для сябе рэальную гісторыю, на аснове якой быў зняты вядомы дэтэктыўны фільм; тыя, хто любіць спорт, даведаюцца пра самыя экстрэмальныя і небяспечныя рэкорды.

Напрыканцы нумара зроблена спроба даць адказ на пытанне, якое хвалюе многіх: ці спраўдзяцца прагнозы індзейцаў майя — ці адбудзецца ў гэтым годзе канец свету?

Таццяна ЛАМОНАВА.

Шматгранная палітра «БЕЛАРУСКАЙ ДУМКІ»

СТУДЗЕНЬСКІ нумар часопіса «Беларуская думка» прапануе чытачу багатую і шматгранную палітру надзённых тэм.

Старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына ў эксклюзіўным інтэрв'ю выданню расказвае пра дзейнасць галоўнага выбарчага органа краіны, акцэнтуе ўвагу на найбольш значных момантах выбарчага заканадаўства, выказвае асабістае стаўленне да адной з галоўных у гэтым годзе падзей у грамадска-палітычным жыцці нашай дзяржавы падзей — парламенцкіх выбараў. Асаблівай увагі заслугоўваюць і меркаванні кіраўніка беларускага Цэнтрвыбаркама наконт даты правядзення выбараў-2012, выкарыстання пры галасаванні так званых празрыстых пластыкавых урнаў, а таксама — каментарыі да вынікаў апошніх выбараў у Расійскую Дзяржаўную Думу і да дзейнасці ў нашай краіне падчас выбарных кампаній міжнародных наглядальнікаў.

Пра задачы, што стаяць перад сістэмай эканамічнага правасуддзя, можна даведацца з гутаркі са старшынёй Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь Віктарам Камянковым. У прыватнасці ён засяроджвае ўвагу на зменах у Гаспадарчым працэсуальным кодэксе, якія прыўнёс у яго час і якія будуць садзейнічаць больш паспяховай рабоце судзейскага корпуса краіны.

Нядаўна споўнілася 20 гадоў беларуска-кітайскаму партнёрству — Кітайская Народная Рэспубліка стала адной з дзяржаў далёкага замежжа, якія першымі ўстанавілі дыпламатычныя адносіны з незалежнай Беларуссю. Гэтай падзеі прысвечаны артыкул «Стратэгія ўзаемадзеяння» Льва Крыштаповіча і Аляксандра Філіпава.

У студзені «Беларуская думка» працягвае супрацоўніцтва з Нацыянальнай акадэміяй навук Рэспублікі Беларусь праект «Патрыярхі беларускай навукі».

З іншых публікацый студзеньскага нумара «Беларускай думкі» таксама можна даведацца аб праблемах развіцця канкурэнцыі на айчынным рынку жыллёва-камунальных паслуг, развіцці энергетычнай галіны краіны і інш.

Сяргей ГАЛОЎКА.

«ЗЯМЛЯ, ШТО НАМ ДАДЗЕНА ЛЁСАМ»

Праект пад такой назвай амаль пяць гадоў таму ўпершыню прагучаў на хвалях Беларускага радыё. Праз год да яго аўтара — пісьменніка і публіцыста, галоўнага дырэктара радыёстанцыі «Беларусь» Навума Гальпяровіча далучылася сувядучая — цяперашні галоўны рэдактар штотыднёвіка «ЛіМ» Таццяна Сівец.

Героі праграмы аналізуюць сувязь уласных жыццёвых шляхоў з пуцявінамі Радзімы, прыгадваюць часы маленства і родныя мясціны, разважаюць пра сённяшні дзень краіны і нашу агульную будучыню. Здавалася б, колькі можна гаварыць на адну і тую ж тэму? Але наша зямля — невычэрпная крыніца, у тым ліку і цікавых суразмоўцаў. Кожны з запрошаных — ад студэнта-першакурсніка да акадэміка — асоба, якая не баіцца выказаць самыя смелыя ды арыгінальныя думкі, падзяліцца тым, што хвалюе, і зрабіць высновы, карысныя для ўсёй грамадскасці.

Неаднаразовым экспертам у студыі быў пісьменнік, краязнаўца, галоўны рэдактар газеты «Звязда» Алесь Карлюкевіч. Чарговую гутарку з ім, прысвечаную найстарэйшай газеце Беларусі, кнігавыданню ў нашай краіне, а таксама пытанням айчыннага краязнаўства, можна будзе пачуць 12 лютага, у нядзелю, у 17.15 на хвалях Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё (106,2 FM)!

Раіса СІНЯЎСКАЯ.

СЕМ'ЯМ БЕСПРАЦОЎНЫХ ПРЫ ПЕРАЕЗДЗЕ ДАДУЦЬ БОЛЬШЫЯ ВЫПЛАТЫ

У нашай краіне ўзмоцнена падтрымка сем'яў беспрацоўных пры перасяленні на новае месца жыхарства і працы з буйных гарадоў. Як заявіў «Звяздзе» галоўны спецыяліст аддзела праграм садзейнічання занятасці насельніцтва ўпраўлення палітыкі занятасці Мінпрацы і сацыяльнай абароны Максім Фларынскі, гэта прадугледжана пастановай № 136 ад 26 снежня 2011 года Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

У сувязі з гэтай пастановай у Інструкцыю аб парадку і ўмовах перасялення беспрацоўных па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Рэспублікі Беларусь былі ўнесены некаторыя дапаўненні і змены. Што ж новага з'явілася?

❍ Пры пераездзе беспрацоўнага і членаў яго сям'і на новае месца жыхарства і працы з гарадоў у малыя, сярэднія гарадскія паселішчы, у сельскую мясцовасць, а таксама гарады-спадарожнікі беспрацоўнаму прадугледжаны грашовыя выплаты ў памеры дзевяціразовай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. (Нагадаем, што БПМ з 1 лютага па 30 красавіка 2012 г. складае 706 тыс. 880 руб.) У мэтах спрашчэння працэдуры ўсе грашовыя сродкі з лютага 2012 года будуць выплачвацца толькі беспрацоўнаму.

❍ Удакладнены склад сям'і беспрацоўнага, якому пакрываюцца выдаткі на пераезд (гаворка ідзе аб выдатках па праездзе, перавозцы маёмасці, сутачных за час знаходжання ў дарозе). Так, пад членамі сям'і разумеюцца муж, жонка, іх непаўналетнія дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя (удачароныя), а таксама блізкія сваякі мужа і жонкі, якія знаходзяцца на іх утрыманні і (або) маюць патрэбу ў доглядзе (навучэнцы, старэйшыя за 18 гадоў, якія асвойваюць змест аднаго з відаў адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, інваліды I і II групы, асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, састарэлыя, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту).

❍ Пры перасяленні беспрацоўнага і членаў яго сям'і на новае месца жыхарства і працы па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Рэспублікі Беларусь фінансавая падтрымка можа аказвацца толькі адзін раз.

Выдаткі беспрацоўнага па праездзе да месца знаходжання наймальніка і назад кампенсуюцца беспрацоўнаму па месцы рэгістрацыі беспрацоўнага.

Святлана БУСЬКО.

На нататку

У 2011 годзе пры садзейнічанні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне на новае месца жыхарства і працы перасяліліся 363 сям'і беспрацоўных. Больш за ўсё сем'яў беспрацоўных, якія змянілі рэгістрацыю, аказалася ў Віцебскай (107) і ў Мінскай (89) абласцях. Дарэчы, у 2011 годзе пераехалі ў правінцыю 6 сталічных сем'яў беспрацоўных.

❍ ❍ ❍

Дзяржаўнай праграмай садзейнічання занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2012 год прадугледжана перасяленне 335 сем'яў беспрацоўных. На гэтыя мэты будзе накіравана амаль 2,5 млрд руб.

Яўгена ПЯСЕЦКАГА фота слова

Калі настане, што казаў прарок,
І сонца назаўжды пакіне неба,
Я маю прыхаваныя знарок
З Грамніцаў свечку і кавалак хлеба.
Я запалю дрыготкае святло,
Каб напаследак бачыць твае вочы,

Падзелім хлеб, перахрысцім жытло
І разам ступім у прадонне ночы...
Мы не загінем, бо пякельны гром,
Людскую здраду, чорную галечу —
Усё адолеем святым святлом
Адной-адзінае грамнічнай свечкі.

Выратаванне

Карэспандэнт «Звязды» пабываў у Цэнтры начнога знаходжання для асоб без пэўнага месца жыхарства ў Віцебску

ДЖЭНТЛЬМЕНЫ ЎДАЧЫ, або 3 дна да нармальнага жыцця

ЦІКАВА, што бяздомных могуць размясціць тут толькі пры іх згодзе. І нават падпісваюць адпаведныя дагаворы. У моцныя халады, зразумела, бяздомныя прыходзяць сюды значна ахвотней. Праўда, некаторыя з іх — толькі каб «перазімаваць». А потым — зноў да вольнага жыцця, зразумелага толькі ім, напоўненага сваімі «выгодамі» і нейкім таямнічым для нармальных людзей адчуваннем свабоды. А зімой у гэтай установе, можна сказаць, «аншлаг». Чаму б не пажыць? Тут цёпла, утульна. Па камфорце пражывання цэнтр смела можна параўнаць з атэлем.

Ты ж такой прыгожай ад нас сышла. У новым адзенні.

У адказ — маўчанне.

— Вас ніхто не будзе сілай тут утрымліваць. Ёсць жаданне — адразу можаце пайсці. Праўда, думаю, гуляць будзеце нядоўга, — сказаў дырэктар. — Хто хоча атрымаць шанц і пачаць сваё жыццё з нуля? Падымце рукі.

Спачатку паднялі рукі толькі тры чалавекі. Потым яшчэ, яшчэ...

— Калі не хочаце трапіць у «лётна-тэхнічны полк» (так дырэктар пажартаваў наконт абрэвіятуры лячэбна-працоўнага прафілакторыя), прапануем адумацца і паспрабаваць знайсці працу. А мы вам дапаможам.

Зараз у цэнтры жывуць 25 чалавек. А ўсяго ён адначасова можа ўмясціць каля сарака бяздомных. Усе яны перад тым, як пасяліцца, знаёмяцца з правіламі знаходжання. Табу накладзена на прыход у нецвярозым стане, як, зразумела, і на выпіўку ў самім цэнтры. Пастаяльцы павінны прывесці ў парадак свой знешні выгляд. Каб не заводзіліся «шкодныя насякомыя», мужчынам нельга адрошчваць бараду. Вусы — дазваляюцца.

У дзесяць гадзін вечара дзверы цэнтра зачыняюцца. А ў восем гадзін раніцы там нікога з жыхароў ужо не павінна быць. Днём усе разыходзяцца па інстанцыях афармляць неабходныя дакументы, шукаць працу, працаваць, калі знайшлі. З усімі пастаяльцамі заключаецца двухбаковы дагавор на пражыванне. Розныя гуманітарныя арганізацыі (напрыклад, «Чырвоны Крыж») дапамагаюць чым могуць: адзеннем, сродкамі гігіены. Каталіцкая царква арганізавала бясплатны абед. Сястра з касцёла раздае гарачую ежу. У цэнтры бываюць канцэрты, тут святкуюць Каляды, Новы год. Як расказаў дырэктар, нават вяселле справілі. Будучыя муж і жонка — з былых бяздомных. Пазнаёміліся ў цэнтры, закахаліся. Цяпер жывуць нармальным жыццём, працуюць.

«Атэль» у былым садку

«Дом для бамжоў» у Віцебску працуе на вуліцы Гагарына. Старажылы горада добра памятаюць, што ў гэтым доме № 88а раней быў дзіцячы садок. У цэнтры — больш за дзесяць спальных пакояў. Ёсць душавыя, добрая актавая зала з тэлевізарам. І кніжку можна ўзяць пачытаць у бібліятэцы, і свежыя газеты. Працуе медыцынскі пункт. У сталовай ёсць халадзільнік, электраплітa, мікрахвалевая печка, аднаразовы посуд. За парадкам сочыць міліцыянер. У цэнтры можна жыць да шасці месяцаў. У асобных выпадках — да года. Усе паслугі бясплатныя.

Як пажартаваў адзін з чыноўнікаў, які пабываў у цэнтры падчас яго адкрыцця, па ўмовах пражывання ўстанову можна смела параўнаць з «трохзоркавым» атэлем. На стварэнне цэнтра было патрачана больш за 1,2 мільярда рублёў. Замежныя вернікі фінансавалі набыццё ложкаў і абсталявання для апрацоўкі адзення. Дапамагалі таксама прадпрыемствы і арганізацыі.

Пагутарыў з навасёламі. Адзін, як высветлілася, родам з Сібіры. Усё скардзіўся, што нікому не патрэбны. А хто ж вінаваты? Дзеці, паводле яго слоў, ужо дарослыя, у былой жонкі — сваё жыццё. Мог бы пераехаць у Расію, ды з блізкімі стасункаў не падтрымлівае...

Другі даўно ўжо прыехаў жыць у Беларусь ажно з Туркменістана. Там і цяпер жывуць яго бацькі, браты, сёстры. Сказаў, што праблемы пачаліся пасля таго, як на Віцебскім мясакамбінаце, дзе працаваў, папаўся на крадзяжы. Не пасадзілі, толькі вылічвалі грошы штомесяц з зарплаты. Дык выплаціў бы ўсё і жыў далей спакойна. Адказаў, што «палова» ва ўсім вінаватая — выгнала на вуліцу. Напэўна, з-за таго, што моцна піць пачаў... Цяпер збіраецца трохі «адпачыць» ды вярнуцца да родных. Безумоўна, пасля вуліцы тут, у цэнтры, як у раі.

З'есці, каб... сесці

Уладзімір ПРАНЬКО, намеснік начальніка ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі УУС Віцебскага аблвыканкама, расказаў, што бяздомных перыядычна збіраюць і тлумачаць ім, як можна трапіць у цэнтр.

— У нашай размове бяруць удзел і прадстаўнікі сістэмы аховы здароўя, сацыяльнай службы, — растлумачыў Уладзімір Пранько. — Многія бяздомныя пасля аказання ім паслуг у санітарным прапускніку сыходзяць. З імі даволі цяжка праводзіць прафілактычную работу: толькі калі затрымалі за нешта... Цяпер дзейнічаем па-іншаму. Дамовіліся з кіраўніцтвам упраўлення аховы здароўя аблвыканкама пра выдзяленне месцаў у псіхіятрычных бальніцах (у наркалагічных аддзяленнях). Усім, хто сёння прыбыў у цэнтр, да гэтага прапанавалі палячыцца. І ўсе без выключэння з вялікім жаданнем пагадзіліся. Таму што халады прыйшлі, дык чаму б не аказацца ў нармальных, нават камфортных умовах? Усе гэтыя адзінаццаць чалавек пралячыліся ў Лепельскай псіхіятрычнай бальніцы, прайшлі поўны медыцынскі агляд. Бо кожны затрымліваўся і прыцягваўся да адказнасці за парушэнне правапарадку ў нецвярозым стане. І на падставе адпаведнага закона іх стан здароўя вывучылі медыкі. Фактычна раней гэтага не рабілася.

Цяпер, пасля лячэння, гэтым людзям лягчэй «уцягвацца» ў нармальнае жыццё ў цэнтры. І многае, зразумела, залежыць ад тых спецыялістаў сацыяльнай службы, якія павінны прапанаваць працу, паклапаціцца пра выдзяленне жылля. На кожнага бяздомнага завядуць спецыяльную прафілактычную «справу» ў адпаведнасці з заканадаўствам аб асновах дзейнасці па прафілактыцы. Толькі летась праваахоўныя органы накіравалі ў цэнтр больш за 100 чалавек. З іх каля трыццаці, як гавораць, «жалезна» зачапіліся за жыццё.

Сярод бамжоў ёсць, можна сказаць, рэдкія «кадры». Адзін, напрыклад, аж 56 разоў прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за дробныя крадзяжы. Заходзіць у краму, бярэ нейкі прадукт (сырок, у прыватнасці) і пачынае есці... За год адсядзеў 45 сутак у ізалятары часовага ўтрымання. Хаця пры гэтым ні разу не прыцягваўся да адказнасці за ўжыванне спіртнога. Іншыя, калі прыходзяць халады, спецыяльна ідуць на злачынствы, каб трапіць у месцы пазбаўлення волі, дзе цёпла і кормяць.

Праблема з пашпартызацыяй

Гэтую праблему, бадай, можна вырашыць толькі на заканадаўчым узроўні. Як расказаў Уладзімір Пранько, існуе праблема з атрыманнем бяздомнымі пашпартоў. З адпаведнымі прапановамі зацікаўленыя службы аховы правапарадку павінны выйсці на адказных асоб розных узроўняў у тым ліку і рэспубліканскага.

Дарэчы, каб трапіць у Цэнтр начнога знаходжання, бамжу патрэбна рэгістрацыя, якую неабходна атрымаць у тэрытарыяльным аддзеле па грамадзянстве і міграцыі. За рэгістрацыю, у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў, трэба заплаціць 7 тысяч рублёў (на момант нашай размовы. — **А.П.**). Акрамя таго, патрэбны пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Каб атрымаць пашпарт, трэба таксама заплаціць — 17 тысяч рублёў. Але паўстае пытанне: адкуль грошы, няхай і невялікія, у бяздомнага?

Па падліках супрацоўнікаў міліцыі, ва ўсёй Віцебскай вобласці пражывае сто бяздомных. Аналагічны віцебскаму Цэнтр начнога знаходжання адкрыўся ў Оршы — у корпусе былой чыгуначнай бальніцы. Адначасова тут могуць размясціцца да 25 чалавек. Яшчэ адна падобная ўстанова ствараецца і ў Полацкім раёне. Што датычыцца глыбінкі, як адзначылі спецыялісты, бамжоў там няма. А калі з'яўляюцца, іх праблемы могуць, калі пастараюцца, вырашыць прадстаўнікі мясцовай улады. Не будаваць жа цэнтры ў кожным раёне для аднаго-двух чалавек?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ТЭХНАПАРК ДАЧНІКАЎ НЕ ПАКРЫЎДЗІЦЬ

Узяцца за гэтую тэму падштурхнулі званкі чытачоў «Звязды», якія цікавіліся будучым месцазнаходжаннем кітайскага тэхнапарка. Тэлефанавалі пераважна дачнікі, напалоханыя чуткамі аб верагодным зносе сядзіб з нагоды новай і вялікай будоўлі на іх агародах. А дачнікаў у раёне вельмі шмат: адных садовых таварыстваў больш за 150, яны аб'ядноўваюць амаль 28 000 участкаў. Іх уладальнікі знаходзяцца зараз у рэжыме трывожнага чакання.

Першая інфармацыя аб кітайскім тэхнапарку прагучала з вуснаў першых асоб краіны. Планы яго будаўніцтва непадалёку ад Смалявіч адносна нядаўна пракаментаваў прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч. Па яго словах, пад Мінскам з'явіцца беларуска-кітайскі індустрыяльны парк, які не саступіць вядомаму расійскаму «Сколкава», а можа, будзе нават у чымсьці цікавей. Супрацоўніцтва з Кітаем дазволіць за 5-7 гадоў калі не падвоіць валавы ўнутраны прадукт, то істотна прасунуцца наперад у гэтым напрамку. Прычым у асноўным дзякуючы вырабу і пастаўкам на сусветныя рынкі навукаёмістай, канкурэнтаздольнай прадукцыі з тэхнапарка. Акрамя таго, у ім плануецца рэалізаваць шэраг важных імпартазамяшчальных праектаў, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

Іншыя крыніцы інфармацыі паведамляюць, што ўжо падрыхтаваны адпаведны праект Указ Прэзідэнта Беларусі, у якім на заканадаўчым узроўні будуць замацаваны ўмовы дзейнасці парка. Сёння ідзе працэс узгаднення з кітайскім бокам рабочых пытанняў. Увогуле мяркуецца, што ў новай прамысловай зоне пад Смалявічамі адкрыюцца не толькі кітайскія прадпрыемствы, але і філіялы іншых сусветнавядомых замежных фірм і карпарацый, якія выпускаюць канкурэнтаздольную прадукцыю.

Будаўніцтва тэхнапарка запатрабуе велізарных інвестыцый: сотні мільёнаў, а можа і некалькі мільярдаў долараў. Канчатковая лічба пакуль не агучваецца. Але вядома, што кітайцы гатовыя прадставіць на гэты і іншыя асноўныя сумесныя праекты ў Беларусі крэдыты ў неабходным аб'ёме. Зараз рыхтуюцца да падпісання адпаведныя дамовы. У гэтай сувязі намеснік прэм'ер-міністра, сустаршыня беларуска-кітайскай гандлёва-эканамічнай камісіі Анатоль Тозік яшчэ летась у лістападзе правёў ў Пекіне перамовы са старшынёй буйнага кітайскага Эксімбанка. Яны адбыліся ў рамках чарговага пасяджэння вышэйзгаданай камісіі. Дарэчы, Эксімбанк ужо не першы год супрацоўнічае з нашай краінай, на яго крэдыты рэалізаваны і зараз рэалізуюцца многія беларуска-кітайскія праекты.

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Ігар Войтаў увогуле назваў рэкордную лічбу інвестыцый у будаўніцтва парка: прыкладна 30 мільярдаў долараў. Уяўляеце, якая махіна будзе! Канкрэтнымі пытаннямі стварэння і развіцця складанай гаспадаркі парка зоймецца сумесная кампанія. Яе заснавальнікамі стануць кітайская карпарацыя інжынірынгу CAMC і кіруючая кампанія холдынгу «Гарызонт». Прадстаўнікі беларускага холдынгу возьмуць на сябе суправаджэнне інвестыцыйных праектаў ад іх падрыхтоўкі і да рэалізацыі, будуць аказваць інвестарам кансалтынгавыя, юрыдычныя, маркетынгавыя паслугі, дапамагаць у рэалізацыі праектаў, садзейнічаць у распрацоўцы рознай дакументацыі. Адміністрацыя парка будзе працаваць па прынцыпе «адна станцыя». Гэта значыць, што істотна спрашчаецца працэдура атрымання ўсіх экспертыз, дазваляючых дакументаў на вядзенне гаспадарчай дзейнасці, на праектаванне, будаўніцтва і г. д.

Ігар Войтаў таксама раскрыў асобныя «сакрэты» характару дзейнасці будучых рэзідэнтаў парка. Прыярытэтнае развіццё пад Смалявічамі набудуць машынабудаванне, тонкая хімія, біямедыцына, бытавая тэхніка, электроніка і іншыя галіны. Іх інавацыйную прадукцыю мяркуецца экспартаваць у краіны СНД і Еўропы. Рэзідэнты атрымаюць ільготы і стартавыя прывілеі. Такі спрыяльны рэжым разлічаны на першыя 10 гадоў. Да 2017 года прадугледжваецца вызваленне ад усіх падаткаў, пасля чаго на працягу 5 гадоў рэзідэнты будуць плаціць падаткі па стаўцы 50 працэнтаў ад дзейнага рэжыму падаткаабкладання. Пасля 10 гадоў ізноў прадугледжваюцца ільготы. Увогуле тэрмін такога прывабнага для інвестараў рэжыму дасягне 30 гадоў.

Аднак не ўсіх узрадавала гэта навіна. Напрыклад, дачнікаў, садаводчыя ўчасткі якіх знаходзяцца побач з вёскамі Слабада, Ганчароўка, Арэшнікі і іншых. Дарэчы, іх жыхары таксама выказваюць занепакоенасць лёсам сваёй нерухомай уласнасці, баяцца апынуцца ў ролі пакрыўджаных. У Смалявіцкім раённым Савеце і райвыканкаме ўпэўнены, што панічныя настроі ў вяскоўцаў і дачнікаў выклікалі безадказныя і неадпавядаючыя рэчаіснасці паведамленні і высновы ў інтэрнэце аб намеры знесці жылыя пабудовы, якія знаходзяцца на тым месцы, дзе будзе ўзводзіцца тэхнапарк. Пакуль ідзе толькі прапрацоўка пытання, ніякіх рашэнняў па выдзяленні ўчастка зямлі пад забудову не прымалася. Ёсць толькі прапановы, прыкідкі. Як бы не вырашылася геаграфія гэтага пытання, будзе ўсё зроблена для таго, каб інтарэсы ўладальнікаў дач і жыхароў раёна не ўпярпелі. Для апошніх ёсць і добрая навіна: у парку будуць створаныя новыя працоўныя месцы. У ім і вакол яго плануецца сфарміраваць неабходную інфраструктуру як для вытворчасці, так і для персаналу.

Як паведамілі ў Мінскім аблвыканкаме, стварэнне індустрыяльнага парку абяцае стаць самым маштабным праектам не толькі ў вобласці, але ў краіне і нават за яе межамі. У тым ліку і па плошчы. Сёння ідзе гаворка аб выдзяленні прыкладна 80 кв. км тэрыторыі ў цэнтры раёна. Пляцоўка пад гэты аб'ект ужо прыблізна вызначаная непадалёку ад Нацыянальнага аэрапорта, але бліжэй да чыгункі і маскоўскай трасы.

Як бачым, дакладнай і канкрэтнай інфармацыі пра кітайскі тэхнапарк няшмат. Можа, таму і хвалююцца людзі з нагоды «кітаізацыі» прысталічнага раёна. Дарэчы, «кітаізацыя» — не мой тэрмін, яго ў размове са мной ужыў вядомы беларускі эканаміст, доктар навук, прафесар, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пётр Нікіценка. Ён лічыць, што гэтага працэсу не трэба баяцца. «Кітаізацыя» паступова, як глабальная тэндэнцыя XXI стагоддзя, ахоплівае сусветную эканоміку, у тым ліку і нашу краіну. Сёння ў Беларусі паспяхова працуюць прадстаўніцтвы каля 30 буйных кітайскіх кампаній. Далей будзе болей. П. Нікіценка нічога дрэннага ў гэтым не бачыць.

— Развіццё вытворчасці інавацыйных інтэлектуальных прадуктаў дасць прырост нашых ведаў і тым самым стане стымулам для айчыннай вышэйшай школы, акадэмічных навуковых інстытутаў працаваць па-новаму, на сучасных прынцыпах. Акрамя гэтага, рэалізацыя праекта такога маштабу, як тэхнічны парк пад Смалявічамі, уздыме на новы ўзровень імідж нашай краіны ў свеце, надасць магутны імпульс яе экспарту. Узвядзенне парка стане з'явай міжнароднага значэння, — гаворыць Пётр Георгіевіч.

Нагадаем, галоўнае і традыцыйнае прызначэнне тэхнічнага парка — распрацоўка новых тэхналогій і развіццё сучасных інавацыйных вытворчасцяў. Звычайна тэхнапаркі існуюць у форме свабоднай эканамічнай зоны і ўяўляюць сабой сімбіёз навукі, адукацыі, дзяржавы і дзелавога міру. Першы тэхнапарк з'явіўся ў ЗША ў сярэдзіне мінулага стагоддзя на тэрыторыі славутага Стэнфардскага ўніверсітэта ў Каліфорніі. Там мясцовая ўлада вырашыла здаць пустыр у арэнду новым малым прадпрыемствам, якія раскручваліся ў сферы высокіх тэхналогій — у асноўным выконвалі заказы ваенна-прамысловага комплексу. Бізнэс хутка рос. Дзякуючы суседству з універсітэтам не было недахопу ў кваліфікаваных кадрах — яго выпускнікі ахвотна ўладкоўваліся на працу на перспектыўныя прадпрыемствы. Дарэчы, у тым тэхнапарку пачалі сваю дзейнасць такія вядомыя сусветныя фірмы, як «Паларoід» і «Х'юлет-Пакард». Потым паркі пачалі расці як грыбы ў іншых штатах. Сёння амаль чвэрць усіх тэхнапаркаў свету знаходзіцца ў ЗША.

Першы кітайскі тэхнапарк з'явіўся ў 1985 годзе ў горадзе Шэньчжэнь. А цяпер у КНР ужо 53 агульнанацыянальныя, 50 рэгіянальных і 30 універсітэцкіх тэхнапаркаў. Іх асноўная частка знаходзіцца на поўдні, у рэгіёне так званай «залатой берагавой паласы» з марскімі портамі і сучаснай развітой інфраструктурай. Варта заўважыць, што кітайцы не капіравалі слепа замежны досвед. У ЗША і Еўропе галоўнай мэтай стварэння тэхнапаркаў было імкненне спалучыць магчымасці бізнэсу і навукі для тэхналагічнага прарыву. А вось прычынай узнікнення тэхнапаркаў у КНР стала жаданне прыцягнуць як мага больш інвестыцый у эканоміку краіны. Для тэхнапаркаў быў створаны спрыяльны інвестыцыйны клімат, падатковыя льготы прадстаўляліся ўсім замежным фірмам, а не толькі тым, якія працуюць у сферы высокіх тэхналогій. Нізкае падаткаабкладанне і танная працоўная сіла зрабілі тэхнапаркі КНР папулярнымі ў свеце.

Будзем спадзявацца, што і парк пад Смалявічамі набудзе сваіх сур'ёзных інвестараў.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Смалявіцкі раён.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» ИНФОРМИРУЕТ:

Минский городской центр недвижимости

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 27 февраля 2012 года открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Минский моторный завод»

(опубликовано в газете «Звязда» от 27.01.2012) излагается в новой редакции:

«Извещение о проведении 05 марта 2012 года открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Минский моторный завод»

Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)	Инв. № кадастровый	Инв. № бух.
Здание специализированное автомобильного транспорта (гараж) общей площадью 294,2 кв. м	600/С-93934	39271
Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (овощехранилище) общей площадью 115,4 кв. м	600/С-121926	39272
Площадка асфальтобетонная 1022 кв.м		45651
Бордюры (0,16; 0,08) (0,16 – 677м.п.; 0,08 – 24м.п.)		45651/1
Внутренние дороги и дорожки (внутр. – 1242кв.м; пеш. – 186 кв.м)		45651/2
Пешеходная дорожка (б)		45651/3
Пешеходная дорожка (к)		45651/4
Здание специализированное иного назначения (общежитие) общей площадью 590,8 кв. м	600/С-93935	39270
Кондиционер TRM-12H		42235
Кондиционер TRM-12H		42236
Теплосчетчик		42254
Теплосчетчик		42255
Теплица (сооружение специализированное сельскохозяйственного назначения общей площадью 5 462,9 кв. м)	600/С-121928	25053
Внутренние дороги и пешеходные дорожки		45650
Бордюр 0,16		45650/1
Пешеходная дорожка грунтовая		45650/2
Высоковольтная линия электроснабжения 87/74		17274
Котел 2-барабанный водотрубный ДКВР2,5-13		19006
Котел 2-барабанный водотрубный ДКВР2,5-13		19007
Внеплощадочная телефонизация 50/70-36		20952
Котел паровой МЗК		22346
Солерастворитель		25185
Наружное освещение (кабель ААШВ-125м; светильник ЖКУ 51-150-013-6шт.; лампа ДРЛ-6шт.)		39294
Автоматическая канализационная станция	600/С-120317	39295
Подогреватель пароводяной ПП2-17-7-2		42910
Газораспределительный пункт (здание специализированное энергетики общей площадью 12,5 кв. м)	600/С-120320	45178
Наружные сети хоз.питьевого водопровода (трубопровод чугунный д. 150мм–440м.п.; д.100мм–235м.п.; д.50мм–55м.п.; задвижки д.150–10шт.; д.100–3шт.; д.50–2шт.; колодец железобетон. д.1000–18шт.; пожарный гидрант д.1000–3шт.)		45308
Наружные сети канализации 260 м.п.		45309
Тепловые сети		45310
Наружные сети электроснабжения 0,4кВ (кабель АВВГ 2(3х50+1х25)=76м; кабель АВВГ (3х10+1х4)=94м; кабель АВВГ(3х16+1х10)=500м; кабель ААБ 3х120=412м; кабель АБ (3х10)=20м; кабель2(3х25)=152м		45311
Газопровод низкого давления		45312
Трансформаторная подстанция ТП №1344		45313
Насосная	600/С-120318	45358
Ограждение охранной зоны артскважины		45359
Отстойник (сооружение специализированное коммунального хозяйства)	600/С-120319	45361
Подземные резервуары (2 шт.)	600/С-120318	45387
Артезианская скважина	600/С-120318	45486
Котельная (здание котельной общей площадью 662,3 кв. м)	600/С-120322	45654
Трансформаторная подстанция (здание специализированное энергетики общей площадью 63,3 кв. м)	600/С-120321	45655
Газоанализатор ФСТ 03М		46269
Пожарные гидранты водопровода (гидрант – 5шт.; колодец железобетонный – 5шт.)		45308/1
Зеленые насаждения		45354

Сведения о земельных участках	Кадастровый номер 623681700001000160, площадь – 1,6891 га, назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений профилактория; кадастровый номер 623600000001000217, площадь – 1,2 га, назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий овощехранилища и теплицы на фактически занятых под объекты землях
Местонахождение продаваемого имущества	Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Ждановичский с/с, район д. Подгорье
Сведения о продавце	ОАО «Минский моторный завод», ул. Ваупшасова, 4, 220070, г. Минск
Сведения об организаторе аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск
Начальная цена предмета торгов	2 465 268 690 белорусских рублей
Сумма задатка	100 000 000 белорусских рублей
Наличие обременений	Аренда

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Минский моторный завод», утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Аукцион состоится 05 марта 2012 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 03.02.2012 по 01.03.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 227 48 36 (УП «Минский городской центр недвижимости»),
(017) 230 22 07 (ОАО «Минский моторный завод»).

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

№ 1 (423)

ЛЮТЫ

Народны каляндар



❐ 2 лютага — Яхім. На Яхіма завея — увесь масленічны тыдзень завейны. На Яхіма апоўдні сонца — будзе ранняя вясна. Завые завіруха — увесь тыдзень будзе месці.

❐ 4 лютага — Цімафей Паўзімнік. Палова зімы мінула. У гэты дзень пчаляры аглядаюць пчол. Прыслухваюцца: гудуць пчолы ледзь чутна — пераносяць зіму лёгка; неспакойнае гудзенне кажа пра няшчасці пчалінай сям'і.

❐ 6 лютага — Ксенія (Аксіння). Аксіння Паўзімніца, Паўхлебніца, Пералом зімы. Якая Аксіння — такая і вясна.

❐ 10 лютага — Яфрэмаў дзень. Яфрэм Ветрадуй прынёс вецер — да мокрага, халоднага года. Вецер збылтае надвор'е — быць мокраму году.

❐ 14 лютага — Зарапад — вясна ціхая. Неба ўначы зорнае — да позняй вясны.

❐ 15 лютага — Грамніцы — зіма з вясной сустрэлася. Грамнічныя маразы. Калі прагляне сонейка, то першая сустрэча зімы з вясной адбылася, а не прагляне — чакай далей маразоў. Раніцай снег — да ўраджаю ранняй збажыны, апоўдні — сярэдняй, увечары — позняй. На Грамніцы капеж — увесну дождж. На Грамніцы капеж — ураджай на пшаніцу.

❐ 16 лютага — Агата. У народзе носіць назву «Папраўкі». Аглядаюць і правяць летнюю збрую. Нездарма гаворыцца: «Рыхтуй калёсы ўзімку, а санкі ўлетку».

❐ 17 лютага — Мікола Сцюдзёны. Рэдкі год гэты дзень абыходзіцца без маразоў. На сцюдзёнага Мікалая снегу наваліць гару. Час звярыных вяселляў. Лісы ўдараюць у скокі, адна перад адной манернічаюць.

❐ 18 лютага — Агаф'я Каравятніца. Пакутніца Агаф'я шанавалася сярод сялян як заступніца свойскай жывёлы. «На Агаф'ю каровіна смерць па сёлах ходзіць».

❐ 19 лютага — Вукол Цялятнік. Клапаціліся аб шчасным зыходзе вясновага ацёлу кароў. Маразы абяцаюць бурную вясну, сухое і гарачае лета.

❐ 21 лютага — Захар Серпавідзец. У гэты дзень дастаюць сярпы і кропяць вадохрышчанскаю вадою.Не тады сярпы тачыць, калі на жніво ісці. Чым халадней у апошні тыдзень лютага, тым цяплей у сакавіку.

❐ 23 лютага — Прохар. Прохар і Улас — хутка вясна ў нас.

❐ 24 лютага — Улас. Уласаўскія маразы. Пралье Уласій масліца на дарогі — зіме час прыбіраць ногі, дарога ёй вядомая — за Прохарам следам.

МОРКАЎКА, НА ЯКУЮ І ПАГЛЯДЗЕЦЬ ПРЫЕМНА, І ЕСЦІ СМАЧНА

Агульнавядома, што морква — адзін з самых карысных прадуктаў для печані, нырак і страваванага тракту. Морква спрыяе здароваму абмену рэчываў, дапамагае пры дыярэі і іншых праблемах страваванай сістэмы, забіваючы шкодныя бактэрыі. Дзякуючы вялікай колькасці вітаміну А, які падсілкоўвае імунную сістэму і дапамагае абараніцца ад інфекцыі, морква карысная для вачэй і зроку. Аранжавы колер прама прапарцыйны карысці — чым ярчэйшая морква, тым больш у ёй караціну, а значыць вітаміну А.

Але не ва ўсіх вырастае такая морква, на якую і паглядзець прыемна, і есці смачна. А то і нагогул ураджай такі, што не апраўдвае ўкладзеных сіл. Якія ж сакрэты прыгожай і смачнай моркавы?

Усё пачынаецца з пасеву. Зараз вельмі папулярным стала насенне на стужцы. Але ж яно даволі шмат каштуе. Яшчэ ёсць час, каб самім зрабіць такія стужкі. Для пачатку высыпце насенне на плоскую талерку, кончык маленькага пэндзля абмакніце ў крухмальны клейстар, потым вазьміце на пэндзлік семечка і пакіньце яго на папяровай палосцы. Пасля падсушвання скруціце палоскі, падпішыце гатунак і захоўвайце да пасеву.

Але вось пасадка скончаная, вы чакаеце першых усходаў, а ваша морква не спяшаецца вас пацешыць. Прычынай затрымкі ўсходаў можа быць замалая глыбіня закладкі насення (меншая за 1 см) або недахоп вільгаці ў глебе. Гэта адбываецца таму, што насенне моркавы доўга прарастае, верхні пласт глебы хутка перасыхае, і насенне гіне. Каб пазбегнуць гэтага, накрыйце градку старой плёнкай для захавання вільгаці або замачыце насенне перад пасевам на пару гадзін, са зменай вады да 4 разоў: тады насенне набярэ досыць вільгаці. Перад пасевам яго рассыпаюць і прасушваюць.

У праточнай вадзе трымаць насенне не рэкамендуецца — яно, вядома, узыдзе хутчэй, але расліны будуць слабымі.

Калі вы заўважылі, што ваша морква мае выродлівую форму, то, хутчэй за ўсё, вы дрэнна апрацоўваеце зямлю пад моркву, і ворны пласт быў неглыбокім. Часта моркавы-выradкі атрымліваюцца пры ўнясенні неперапрэлага гною, нявыспелага перагною, а морква не любіць свежыя арганічныя ўгнаенні. Найлепшы эфект атрымліваецца пры ўнясенні мінеральных угнаенняў, расліна іх добра засвойвае.

Фосфарныя ўгнаенні спрыяюць фармаванню правільных, прыгожых караняплодаў. Уносіць фосфарныя ўгнаенні лепш за ўсё перад пасадкай. А сама градка для пасеву моркавы павінна быць прыгатавана загадзя, каб зямля паспела асесці.

Многія скардзяцца, што морква ўрадзілася дробнай. Звычайна гэта адбываецца ад няякаснага прараджвання. Першае прараджванне робяць пры з'яўленні першага сапраўднага ліста. А ўсяго трэба прарэдзіць моркву 2-3 разы, пры гэтым канчатковая адлегласць паміж караняплодамі залежыць ад гатунку і спосабу пасадкі. Так, моркве цыліндрычнай формы месца трэба менш, чым канічнай. Пры прараджванні можна пашкодзіць галоўны корань, у выніку нарастаюць бакавыя карані і морква атрымліваецца выродлівай. Каб пазбегнуць гэтага, пасля прараджвання добра паліце пасадкі.

Карані расліны пашкоджваюцца і пры вырыванні буйнога пустазелля. Морква ўсходзіць доўга, і для пазначэння радкоў і ранняй праполкі можна зрабіць пасеў у міжрадкоўі ранняй радыскі. Радыска і морква як суседзі адна з адной добра ўжываюцца, а ўраджай атрымліваецца вялікім і без усякіх клопатаў.

Калі морква растрэскваецца, гэтаму таксама ёсць прычына. Такое можа адбывацца ад нераўнамернага паліву, пры пераходах ад сухога гарачага надвор'я да дажджоў. Каб пазбегнуць растрэсквання, добра палівайце моркву ў спякоту. Зважайце таксама на тэрміны паспявання моркавы — яны паказаныя на пакуначках з насеннем. Наогул лепш сеяць моркву ў некалькі тэрмінаў — асобна для летняга спажывання і для зімовага захоўвання, каб караняплоды не перарасталі.

ПРАВІЛЫ ДОБРАЙ РАСАДЫ

Добры ўраджай пачынаецца з расады. Але пры гэтым вельмі важна выбраць правільны час яе пасеву, каб атрымаць ураджай ужо ў пачатку лета. Больш за тое, у нашым кліматычным поясе многія цеплалюбныя культуры могуць вырасці толькі праз расаду. У канцы лютага высейваюць балгарскі перац, сельдэрэй, цыбулю-парэй, баклажаны. З таматамі лепш не спяшацца — яны растуць хутчэй за іншыя культуры, таму лепш за ўсё іх высейваць у сакавіку.

Купляем насенне. Калі вы купляеце насенне ў краме, абавязкова звярніце ўвагу на тэрмін прыдатнасці, які пазначаны на ўпакоўцы. Калі тэрмін скончаецца ў бягучым годзе, не бярыце, таму што яно, хутчэй за ўсё, не ўзыдзе.

Адбіраем. Зараз насенне неабходна старанна перабраць. Калі яго мала, з гэтай задачай па сілах справіцца ўручную. Але ўсё ж лепш ужыць метад адбору, калі насенне замочваюць у салявым растворы або проста ў вадзе.

Насенне таматаў, перцу і баклажана замочваюць у 5-працэнтным растворы паваранай солі (з разліку 5 г солі на паўшклянкі вады пакаёвай тэмпературы). Для насення агуркоў патрэбен 3-працэнтны салявы раствор, ну а гарох з фасоляй апускаюць у чыстую халодную ваду. Робіцца гэта так: сухое насенне высыпаюць у раствор і добра перамешваюць, каб выдаліць паветра. Праз пяць хвілін добрае насенне апусціцца на дно, а пустыя зярняты застануцца плаваць на паверхні — іх выкідаюць. Пакінутае насенне прамываюць і падсушваюць.

Праяраем на ўсходжасць. Якім будзе ваш будучы ўраджай, залежыць ад усходжасці насення. Правядзіце эксперымент: вазьміце па 10 зярнят, пакладзіце іх у марлевую анучку і на суткі апусціце ў цёплую ваду. Затым дастаньце іх і змясціце ў цёплае месца на 4-7 дзён. Калі ўзышла палова — можна спадзявацца на добры ўраджай!

Пазбаўляем ад хвароб. Каб расліна не хварэла, а расла моцнай і здаровай, насенне трэба абеззаразіць. Даўно вядома, што 80% памідорна-капусных захворванняў перадаецца з насеннем, і толькі 20% — праз глебу. Таму перад прарошчваннем на працягу 20-30 хвілін насенне трэба апрацаваць моцным растворам марганцоўкі (1 г на 100 мл вады). Іншы спосаб — праграванне насення, змешчанага ў марлевыя мяшочкі, у тэрмасе з гарачай вадой (каля 50°С на працягу 25 хвілін). Пасля прагравання яго абавязкова трэба патрымаць некалькі хвілін у халоднай вадзе.

Загартоўваем. Каб будучыя перчыкі і баклажанчыкі не баяліся замаразкаў і перападаў тэмператур, іх трэба загартаваць. Гэта робіцца прыкладна праз шэсць дзён пасля таго, як насенне пайшло ў рост. Яго змяшчаюць на ніжнюю паліцу халадзільніка (+2,+3°) на 1-2 сутак, затым на суткі пераносяць у цеплыню (18-20°) і зноў на 2 сутак у холад.

Выбіраем грунт. Якую глебу выбраць? Лепш за ўсё — спецыяльна падрыхтаваную, якая забяспечыць вашай расадзе аптымальны рост. У спецыялізаваных крамах прапаноўваюць вялікі выбар глебавых сумесяў. Важныя ўмовы — пажыўнасць глебы, яе абеззаражанасць, падыходзячыя кіслотнасць і састаў. Ці можна браць глебу са свайго агарода? Можна, але з ёй давядзецца папрацаваць, каб падрыхтаваць належным чынам.

Высяваем. Насенне высяваюць у расадачныя скрыні на глыбіню 0,5-1 см з адлегласцю 2-3 см. Адлегласць паміж радкамі — 3-4 см. Самы зручны варыянт — гэта пластыкавыя кантэйнеры з абавязковымі дрэнажнымі адтулінамі на дне. Да з'яўлення ўсходаў кантэйнеры накрываюць поліэтыленавай плёнкай. Расада будзе выдатна сябе адчуваць пры тэмпературы +23°С.

● Умерана паліваце расаду, лепш раніцай. Выкарыстоўвайце толькі адстояную ваду, тэмпература якой не ніжэйшая за пакаёвую.

● Каб не было скрыўлення сцяблін, часцей паварочвайце расаду да святла. Або пастаўце побач вялікае люстэрка: святло ад акна будзе адлюстроўвацца ад яго паверхні і раўнамерна асвятляць усе расліны.

● Не забывайце пра падкормкі. Першую праводзяць праз два тыдні пасля пікіроўкі, а далей — з тым жа інтэрвалам. Выкарыстоўваюць раствор суперфасфату (30-40 г на 10 л вады), а калі расада расце слабой, то раствор каравяку (1:8) або птушынага памёту (1:12).

● Калі расада выцягваецца, перастаўце яе ў больш прахалоднае месца або трымайце фортачку адчыненай. Можна прышчыкнуць ніжнія (не семядольныя) лісты — гэта шок для раслін, які прыпыняе іх рост на 7-10 дзён, у выніку чаго сцябліны патаўшчаюцца.

● Забяспечце раслінам дастатковую жыццёвую прастору і максімум святла.

Калі суседнія расліны датыкаюцца лісцем, ім даводзіцца змагацца за святло, і яны пачынаюць выцягвацца і абяссільвацца.

● Ператрымліваць расліны ў расадзе нельга. У кожнай культуры ёсць лімітавы ўзрост, па сканчэнні якога пачынае пагаршацца яе якасць. Акрамя таго, пераросшая расада больш хваравіта пераносіць перасадку.

У красавіку ўсю расаду пажадана перасяліць на зашклёную лоджыю. 10 градусаў вышэй за нуль у начны час — самая спрыяльная для яе тэмпература, у сонечныя ж дні яна часта дасягае там 20, а то і 25 градусаў. Ды і ў цэлым атмасфера на лоджыі нашмат лепшая, чым у душным цёмным пакоі. Натуральнае асвятленне — немалаважны фактар.

Наогул, штучнае святло неабходна расадзе ў чатырох выпадках: падчас з'яўлення ўсходаў, у першыя дні пасля гэтага, у доўгія перыяды пахмурнага надвор'я, і калі вашы вокны выходзяць на паўночны бок. Дарэчы, у двух апошніх выпадках неабходна ў растворах угнаенняў, якія выкарыстоўваюцца для падкормкі расады, удвая павялічыць дозу калію. Гэта павысіць супраціўляльнасць раслін.

СЕМЕНА – ПОЧТОЙ. Со своего огорода.

Много лет выращиваю овощи на своём огороде с минимальным поливом и без плёнки. Отбираю самые урожайные и ценные, адаптированные к местным условиям, заготавливаю их семена, которые и предлагаю овощеводам-любителям.

Бахчёвые. Дыня **Белорусская ранняя** (до 4 кг). Арбуз **Бобруйский** – до 7 кг. В жаркие и тёплые годы все созревают в августе.

Тыквы. Титан – чемпион среди тыкв, до 100 кг. **Кавбуз** – тыква мягкокорая, до 40 кг. **Зимняя сладкая** (до 20 кг) и **Сдобная пышка** (до 10 кг) – сладкие, хранятся всю зиму в доме, вкусен и полезен сок и каши из них.

Кабачки. **Белый якорь** – белые, ранние. **Вьетнамский** – спелые очень сладкие, с плотной оранжевой мякотью, вкусные и долго хранятся.

Огурцы. *Очень ранние* – **Малыш.** *Ранние* – **Пальчик** (долго и обильно плодоносят). *Ранне-средние* – **Капелька, Верасень, Конкурент, Свитанак**, **Славянские** (самые урожайные). Все огурцы мелкие, засолочные, устойчивые к болезням.

Перец сладкий красный: **Алеся –** скороспелый, крупный, урожайный; **Длинный** – красный, по форме плода как банан (до 20 см); **Тройка, Чудо Ёло.**

Помидоры. *Ультраранние* – Альфа и **Чиполлино** (70 гр., начало сбора 5–10 июля, куст – 60 см). ***Ранние, низкие*** – **Красная шапочка** (80 гр, очень урожайные, идеальны для закатки); **Подарок брата** (60–70 гр.) и **Вилина** (80 гр.) – оба вкусные, урожайные, наиболее устойчивые к фитофторозу; **Ляна** (80–120 гр.) – до 70 см, красивые, плотные, по ведру плодов с куста, с повышенной устойчивостью к фитофторозу; **Винета** – как крупные куриные яйца, вкусные; **Мисс Америка –** плоды плотные, отличный вкус, долго хранятся. **Первая любовь** – розовые, до 400 гр., с картофельной ботвой, куст – 80 см.

Морозо-холодостойкие, низкие, ранние – **Снежная королева** (120 гр., хорошо переносит засуху, устойчива к болезням), **Взрыв** (120 гр.) – куст 45 см; **Мишка на севере** (150 гр.), **Сибиряк** – до 200 гр.

***Среднеспелые, низкие*: Призер, Стрелка** (остроносые) – 40–60 гр. закаточные, плотные, вкусные, долго хранятся свежими, **Талаш** (до 200 гр.)**; *среднерослые,* *куст 80 см*: Дина** и **Золотой** (плоды желтые, плотные, имеют красивый товарный вид); **Мулат** (80–100 гр.) – коричневые, по форме – куриные яйца, очень урожайные.

Крупноплодные, куст до 1 м: **Тещина радость** (розовые), **Золотые купола** (желтые) – оба до 1 кг; **Чёрный русский** (темные, до 600 гр.); **Джина** (красные), **Оранж** (жёлто-оранжевые, вкусные) – оба до 300 гр., **Бычье сердце** – до 600 гр.

Тепличные они же хороши и для гряд (высокие): **Красная стрела –** очень вкусные, 80–120 г.; **Славянский шедевр** (красные, вкусные, лёжкие, плотные) и **Дворцовые** (розовые) – оба до 500 гр., **Сердцеед** и **Грейпфрут** (сладкие) – оба до 1 кг.

Высокие для гряд – ***с высокой устойчивостью к фитофторозу*** – **Де-Барао: красный, жёлтый, чёрный.**

Комнатные овощи украсят любой подоконник. ***Помидорки***: Компактный кустик 30 см (15–20 г)**: Пиноккио** (красные), **Ацтек** (желтые)**, Венус** (оранжевые) и **смесь сортов**. **Балконное чудо** (30–40 г) – раннеспелый, куст 60 см. Декоративный сиреневый ***перчик* Филиус Блю.**

Семена расфасованы: помидоры и перец по 50 шт. и более (комнатные 15 шт.), огурцы по 30–35 шт., все остальные – по 10–15 шт. Высылаю наложным платежом 4000 рублей за пакет. От Вас – письмо-заказ. Свой адрес и Ф.И.О. пишите **полностью** и **разборчиво**. Оплата при получении семян на почте. За каждые 10 заказанных пакетов – высылаю **бесплатно**

ЛЕЎ З ВІЦЕБСКАГА ЗААПАРКА ПЕРАЖЫВАЕ МАРАЗЫ ЛЯ ПЕЧКІ, а трусы грэюцца ў стозе сена

Пра зімовыя змены ва ўтрыманні звяроў паведаміла дырэктар заапарка Ірына АРЛОВА.

У закрытых памяшканнях, якія ацяпляюцца, жывуць птушкі, земнаводныя, малпы, таму ім халады не страшныя. А вось пра тых, хто пражывае ў вулічных вальерах, напярэдадні трыццацiградусных маразоў работнікі заапарка клапоцяцца асабліва. Цару звяроў прадаставілі двухпакаёвую «кватэру» і ў адным з «пакояў» устанавілі печку. Жыхар афрыканскіх саван, паводле слоў Ірыны Арловай, з задавальненнем грэецца каля яе, але і марозу не баіцца — прагулкі на свежым паветры ў любое надвор'е ў яго распарадку дня абавязковыя. Для антылопы працуе абагравальнік, затое трусы пераживаюць маразы ў стозе сена. Яны ўжо паспелі ўладкаваць у ім камунальную кватэру, зрабіўшы норы.

Аднак не ўсе жыхары заапарка такія пестуны. Першую ў сваім жыцці зіму цудоўна пераносіць васьмімесячнае зубраня. Нягледзячы на свае афрыканскія карані, не пужаюцца маразоў камерунскія козы і авечкі. Як лічыць Ірына Арлова, адбіваецца, што гэтыя жывёлы нарадзіліся ў заапарку ў сярэднееўрапейскай палаосе і адаптаваліся да клімату.

Для паспяховай зімоўкі падапечным заапарка неабходны асаблівы рацыён. У марозныя дні ён узмацняецца, а прадукты падаюцца цёплымі.

Паводле звестак Віцебскага абласнога цэнтра па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя, на бягучым тыдні ў Віцебску чакаецца ўзмацненне маразоў. Дзённая тэмпература паветра прагназуецца на ўзроўні 17—22 градусаў, уначы слупок тэрмометра будзе апускацца да 28 градусаў ніжэй за нуль, пры праясненні — да мінус 30 градусаў.

Віцебскі заалагічны парк быў заснаваны 30 сакавіка 1992 года на базе тэатра звяроў, які існаваў у горадзе. Цяпер тут на плошчы 1,3 га ўтрымліваецца 76 відаў жывёл — больш за 1 тыс. асобін.

Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.

Анатоль БАДУЕЎ:

«ПРАВАЛЫ І АДСУТНАСЦЬ МЕДАЛЁЎ БЫВАЮЦЬ НЕЧАКАНЫМІ, А ПЕРАМОГІ ЗАЎСЁДЫ ЗАПЛАНАВАНЫЯ»

ЛЁГКАЯ атлетыка — звычайна самы багаты на медалі від спорту, і на Алімпійскіх гульнях у Лондане ад нашых лёгкаатлетаў мы чакаем перамог. У канцы студзеня федэрацыя лёгкай атлетыкі правяла справаздачна-выбарную канферэнцыю. Коней на пераправе ў федэрацыі мяняць не сталі: на новы тэрмін старшынёй зноў абраны віцэ-спікер Савета Рэспублікі Уладзімір Патупчык.

Адным з яго намеснікаў пераабраны галоўны трэнер зборнай Анатоль Бадуеў, які ўзначальвае нацыянальную каманду з 2005 года. І ўвесь гэты час праца Анатоля Іванавіча знаходзіцца пад градам крытыкі яго папярэдніка, заслужанага трэнера СССР Аляксандра Рудскіх. Вось і на справаздачна-выбарнай канферэнцыі Аляксандр Рыгоравіч шмат крытыкаваў трэнерскі штаб на чале з Анатолем Бадуевым. Ці дапамагае крытыка ў працы? Чаго нам чакаць на Алімпіядзе ад лёгкаатлетаў? Калі балельшчыкі ўбачаць у сектары алімпійскіх прызёраў Вадзіма Дзвевятоўскага і Івана Ціхана, якія адстаялі сябе ў Лазане? На гэтыя і іншыя пытанні нам адказаў галоўны трэнер зборнай Анатоль Бадуеў.

— Анатоль Іванавіч, як ставіцеся да слоў Аляксандра Рудскіх, як рэагуеце на крытыку?

— Абсалютна ніяк не рэагую. І ўсім нядобразычліўцам магу задаць сустрэчнае пытанне: «Дзе вы былі тады, калі вам трэба было працаваць? І чаму тады не працавалі? І толькі зараз узгадалі, як трэба працаваць?»

Давайце ўзгадаем, як я прыйшоў на пасаду. Гэта адбылося ў 1999 годзе, калі пасля сезона-98 у нас не было ніводнага медаля ні на чэмпіянаце свету, ні на чэмпіянаце Еўропы. Я стаў другім трэнерам, які ажыццяўляў непасрэдную поўную падрыхтоўку. Так што ўся падрыхтоўка з 2000 года лягла на мае плечы.

— 2011 год у лёгкай атлетыцы прызнаны няўдалым...

— Ёсць дзяржаўнае планаванае заданне, і мы яго выканалі. Вядома, хацелася б больш медалёў. Сёлета ў нас не было медалёў у юнацкім рэзерве. Але гэта бяда ўсяго нашага спорту. Здаровых дзяцей становіцца менш. Не павялічваецца колькасць спартсменаў, якія ў будучым могуць дасягаць высокага спартыўнага ўзроўню. Не спрыяе гэтаму зацікаўленасць дзяцей і падлеткаў камп'ютарамі. У маім дзяцінстве ў дварах нашага 12-кватэрнага дома была і баскетбольная, і міні-футбольная пляцоўкі. Бацькі нам залівалі каток у хакейнай каробцы. Была пляцоўка для «італьянкі», тэнісныя сталы. Мы праводзілі турніры паміж суседнімі дамамі, прымалі ўдзел у турнірах «Скураны мяч», «Залатая шайба». А зараз у дварах не да спартыўных пляцовак — прайсці за машынамі немагчыма.

— А такая безмедальная сітуацыя перад Алімпіядай вас не насцярожвае?

— Нам трэба захаваць касцяк нацыянальнай каманды для падрыхтоўкі да Алімпійскіх гульняў. І правесці добрую базавую падрыхтоўку. А яна ідзе не адзін месяц і нават не год. Калі акцэнтаваць увагу на чэмпіянаце свету, можна забыць пра базавую падрыхтоўку. У 2010-м бліскуча выступілі Астапчук, Міхневіч. А летась вынікі былі крыху слабейшыя. Гэта гаворыць пра тое, што яны пачалі рабіць базавую работу, і на такой стадыі алімпійскага цыклу гэтага дастаткова. Яшчэ не ўвайшлі ў строй Ціхан, Дзевятоўскі, перапынак мы зрабілі Краўчанку...

— І калі ж мы іх нарэшце ўбачым?

— У сёлетнім сезоне і ўбачыце. Можна было кінуць усю каралеўскую раць у бой. А што атрымаць у выніку? Можна, як казаў Кутузаў, здаць Маскву, а потым выйграць бітву. А можна наадварот, сканцэнтравацца на лакальнай задачы і ўсё страціць. Давайце будзем лічыць, што і Маскву мы не здавалі, і захавалі рэзерв.

Спартсмены, пра якіх узгадвае мой папярэднік Аляксандр

Рудскіх, былі падрыхтаваны ў зборнай Савецкага Саюза. І ён не меў да іх ніякага дачынення, але яны выступалі падчас яго кіраўніцтва. Спартсменамі, якія выступаюць зараз, займаўся ўжо наш трэнерскі штаб.

— Які першы турнір у Дзевятоўскага і Ціхана? Яны даўно не выступалі, і мы можам толькі гадаць, у якой форме нашы знакамітыя «малатабойцы»...

— Турнір Шукевіча і наступныя пасля яго. У канцы красавіка—маі яны будуць выступаць. Магчыма, яны паедуць на чэмпіянат Еўропы. Ціхан, Дзевятоўскі, Шаюноў, Крывіцкі, Святоха, Каламоец — шэсць чалавек будуць аспрэчваць тры пуцёўкі на Алімпійскія гульні. Трэба разумна размеркаваць усіх — каго на Еўропу, каго на Алімпіяду. Збіраецца ўключыцца ў барацьбу Дубіцкі, не спісалі з рахункаў Андрэя Варанцова... За тры пуцёўкі будзе вялікая барацьба, бо кожны з гэтых спартсменаў рыхтуецца выступаць на самым высокім узроўні.

— Вы зноў абраны намеснікам старшыні федэрацыі. Што значыць для вас гэтая пасада?

— У сусветнай практыцы галоўны трэнер заўсёды з'яўляецца віцэ-прэзідэнтам федэрацыі, які адказвае за спорт вышэйшых дасягненняў і міжнародныя адносіны.

Калі я прыйшоў на пасаду галоўнага трэнера, я не меў кантракта на экіпіроўку «дзякуючы» свайму папярэдніку. Кантракт з FILA быў разарваны. Толькі ў красавіку я пра гэта даведаўся. Я займаўся новым кантрактам і хуценька знайшоў кантракт з MIZUNA. Але і ён разарваўся: галоўны менеджар MIZUNA была галоўным менеджарам японскага малатабойца Марахушы, які прэтэндаваў на медаль у выніку дысквалiфікацыі Ціхана і Дзевятоўскага. Яна ва ўльтыматыўнай форме запатрабавала, каб наша федэрацыя дысквалiфікавала хлопцаў, не чакаючы вынікаў судовага разбіральніцтва, якое ішло ў Лазане. Тады мы зробім вам не проста кантракт, а кантракт з суперумовамі. Але ці мог я на гэта пайсці, калі нашы хлопцы аказаліся «чыстымі»? Японія ад гэтага мела прамую выгаду: яны атрымлівалі другі алімпійскі медаль. У выніку нашых хлопцаў апраўдалі, але кантракт стаў немагчымым па фінансавых умовах з-за трагедыі на Фукусіме. Зараз мы збіраемся падпісаць новы кантракт з найлепшай у свеце фірмай па спартыўнай экіпіроўцы — Nike. Уявіце, як складана правесці перамовы і заключыць кантракт з фірмай, якая знаходзіцца на тэрыторыі ЗША. Ёсць невялічкае пытанне — у адносінах дзяржДэпа ЗША. Але кантракт будзе падпісаны.

— Трэнер Андрэя Міхневіча Уладзімір Сіўцоў неяк сказаў, што, калі гучыць гімн у гонар яго выхаванца, ён адчувае, што гэта трохі і ў яго гонар. Якія ў вас адчуванні, калі на п'едэстале наш атлет?

— Ведаеце, я патрыёт сваёй краіны. У мяне ні дзеці, ні блізкія не з'яўляюцца эмігрантамі. Мае дзеці працуюць на карысць Беларусі. Якія ў мяне могуць быць адчуванні? Зразумела, гонар.

— Як галоўны трэнер вы прайшлі дзве Алімпіяды. Для балельшчыкаў нечаканымі былі медалі і Юлії Несцярэнкі, і Аксаны Мяньковай. А для вас?

— Некаторыя правалы і адсутнасць медалёў былі нечаканымі. А перамогі заўсёды чаканыя і запланаваныя.

— Хто ў такім выпадку з вашых выхаванцаў прымушаў найбольш хвалявацца?

— На апошнім чэмпіянаце свету ў Андрэя Міхневіча здарылася траўма спіны. Ён быў гатовы змагацца за першае месца. А тут нечакана ўзнікла траўма на роўным месцы, але ён паспяхова заваяваў бронзавы медаль. Хвалявaўся і за Настассю Мірончык, якой не хапіла літаральна 2 сантыметры. Але я ведаў, што яна здольная змагацца за медалі самай высокай пробы (Настасся Мірончык-Іванова заняла чацвёртае месца на чэмпіянаце свету ў скачках у даўжыню. — **Аўт**). На спаборніцтвах заўсёды здараецца шмат такіх крыўдных момантаў.

— Колькі медалёў нам чакаць ад лёгкаатлетаў у Лондане?

— У групу А, а гэта спартсмены, якія прэтэндуюць на 1-8 месцы, уваходзіць 23 чалавекі. Ёсць яшчэ рэзервовая група «В», куды ўваходзяць 34 спартсмены. Дзевяці нашым атлетам па сілах у Лондане змагацца за медалі. Так што задача заваяваць пяць-сем медалёў цалкам рэальная.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Фота БЕЛТА.

Прызёры чэмпіянату свету-2011 (злева направа): Дзілан Армстронг, Давід Шторль і Андрэй Міхневіч.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.56	17.51	8.55
Віцебск —	8.50	17.36	8.46
Магілёў —	8.46	17.42	8.56
Гомель —	8.37	17.44	9.07
Гродна —	9.10	18.07	8.57
Брэст —	9.05	18.13	9.08

Месяц

Першая квадра 31 студзеня. Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Імяніны

Пр. *Рымы, Яфіма.*

К. *ГРАМНІЦЫ (Ахвяраванне Пана), Марыі, Аскара, Карнеля, Міраслава.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

2 лютага

1885 год — нарадзіўся Міхаіл Фрунзе, вядомы рэвалюцыянер, савецкі ваенны і дзяржаўны дзеяч. Неаднаразова арыштоўваўся царскімі ўладамі, двойчы быў прысуджаны да смяротнага пакарання, якое пасля замянялася пажыццёвай катаргай. З 1916 года — на Заходнім фронце, вольнанаёмны артылерыйскай часці ў мястэчку Івянец, затым у Мінску ў камітэце Усерасійскага земскага саюза на Заходнім фронце. Стварыў у Мінску падпольную бальшавіцкую арганізацыю. Вёў рэвалюцыйную агітацыю на фронце, выступаў на мітынгах і падпольных сходах, арганізоўваў братанне салдат. Адзін са стваральнікаў Мінскага Савета, член яго выканкама, начальнік народнай міліцыі ў Мінску. Арганізатар і першы рэдактар газеты «Звязда», органа Мінскага камітэта РСДРП(б). Быў намеснікам старшыні СНК УССР, старшынёй РВС СССР, наркамам па ваенных і марскіх справах СССР, начальнікам Ваеннай акадэміі Чырвонай Арміі. Памёр у 1925 годзе.

1904 год — нарадзіўся Валерый Паўлавіч Чкалаў, легендарны савецкі лётчык. «Калі быць, дык быць першым», — казаў ён. За сваё кароткае жыццё (лёс адмерыў яму 34 гады) Чкалаў выпрабаваў больш за 70 тыпаў розных самалётаў, распрацаваў і ўкараніў новыя фігуры вышэйшага пілатажу: узыходзячы штопар, запаволеную бочку і іншыя. У ліпені 1936 года ён разам з Аляксандрам Беляковым і Георгіем Байдуковым здзейсніў бесперасадачны пералёт Масква — востраў Уд, за 56 гадзін 20 хвілін пераадолеўшы больш за 9 тысяч кіламетраў. Удзельнікі пералёту былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. У чэрвені 1937 года Чкалаў здзейсніў пералёт у ЗША праз Паўночны полюс, пераадолеўшы за 63 гадзіны 16 хвілін больш за 12 тысяч кіламетраў. Ён ірваўся на якую-небудзь вайну, але ні ў Іспанію, ні ў Кітай яго не пусцілі — занадта быў вядомы! Разбіўся 15 снежня 1938 года на падмаскоўным аэрадроме пры спробе пасадзіць эксперыментальны ўзор самалёта Палікарпава. Пра яго смерць, зрэшты, як і пра жыццё, да гэтага часу складаюць легенды. Адны аўтары вінавацяць у яго смерці Берыя, іншыя сцвярджаюць, што забілі аса па прамым указанні Мікалая Іванавіча Яжова, у той дзень ужо як тыдзень адхіленага ад абавязкаў народнага камісара ўнутраных спраў СССР, а некаторыя вінавацяць самога Сталіна, які быццам бы зайздросціў незвычайнай папулярнасці лётчыка.

У гонар Героя Савецкага Саюза Валерыя Чкалава названыя планета, востраў, мыс на Зямлі Франца-Іосіфа, дзве гары ў Антарктыдзе, горад, вуліцы, рэстараны, кінатэатры, лётныя школы, мінерал чкалавіт, устаноўлены помнікі...



«Кожны хоча даведацца, што трэба яму рабіць на гэтым свеце, каб адпавядаць мэце чалавечага існавання. Трэба вучыцца таму, што развівае нашы веды, што робіць нас карыснымі грамадству на розных пасадах і ў розных жыццёвых абставінах; нам трэба вучыцца таму, што цікавіць чалавецтва, што тлумачыць сэнс яго існавання».

Фларыян Бохвіц (1799—1856), беларускі асветнік, філосаф.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.

	5			7	3	2		8
		7	2		8		4	
2					4			
4				2		7	6	
7								9
	6	9		4				3
			3					4
	4		7		5	9		
1		2	4	8			5	

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетцы, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

АДКАЗЫ на сканворд + судоку

Па гарызанталі: Міпяж. Бігірад. Жабо. Аева. Рур. Рыба. Эора. Волар. Фарш. Сурма. Ава. Лагас. Кулан. Ра-на. Мун. Агар. Хлам. Амга. Акно. Эстрада. Стамбул. Мазаіка. **Па вертыкалі:** Ферма. Сезам. Нарыс. Баранка. Эліста. Інвар. Рыс. Авал. Акрэс. Гапка. Анапа. Фарфор. Самоа. Гэтыя. Адказы гл. у тэлепраг.

7	5	6	9	8	4	2	3	1
8	4	3	7	1	5	9	6	2
9	7	5	3	6	2	8	1	4
5	6	9	8	4	7	1	2	3
7	2	1	5	3	6	4	8	9
4	8	3	9	2	1	7	6	5
2	9	8	6	5	4	3	7	1
3	1	7	2	9	8	5	4	6
6	5	4	1	7	3	2	9	8

А не шкодзь

Па несапраўдным лесасечным...

На тэрыторыі Лагойскага лясгаса былі выяўлены 73 незаконна ссечаныя дрэвы.

Як высветлілася, гэта зрабілі работнікі аднаго з прыватных прадпрыемстваў на падставе лесасечнага білета, тэрмін дзеяння якога скончыўся месяц таму. Нанесеная навакольнаму асяроддзю шкода ацэненая ў памеры 123 базавых велічыняў (гэта больш за 4,3 мільёна рублёў). Праваахоўныя органы разглядаюць пытанне аб завядзенні крымінальнай справы.

Сам трапіў у «сіло» да дзяржінспектараў

У паляўнічых угоддзях Горацкага лясгаса непрацуючы грамадзянін паляваў пры дапамозе петляў.

Гэта ўстанавілі работнікі Мсціслаўскай міжрайінспекцыі. Калі дзяржінспектары паспрабавалі затрымаць браканьера, той паводзіў сябе агрэсіўна: адмаўляўся выконваць патрабаванні заставацца на месцы, спрабаваў уцячы, вырываўся. У дачыненні да затрыманага склалі два адміністрацыйныя пратаколы. Таксама дзяржінспектары канфіскавалі 31 сіло. Дарэчы, непадалёку знайшлі і месца незаконнай здабычы і разбору тушы дзіка. Дома ў «паляўнічага» захоўвалася 17 кілаграмаў дзічыны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА.

АЎТАРСКІ-16

Праводзіцца на прызы Леаніда Вітошкіна з Гомеля, які па шашачнай кампазіцыі тройчы быў чэмпіёнам СССР і 31 раз Беларусі(!). Улічваючы яго заслугі, нядаўна ФМЖД прысвоіла яму званне міжнароднага грасмайстра ганаровай ступені.

Умовы конкурсу: з'яўляецца класіфікацыйным з нормай першага спартыўнага разраду, удзельнічаць у ім могуць усе ахвотныя, кожнае заданне ацэньваецца ў адно очко, усяго іх будзе 24. Сёння паўтараем першыя два і падаём чарговае:

№ 1. **Белыя:** 13, 19, 20, 27, 29 (5). **Чорныя**: 3, 5, 7, 17, 33, 38 (6).

№ 2. **Белыя**: 9, 31, 37, 38, 39, 42 (6). **Чорныя**: 10, 17, 19, 20, 26, 30 (6).



№ 3. **Белыя**: 10, 19, 20, 23, 38, 42, 43 (7). **Чорныя**: 7, 17, 27, 31, 37 (5).

Ва ўсіх іх пашукайце пераможныя камбінацыі.

ДРАМАТЫЧНЫ ЭПІЗОД

З кандыдатаў стаць лаўрэатам нашага конкурсу «Пагода ў доме»-8 Анатоль Пяркальскі (Глыбокае) паспяхова выступіў і ў першай лізе 45-га завочнага першынства краіны. Атрымаўшы па 5 перамог і нічыіх пры адным паражэнні, ён заваяваў сярэбраны медаль у класічнай версіі гульні. Па-за конкурсам разгледзьце драматычны эпізод барацьбы ў яго партыі з М. Лічко (чорныя):



Белыя: a3, c1, d2, e1, h4 (5). **Чорныя**: a7, b6, c5, c7, d4, h6 (6). Тут чорных падвёў машынальны ход. Які? У гэтым карысна разабрацца самастойна.

Дарэчы, ААТ «АТП-16», дзе працаваў Анатоль Антонавіч, падпісвае яго на «Звязду» — любімую газету ветэрана.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: ***220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».***

ПРЭТЭНДЭНТЫ НА ПЕРАМОГУ

У конкурсах «Пагода ў доме»-8, аўтарскіх-13 і 14 і ў бліцах-56-64 узялі ўдзел І. Ананіч (Гродна), А. Белы (Наваполацк), Аляксандра Камінская (Вілейка), А. Кіслы (Узда), У. Сапяжынскі (Рагачоў), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), А. Шурпін (Клімавічы), Л. Вітошкін і А. Пяркальскі, а таксама У. Валчкоў (Маладзечна), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), І. Астроўскі, А. Літвінаў, В. Логвінаў і А. Нікіфараў (Мінск), В. Голас (Любань), С. Нячаеў (Баранавічы) і інш. Першыя 9 удзельнікаў прэтэндуюць на перамогу, бо ў некаторых заданнях прывялі дадатковыя развязкі. У бліжэйшы час мы пазнаёмім вас з іх знаходкамі.

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

Аўтарскі-14/24 (В. Шульга): 41, 43, 38, 2 (34А) 36, 22, 50х. А(24) 36х.

«Пагода ў доме»-8/21 (М. Грушэўскі): ed8 (c:e1a) d6-c7, cd2, db6!, a:e7, h:h4x. a(c:e7) d:e1 (cb2) a:c5 (ba1) cd6 (gf6) eh4x.

Бліц-63/6 (В. Талкачоў—А. Сняжкоў): 1. bc5 2. de5 3. c:a7x.

Па-за конкурсам (М. Стэфановіч): ef8, a:c7, f:d2 (g1:e3), h:f4!x.

Цытата дня:

Усміхнемся

Пілот Формулы-1 Пятроў ніяк не можа памяняць на сваёй машыне летнюю гуму на зімовую. Ён па звычцы выязджае з шынамантажу праз 10 секундаў.

— Я цябе кахаю!
— Малайчына.
— А ты?..
— І я малайчына.

Гэта Марыя. Яна нарадзілася ў Ліхтэнштэйне. Каб бацькі не даведаліся, ёй даводзіцца паліць за мяжой.

— А давайце піць чай! — сказалі гаспадары.
— Давайце піць тое, што пілі! — абурыліся госці.

Мяне крыўдзіць не трэба... У мяне разгон ад мілай зайкі да жудаснай сцервы 1,5 секунды.

— Дзяўчына, давайце пазнаёмімся!
— У цябе што, праблем мала?

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказнага за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 508. Нумар падпісаны ў 19.30 1 лютага 2012 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12